Пімен Панчанка

Пімен Панчанка

Збор твораў

Пімен Панчанка

збор твораў
у чатырох
тамах

Пімен Панчанка

том трэці

вершы

1963–1981 г.



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1982

Бел 2
П 16

П $\frac{70403-047}{М\ 302(05)-82}$ 105—82 4702120200


Афармленне. Вершы з 1973 г. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1982.

КРАЙ ПАЭТАЎ

Добра ведаюць усе амаль з маленства,
Што паэтаў нараджаюць пад Смаленскам,

Ля падножжа Арарата і ў Сібіры
І на землях Руставелі і Сабіра,

Над Дняпром, дзе нешта п'юць з пякучым перцам,
І на Балтыцы, дзе людзі з мужным сэрцам.

Часам іх знаходзяць у Разані,
А яшчэ жывуць паэты ў Дагестане...

Ёсць яшчэ адзін куточак запаветны,
Дзе растуць, нібы грыбы, здаўна паэты.

Там зязюлямі завуцца ўсе кукушкі,
Гэтым краем з Кішынёва ехаў Пушкін.

Там прыгонных шмат паэтаў замарылі,
Там Міцкевіч закахаўся ў Марылю.

І Тарас у Пецярбург ішоў праз слёзы,
На яго шляху журыліся бярозы...

З той пары там песняроў — нібыта маку,
Аж статыстыка дае ў падліках маху.

Край чаромхі і чабору, край прасторны,
Дзе і крытыкі вядуць сябе прыстойна.

Там маланкі аб дубы ламаюць коп'і,
Выдаўцы там не бяруць у рот ні кроплі.

Смела дзятлы пішуць вершы на бяросце,
Не вылазяць з-за стала па тыдню госці,

Бо у возеры вугры,
А стронга у рэчцы.
Там машыны з канюшынай не у спрэчцы;

І з барамі ўсе заводы добра дружаць;
І салдат на службе служыць, а не тужыць,

Бо красуня перад ім не задаецца...
Там зубрыная гарэлка прадаецца,

А частуюць там гасцей баравікамі.
Самагонку п'юць паціху толькі самі.

Там чарнічныя ўсе ночы,
Сунічныя ранкі,
Там народ найболей любіць вершы Янкі.

Там дзяўчаты носяць белыя панчошкі,
Сто разоў цалуюць там і яшчэ трошкі.

Дзе ж той край залатакосы, край зялёны —
Рык ласіны,
Звон пчаліны,
Мора лёну?

Там, дзе Свіцязь, там, дзе Прыпяць і Ясéльда,
Дзе танцуюць пад цымбалы на вяселлях;

Дзе жанчына, сінявокая і ласкавая,
Звонка чаравічкамі паляскавала.

1963

ЛІНІЯ ВЫСОКАГА НАПРУЖАННЯ

На прасторах
Між вялікіх гарадоў,
Над зямлёй,
Спакойнай і натруджанай,
Іней асыпаецца
З калматых правадоў
Лініі высокага напружання.

А падпоры —
Як гіравікі:
Ні на хвілю
Зняць цяжар той
Нельга ім.
У гушчар жыцця
Не дні —
Вякі
Ленінскую
Несці ім энергію.

Быццам нежывыя
Правады,
А кранеш —
І ў момант будзеш спалены...
Тым агнём і нашыя рады
Непрыкметна для чужынцаў
Спаяны.

Адчуваем мы сябе заўжды
Маракамі,
Нават касманаўтамі,
І зямля, як карабель,
І правады
Звіслі карабельнымі канатамі.

І святлей, святлей
Наш кожны дзень,
А ўжо рэкі новыя
Запруджаны.
І ад сэрца ў сэрца
У нас ідзе
Лінія высокага напружання.

1963

ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ

З-за турбот і сходаў языкатых
Беззваротна страцілі мы ўсе
Тысячы палаючых закатаў
І світанні трацім пакрысе.

Толькі часам, выракшыся тлуму,
Ношу год адчуўшы на гарбе,
Не пашкодзіць сёння нам падумаць
Аб жыцці, аб людзях, аб сабе...

Колькі пастак мне ты прыхавала,
Добрае, не дробнае жыццё!
То сляпіла даль парахавая,
То глушыла «юнкерсаў» выццё.

Вернасць адарала шчодрай мерай.
Часам здрада секла з-за пляча.
То свяціла ясным сонцам вера,
То нявер'е кідала ў адчай.

Часта крывадушныя мяшчане
З-за драбніц ушчэнт мяне знішчалі,
Часам і надзейныя сябры
Ласкава штурхалі пад абрыў...

Крутанецца ў тупік дарога —
І няма, няма ўжо чым дыхнуць...
«Як ён там? Мо трэба дапамога? —
Нехта скажа.— Трэба заглянуць».

І часцей не той, хто ў дружбе кляўся
І цябе хваліў, п'ючы віно...
Ты ажыў, даверліва узняўся,
Нібы воін, скончыўшы з вайной.

Стаў дабрэй, і даўняя наіўнасць
Варухнула крыллем над табой.
Лечыцца трава ад спёкі ліўнем,
Людзі ласкай лечацца людской.

Абапрыся на зямлю сырую,
Сэрцам ціха ўсіх перабяры:
Хто жыруе сёння, хто гаруе,
Хто цвіце, хто вяне без пары.

Мо бяда каму здушыла горла,
Можа, хтось не можа ўжо дыхнуць?
Не забудзь туды раней за гора
Хоць на дзве хвіліны заглянуць.

1963

ПАЧАТАК ВЯСНЫ

Белай сцюжай дыхаюць Саяны,
Запакован Енісей у лёд.
На радзіме сонечнай Сар'яна
Пазбіралі пчолы першы мёд.

А у нас на дрэвах — срэбная луска:
Білі з хмары першыя фантаны.
Глоткі вуліц дождж прапаласкаў,
І яны рыкаюць апантана.

«Эх, узяўся б заўтра хоць бы лешчык»,—
Трызняць рыбакі ў суботні дзень.
І на стадыён наш брат балельшчык
Вока прымяраць ужо ідзе.

Паставыя са свісткамі змоўклі,
Салаўі лятуць з далечыні...
Адкажыце, колькі новых вокнаў
Дзень вясновы ў Мінску адчыніў?

Дзевяцьсот яму, а ён цудоўны,
Навасёлаў будзе зноў вітаць.
На жыллёва-мікра-рай-будоўлі
Гмахі ёсць — паэтаў не відаць.

Пішуць пра маленства ды ажыну,
Хоць сто год у горадзе жывуць.
Што ім электронныя машыны —
Лапатным гадам паклоны б'юць.

Я і сам хвалююся не лішне:
Што, як верш запозна прагучыць?
Нібы той акцёр, што зноўку выйшаў
Кланяцца, калі ўжо зал маўчыць.

1963

ДЗЕЦІ НАД ВОЗЕРАМ

Гуляюць дзеці каля возера,
А неба з сонцам — у вадзе.
Дзяцей шматвопытныя позіркі
Заваражыў пагодны дзень.

Яны прыехалі ўсе з горада
І ўпершыню пад птушак спеў
Накінуліся, нібы з голаду,
На дзіўны свет і траў і дрэў.

Тут столькі нечаканай радасці:
Расінка — сіні аганёк,
Асколачкам вясновай радугі
На сонцы блісне акунёк.

Па-над гладышыкамі лотаці,
Над жоўтым кветкавым кастром —
Стракозы, быццам верталёцікі:
Ім кожны ліст — аэрадром.

Вось дзьмухне вецер — і вяршаліны
Асін пацiху закіпяць...
Ляснік з суседняе імшарыны
Сюды каня прывёў купаць.

І захапленне плешча голасна:
Якая грыва, патрымай!
Праехацца б, ды крыху боязна:
Табе, брат, гэта не трамвай.

Як гэткі конь імчаў Будзённага!
Як бліскаў срэбраны клінок!..
Ім тэлевізар — абыдзёншчына,
Прасцей глытка вады — кіно.

Амаль з калыскі дакранаецца
Да цудаў веку гэты люд.
А век не мае часу раіцца,
Дзе сёння цуд, а дзе не цуд.

А мы раслі пад песні жніўныя,
З бярозавіку пілі квас.
І першы трактар — дзіва дзіўнае —
На ўсё жыццё уразіў нас.

Я не збянтэжан той адноснасцю,
Змяшчэннем поглядаў і дзіў.
Адно хачу, каб сіняй роснасцю
Наш добры век часцей хадзіў.

Быць гэтым дзецям у палёце!
І ў цішыні касмічных трас
Стракозы, быццам верталёцікі,
Ім прыгадаюцца не раз.

1963

* *

Няма на свеце земляў непрыгожых.
Свой кожны хваліць край,
Як мы наш родны кут.
Я бачыў землі шчасця і пакут,
Іх лёс — іх шлях
Цяпер мяне трывожыць.

І сенегалкі часам сняцца мне —
Жанчыны, прыгажэйшыя на свеце...
Зноў мора Мінскага
Ўдыхаю прэсны вецер
І кожнай прыдарожнай рад сасне.

Нядзельны гул на пляжы.
На латках
І вінаград, і яблыкі, і слівы,
І сонечныя пенныя прылівы
Дакатваюцца да майго радка.

Гудкі мне параходныя чутны,
Павольна дзьмуць мясцовыя пасаты,
А на латку ў цяльняшках паласатых
Ляжаць, нібы матросы, кавуны.

Шляхі марскія ўспамінаць не грэх...
Ды што з прыбоем —
Не магу я ўцяміць:
Ён выплеснуў на бераг негрыцянак,
Іх станы гнуткія і белазубы смех.

— Адкуль вы, афрыканачкі,
З Дакара?
— Мы з Кубы ўсе,
У Мінску трэці год...
Найлепшая з усіх маіх прыгод
Вясёлай адплаціла сёння карай.

Прыхільны лёс да розных дзівакоў,
Ён адарае нас не толькі снамі...
І пралятаюць чайкі па-над намі
Кавалачкамі цёплых аблакоў.

1963

ЖАДАННІ

Хутчэй бы прыйшла зіма,
Белая і маладая,
З малінавымі маразамі,
Са звонам канькоў на лёдзе
І навагодняй ёлкай,—
        Людзі штогод жадаюць.
Хутчэй бы прыйшла вясна
З сонечнымі вадаспадамі,
З блакітнымі навальніцамі,
З шалёным пахам чаромхі
І салаўіным каханнем,—
        Людзі штогод жадаюць.
Хутчэй бы настала лета
З бурштынна-густой пшаніцай,
З яблыкамі наліўнымі,
З крымскім вясёлым загарам,
З радасцю школьных вакацый,—
        Людзі штогод жадаюць.
А каб восень хутчэй прыйшла
З безнадзейнасцю цёмных дажджоў,
З граззю, з апалым лісцем,
З няспраўджанымі спадзяваннямі
І горкімі ўспамінамі,—
        Гэткіх не чуў я жаданняў.
Восень можна лёгка пераджыць:
Вернецца вясна.
А вось юнацтва...
Ах, як трэба маем даражыць,—
        Здолееў я з тугой перараканацца.

1963

* *

Капайце у сэрцы маім магілу,
Нібы пад зялёнай ракітай...
З цябе насмяяўся няверны мілы?
Боль свой на донца кідай.

Таварыш, пячэ цябе горкая крыўда,
Точыць туга твае грудзі?
Для крыўдаў усіх маё сэрца адкрыта,—
Зносьце хутчэй іх, людзі!

Мучаць цябе, брат, старыя раны,
Ляжыш ты, да ложка прыкуты?
Я закапаю у сэрцы старанна
Цяжкія твае пакуты.

А на цябе, друг,
Паклёпнік вые?
Прывозь свае беды на тачцы...
Не хочуць толькі матулі сівыя
З горам сваім расстацца.

Сыноў ім не вернеш, не дапаможаш...
Астатняе — сэрца змесціць.
І ты, мой малы, свае першыя можаш
Дробныя слёзы прынесці.

Вы рана задумаліся аб смерці,
Няўдачнікі і калекі.
Я вашае гора зарыю ў сэрца
І знікну адгэтуль навекі.

Хай жонка і дзеці не перажываюць,
Мне цяжка, ды радасна будзе:
Ёсць горад на свеце, дзе пражываюць
Толькі шчаслівыя людзі.

1963

АКІЯН

Хоць крышачку,
Хоць кропельку
Пра Афрыку,
Пра тропікі...

Я не лішні ў родным доме,
Дзень на плечы ўзвальваю.
Толькі мучыць,
Толькі томіць,
Б'е у сэрца хвалямі

Акіян, акіян,
Сіняя Атлантыка!
Восем штормаў у запасе —
Позняя рамантыка.

Усе рэкі — сваякі,
І азёры — сваякі,
І ўсе моры — сваякі,
А ён не сваяк нікому.
Дбае пра мацерыкі,
Запасае на вякі
Корму.
Ён любіць найбольш за ўсё —
Маякі,
Чырвонага вока
Мірганне.
А дзеці яго — рыбакі, маракі,
Ахрышчаныя ураганам.
У акіяна сакратаўскі лоб,
Усюды даследчыя фермы.
Задумаўшы новы чарговы патоп,
Ён слухаў Эйнштэйна і Фермі.

На сінім гарбе ён сузор'і вязе,
Ды часам сыходзіць з арбіты,
Лухту фантастычную гнеўна вярзе,
Мяне падбівае: зрабі так!

Ён любіць навінкі.
Ухопіць за бок

Падводную лодку, «паларысы»
Ды возьме на свой акіянскі зубок,—
І лодка ляжыць у паралюшы.

Ён самы славуты калекцыянер,
На дне — шмат музеяў прасторных.
Ён самы багаты акцыянер
У справе тайфунаў і штормаў.

Ён можа так страшна, так гнеўна рыкаць
У сотні ільвіных глотак.
Ён можа пяшчотна насіць на руках
Прапашчую самую з лодак.

У добрым настроі ён нават плыты
Прапусціць ад краю да краю.
Ды будзьце крыху асцярожней.
Прытым
Пляваць на сівога не раю.

Убачыць: знаёмы плыве капітан —
На міг карабель загайдае
І гонкі дэльфінаў наладзіць.
Кітам
Арбітрамі быць загадае.

Ды мае і слабасці грозны стары:
Прыбоямі цешыць ён Афрыку.
Яе агнявая натура гарыць,
Спявае стазвоннаю арфаю.

І гэты сівы уладар навальніц —
Скажу па сакрэту вам шчыра,—
Ля ног сенегалак ён падае ніц,
Як самы бязвольны мужчына.

А хлопец прысядзе на цёплай жарстве
З дзяўчынай,—
І ён зараўнуе:
Нахмурыцца раптам,
Як бык, узраве
І мірны заліўчык зруйнуе...

Сустрэліся пяць мы, здаецца, разоў,
Пражыў з ім увогуле з месяц,
Ды чую: пульсуе па-новаму кроў
На зорным салёным замесе.

На нашых палях — ледзяная зіма,
Я ў нейкай шпакоўні зімую.
Заву акіян,
А яго ўсё няма,
І сэрца па штормах сумуе.

1963

ПАЭМА МАЙГО ЛЕСУ

На цябе, мой лес,
Як на цуд, гляджу —
Ад сасновых карон
Да блакітных красак.
Палянка дыміцца
Пасля дажджу,
Як зялёная коўдра
Пасля гарачага праса.
Ювеліршчына
Тут мігам абясцэніцца:
Гэтае зіхценне рос —
Без цэн.
Нават звонкая
Птушыная бяссэнсіца
Набывае ў лесе
Першародны сэнс...
Потым гул ідзе...
З глыбінь сусвету,
Грозны і бязмерны
Акіянскі гул.
Лес хавае ў мох
Свой воблік светлы,
Асыпае
Ігальчастую тугу.
Што ты сумна гудзіш так?
Пакінь, пакінь...
Не прытварайся суровай тайгой.
Нам паплакаць было па кім
І праклясці было каго.
Помніш,
Мы пашумім,—
А нас пасякуць
І накіруюць
Хутчэй у забой.
Кожнаму спрытнаму басяку
Лягчэй жылося,
Чым нам з табой...
Усе мы дрэвы:
Хто клён, хто рабіна, хто дуб.
Цягнемся да сонца,
Шалясцім ліствою.

Грымне навальніца —
Сагнёмся ад дум,
А зрэжа маланка —
Заснём пад жарствою.
Горш другое,
Мой зялёны дружа:
Не звяліся людзі,
Што паскудзяць нам;
Тлушчам заплылі
І раўнадушшам,
Здрадзілі
Загінуўшым сябрам.
На цёплыя месцы
Аваднямі лезуць,
Менш яны на працы,
Больш — у дактароў;
Пакрычаць прамовы
Аб ахове лесу
І бюракратычных
Наламаюць дроў.
За гультайства дай ім
Рэкі разліўныя,
Падавай
Машыны ім і дачы;
Ходзяць важна, грузна
І паціху ныюць,
Шэпчуць пра памылкі
І нястачы:
«Ад культу гінь,
Ад засухі гінь,
Ад здрады гінь...
І так штодня і бясконца...»
Быццам самі
Для людзей яны
Стаўлялі радугі
І сцiралі смела
Плямы з сонца.
Ну, каб быў
Разуты і раздзеты,
Хлеба каб не меў,
Не меў граша,—
Нахапаўся ж для сябе
І марнатраўцаў-дзетак...
Толькі цяжка іх

Злавіць на барышах.
На былое
Намякаюць тонка
І аб рэвалюцыі
Шумяць...
Не чапайце Леніна, падонкі,
Не паганьце светлае імя!
А ля іх сям-там прыдурак
Піша тысячы папер,
Майстар нуднай працэдуры,
Гучных сказаў інжынер.
Балбатнёю душы муціць,
Быццам пары наддае,
Ён і вучыць,
Ён і мучыць
І спакою не дае.
Любіць ён бадзёра каркаць,
А каб ведалі маштаб,
Настаўляў ва ўсіх ён парках
Сотні мамантавых баб.
«Будзе так нам жыць культурней»,—
Над афішамі сапе.
Заўжды дурань лічыць дурнем
Іншых, толькі не сябе...
Мы не з тых, не з гэтых
І не снім аб барахле.
Што ў цябе у лесе —
Тое ў нас у хаце.
Нам патрэбны ісціны
Простыя, як хлеб,
І праўдзівыя,
Як плач дзіцяці.
Зноў ты, лес, смяешся:
«Эх, дурны, дурны,
Кожны кар'ерыст
Цябе ашукваў.
Ні ў цябе Эльбруса,
Ні ў цябе зурны,
Ні буркі касматай ашуга».
Не бяда!
Народ пра сталь і зерне
Турбуецца.
А тут яшчэ няўрод...
Я нават і іронію

Трымаю у рэзерве,
Каб не абразіць
Незнарок народ.
Мы шорокім фронтам наступаем.
Мы амаль усе ўжо
Сёстры ды браты.
Толькі шчырасці
Нам часам не хапае,
Не хапае часам
Дабраты.
Не той слюнявай,
Што ўсё дарүе
І прыкрывае
Смаўжоў грахі;
А той, што ў будучыню
Сэрцы кіруе
І ажыўляе
Слых у глухіх...
Лес мой,
Цуд мой,
Акіян мой зялёны і сіні,
Захавальнік магіл і прысяг
І роздумаў добрых людскіх,
Я перадам нашу дружбу
Дачушцы і сыну,
Каб іх рукі ніколі
Галін не ламалі тваіх.
Сінім вераснем ці лістападам
Я спынюся ў цябе
На апошні начлег.
І мы зноў пашумім,
А пасля
Паразмаўляем без слоў:
Пра надзеі загінуўшых хлопцаў,
Пра зорныя спадарожнікі,
Пра чырвоныя журавіны і белы снег,
Пра журботны голас зязюлі
І трывожны клёкат буслоў,
Пра каханне і смутак
І пра шчасце,
Якое
Так цяжка уладкаваць на зямлі.

1963

* *

Абагачальныя фабрыкі
Патрэбны не толькі рудзе.
Абагачальныя фарбы
Патрэбны мастацкай нудзе.

І новай кінакарціне
З сюжэтам занадта паношаным,
І худасочнай вітрыне,
І кнізе самай найноўшай.

Выкладчыкам і дакладчыкам
Трэ выбіваць не раз
З тэзісаў раскудлачаных
Пустую пароду фраз.

Самі сябе падправім,
Каб кожны быў свецел і дуж.
Тады заваюем права
На ўзбагачэнне душ.

1963

ЖАРТ

Маладых паэтаў кадры
Намякаюць далікатна:

«Шмат вы рыфмаў настругалі,
Бэз увесь паабстрыгалі.

Вам пара закончыць песні
І падбаць адносна пенсій».

А якая там пара —
Іскры сыпяцца з пяра.

Чуеш — іскры, не пясок,
Сад зялёны не пасох.

Сіні верас, сіні верас,
Нам дзяўчаты покуль вераць.

А як верыць перастануць,
На улік пенсійны станем.

Будзем трутнямі гудзець,
Будзем з зайздрасцю глядзець,

Як чарнявы падшыванец
Прыгажуню ў сад вядзе.

1963

САЛОДКІ ЛУБІН

Ад Оршы да Смаргоні
Палеткі зацвілі.
На ўсю зямлю гармонікі
Каханне прывялі.

Дзяўчаты нашы любяць
Ладоў задумны ўсхліп.
Цвіце салодкі лубін.
Ля прыдарожных ліп.

Пад зорныя навесы
На ростані шляхоў
Спяшаюцца нявесты
Да сціплых жаніхоў.

Жаніх, ён сціплы, сціплы,
Ды можа забуяць,
Нібы мядзведзь той, сцісне,
Аж грудкі забаляць.

Ах, шэпат той шалёны,
Стары людскі сакрэт...
Спрадвечныя шаблоны,
Адзіныя шаблоны,
Што ўсім дарue свет.

А небакрай памечаны
Зарой.
Пара ісці.
І кофтачка скамечана...
— Пусці мяне, пусці!

Яму цяжэй ці ёй цяжэй?
Ды ў дом, стаіўшы дух,
Дзяўчына ўпырхнула
Цішэй
За галубіны пух.

І цешыцца паўночніца:
Матуля моцна спіць...
А той заплакаць хочацца,
Што вылеціць памочніца
І больш не прыляціць.

1963

АСЦЕРАГАЙЦЕСЯ ПАДРОБКІ

Я помню з сінькаю каробку
Ў кааперацыі старой.
«Асцерагайцеся падробкі» —
Было напісана на ёй...

Языкачосаў безадказных
Было у нас калісьці шмат.
Для іх усё бывала ясна
Паводле догмаў і цытат.

Я помню вас, сухіх і хмурных,
З мясцінаў розных і гадоў,
Многаступеньчатыя дурні
І дэмагогі ўсіх сартоў.

Было адно зярнятка праўды
На сноп развесістай хлусні.
Абы плацілі грошы спраўна —
Не шкадавалі траскатні.

А сёння, сёння памаўчыце,—
Нам трэба жыць і працаваць.
«Ура» так гучна не крычыце,
Калі кладуцца дзеці спаць.

У час жыццёвай пераробкі
І ўзлёту
Змоўкніце зусім.
Асцерагайцеся падробкі
І верце партыі, не ім...

Адкінем прэч мы слоўны грукат.
Цяпер — аб музыцы, ігры.
Люблю вас, чарадзеі гукаў,—
Рахманінаў, Шапэн і Грыг!

Ды часта мы ў далоні плешчам
Не тым, не тым...
Кантата. Хор.
Палёт высокі быў абвешчан,
А слухачоў бяруць на змор.

Пісаў паэт з вядомым імем,
І праўда быццам, а схлусіў...
З нас кожны песню аб Радзіме
Ў душы пад кулямі насіў.

Ірве мелодыю на часткі
Клыкамі белымі раяль.
І сум, як шэры дождж, зашастаў,
І падрабнела раптам даль.

О кампазітарская копаць,
Пустой рыторыкі настой!
Тых пышных слоў і гукаў хопіць
Халтуршчыкам гадоў на сто.

Хай лепей вальс гучыць «На сопках...»,
Там ёсць жывое пачуццё.
Асцерагайцеся падробкі
Ва ўсім, усюды, ўсё жыццё.

1963

СВЯТОЧНЫЯ САЛЮТЫ

Грымяць, грымяць святочныя салюты...
I феерверкі зырка рассыпаюцца,
I дзетвара да батарэй збягаецца,
I смех, і крык на кожнай плошчы люднай.

А мне заўсёды страшнавата робіцца,
Як неба засцілае дымам шызым,
I жаласна звіняць у вокнах шыбы,
I нечыя матулі сумна горбяцца.

Руіны пад асфальтам ціха стогнуць,
I прывіды мінулага ўстаюць,
I б'юць гарматы ў маладосць маю,
I вусны ад пякельнай смагі сохнуць...

Вам весела, шчаслівыя дурніцы,
Вас цешаць халастыя перуны,
А я ўвесь век нясу ўсё ад граніцы
Трывожныя калючыя зарніцы,
I плач, і хрып, і грукаты вайны.

Нявесела, як сто гармат бабахне...
Нясцерпна горка гарадам згараць,
Нялёгка і героям паміраць,
I кожны подзвіг кроўю душна пахне...

Сябры мае,
Прашу цішэй паліць:
Зямлі яшчэ баліць.
I мне баліць.

1964

МІНСК ЕДЗЕ ПА ГРЫБЫ

Бярыце, дзеці, кошыкі,
Паедзем мы на пошукі
Тугіх баравікоў.
А то яны застояцца,
Пад лісцямі затояцца
Ад лісаў і ваўкоў.

Вясёлая трывога
Прагнала моцны сон...
Блакітная дарога
З асенніх верасоў.

Народ ажно засопся:
Захопніцкі настрой.
Грузавікі, аўтобусы
І матацыклаў рой.

Нейлонавыя вёдры,
Рукзачныя гарбы.
Вей, вецер,
Хвойным водарам —
Мінск едзе па грыбы!

А восень у маністах —
Рабінавы рубін.
Аўтамабіль міністра
Нясмела затрубіў.

Пасады — у мурашнік!
А баравік — тут чын.
І рыжык — добры бражнік —
Знаходка для мужчын.

Чаго ж, як тыя дурні,
Мы столькі летаў, зім,
Нібыта ў смалакурнях,
На зборышчах сядзім?

А сэрца цёпла ные
Пад ціхі звон асін,

Што людзі ўсе зямныя
Нядрэнныя зусім.

Зямля, нібы жывая,—
Варушыцца цянёк.
І кожны адчувае
Сябе, як дзіцянё:

Не важкім фактам веку
І не кіраўніком,
А проста чалавекам,
Заўзятым грыбніком.

А бор такі духмяны,
Загадкавы такі!
Крамяныя, румяныя
Стаяць баравікі.

А бабак, сыраежак
Не возьме і гультай.
Хадзі сабе з усмешкай,
Настой лясны глытай.

Блукаюць грыбазбіры,
Якоча рэхам лес.
А я сумую шчыра,
Што ў пекла спраў залез.

Мне паказала восень
Маленства след майго...
Стаіць адзін між сосен
Клён жоўты, як мангол.

Прыцеміўся гушчарнік.
Пара дадому. Час...
Піжонаў збіла чарка —
Згубілі «Масквіча».

Аўто — як балаганы:
Сто радуг па бартах.
А вёдры — з берагамі,
Ну проста любата!

Выходзьце урачыста
Нас, цешчы, сустракаць.
Рыхтуйце пляшку чыстай
Ды ёмістую кадзь.

Зара на Мінск цярушыцца —
Як жар, у печ грабі.
У кожным доме сушацца
І смажацца грыбы.

1964

РАБІНАВЫ ГАЙ

Восень, жоўтым крылом не махай,
Не ўзляцець табе ўслед за зязюлямі.
Я прыйшоў у рабінавы гай,
Гай мой ціхі,
Як сам я, зажураны.

Лета справіла шчодра памінкі:
На рабінах — чырвоны агонь.
Гэта гронкі маіх успамінаў,
Гэта колер болю майго.

Гэта след і зары, і кахання,
Знак праклятай замовы,
Дрэў апошняе красаванне
Перад белаю карай зімовай.

Зноў зямля стане белым экранам.
Дык няўжо, што было,— упустую?
І чырвоныя гронкі, як раны,
Снегапад забінтуе?

Птушкі чырвань усю раздзяўбуць
Па ягадцы, па ягадцы,
Каб вясною рабінам вярнуць
Па песеньцы, па песеньцы.

А ці вернешся ты, дарагая,
Да гэтага гаю?

1964

АДЗІНОТА

Што такое антыматэрыя?
　　Голас мёртвага салаўя,
　　На магнітную плёнку запісаны.
Акіян урываецца з гулам
　　У пакой мой,
　　Завалены кнігамі.
З джунгляў выскачыў
　　Тыгр паласаты,
　　Сігануў у напрамку буфета...
Зноў ажыў пахаваны акцёр,
　　Пазірае жулікавата
І стараецца рассмяшыць
　　Старажытнымі прэснымі жартамі.
Потым лектар пра сувязь з жыццём,
　　Аб маральным абліччы бубніць;
Сам жа век на лянівай тахце
　　Хціва лічыць свае ганарары...
Валадар электроннае лямпы,
　　Годзе прывідны свет выклікаць,
Годзе моўчкі сядзець і курыць
　　У такой незямной адзіноце...
Ты пра шчасце сто кніг прачытай —
　　Без яе шчаслівейшы не станеш.
Пра каханне ўсе фільмы прагледзь —
　　А мацней, чым яе, не палюбіш.
Горад шчодра заліты святлом —
　　Вочы слепяць мільёны агнёў.
У адным толькі цёмна акне —
　　А табе ўжо святла не хапае.
Дык нырні ў чалавечы прыбой,
　　Што на вуліцы голасна плешчацца.
Можа, цёмнае тое акно
　　Для цябе ў гэту ноч загарыцца.

1964

СУМЛЕННЕ

Зноў плявузгаюць: «Кепска будзе.
Час няўстойлівы і благі...»
Хлусяць не багі, а людзі,
Крывадушнічаюць не багі.

І мяшчанскае гэта вар'яцтва
Горкім пылам вісіць над табой.
Паспрабуем не прытварацца:
«Што ты зробіш»,—
А рынемся ў бой.

Мы на чулых людзей багаты,
Злосці б трохі да чуласці той!
Часта гады і тарбахваты
Карыстаюцца дабратой.

Праўда веку!
Зрабі нас дужымі,
Рабства знішчыць дапамажы:
Рабства жонкі і рабства мужа,
Рабства дачаў і аўтамашын;

Рабства чаркі, паперкі, блату,
Біркі званняў і крэслы чынуш.
Мы плацілі вялікую плату
За шчаслівы наш дзень.
Дык чаму ж

З-за каня, з-за палена без гневу
Удава б'е паклоны царку?
Сярод белага дня нейкі невук
Старажытную нішчыць царкву?

Век наш любіць дакладнасць і мужнасць.
Будзь праўдзівы, бо ты камуніст.
Вось хапуга. Вось хам. Вось двурушнік.
Канцылярскі арол. Кар'ерыст.

Мяне мучаць сумленне і памяць
Аб загінуўшых.
Што ж, рызыкнём
Біць хлусню без чарговых кампаній
У другіх і ў сабе. І з агнём.

1964

НАЧНЫЯ ГАЛАСЫ

Сяджу ўсю ноч каля прыёмніка,
За гузік шар зямны кручу.
То свіст, то твіст, то пра біёніку...
Чаго шукаю?
Што хачу?

Зямля падзеямі аглушана:
Эпоха мае бас густы.
Мы словападам зацярушаны,
Як снегам цёмныя кусты.

Эпоха наша галасістая,
Бо кожны хоча прагучаць.
Каму свістаць, каму падсвістваць,
Каму крычаць, каму маўчаць.

Парыж мурлыкае і лашчыцца,
У Кёльне вые модны джаз.
Нашчадкі крыважэрных прашчураў
Клянуць з-за акіяна нас...

Бушуе ў моры шторм асенні,
А з Мурманска ў сцюдзёны змрок
Да марака на хісткі сейнер
Ляціць дзіцячы галасок:

«Цябе чакаем вельмі, татачка,
Хутчэй дадому прыплывай».
І сэрца радасна затахкала:
Жыві, марак, не памірай!

Кароткай хвалі я удзячны:
Жыццё не гасіць ліхтары,
І глушыць галасок дзіцячы
Нечалавечы злосны рык.

1964

РОДНАЯ МОВА

Кажуць, мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй зыікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.

Гэта ластавак шчабятанне,
Звон світальны палескіх крыніц,
Сінь чабору, і барвы зарніц,
І буслінае клекатанне.

Калі ж хто загадае: «Не трэба!» —
Адрачэцца ад мовы народ,—
Папрашу я і сонца, і неба:
Мне не трэба ні славы, ні хлеба,
Асудзіце на безліч нягод.

Толькі месяцаў назвы пакіньце,
Назвы родныя роднай зямлі,
Пра якія з маленства ў блакіце
Бор шуміць і пяюць жураўлі:

Студзень — з казкамі снежных аблокаў,
Люты — шчодры на сіні мароз,
Сакавік — з сакатаннем і сокам
Непаўторных вясновых бяроз,

Красавік — час маланак і ліўняў,
Травень — з першым каханнем, сяўбой,
Чэрвень — з ягаднаю зарой,
Ліпень — з мёдам,
З пшаніцаю — жнівень,

Спелы яблычны верасень,
Светлы кастрычнік
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
Лістапад — залаты лістапад,
Снежань — першы густы снегапад...

Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

1964

РОЗДУМ

Карыбскія піраты
Ўцяклі ў Панамскі порт.
Японскі імператар
Вітаў сусветны спорт.

І ныюць усязнайкі
У горадзе маім:
Ад Явы да Ямайкі
Усё вядома ім.

Лімоны і бананы —
Занадта ўжо банальна,
І кофтачкі з нейлону —
Для іх ужо шаблонна.

Прывыклі да маштабаў:
То форум, то кангрэс...
А ў нас цвітуць каштаны,
І вішні, і агрэст.

І ракатанне бору,
І сонца над ліствой,
І Нарачы прыбоі —
Якое хараство!

Пакуль там касманаўты
Рыхтуюць новы цуд,
Б'е на Палессі нафта,—
Ад радасці танцуй!

А гэтыя не бачаць:
На цуд ім напляваць,
Віхлява твісты скачуць
І джынсамі фарсяць...

Не вохайце, не ахайце.
Каго паэт уцяў?
Мы ўсе стаім на вахце
Вялікага жыцця.

Таварышы парторгі,
Бацькі і песняры,
Ці не зашмат без толку
Сядзім мы да зары?

Ці тыя кажам словы,
Ці ўсё знайшлі яны
У нас, каго сурова
Вучылі дні вайны?

1964

ПРА СОНЦА І МЕСЯЦ

Рэдка сонца з месяцам страчаюцца.
Свецяць паасобку.
Дзень і ноч.
Ды яны, раўніўцы,
І спрачаюцца
З-за цябе, зямля, даўным-даўно.

Абяцанкі, клятвы
Месяц любіць надта,
Сее ў цемры сны
То страшныя, то лёгкія;
Шэпча нешта астраномам, касманаўтам
Пра сузор'і,
Пра галактыкі далёкія.

Пасвяціў і знік.
Пакінуў холад рос,
Туманоў няўпэўненую дымку,
Успамінаў трохі пра абдымкі
Ды чарніц у кожны лес натрос...

А узыдзе сонца —
Крылы качак
На рацэ пакратае,
Затым
У калысках валаскі дзіцячыя
Паказыча пальцам залатым.

І праз лісце паліецца санцападам,
Кветкі і плады
Напоўніць мёдам шчодра,
Густа сыпане суніц на ляды,
Пагасцюе у калодзежах і вёдрах.

А як светам восень завалодае,
Сонца ўсё пакрые
Цёплай пазалотаю.
Нават лужыны — кавалачкі блакіту —
Клапатліва будуць ім прыкрыты
Залатымі донцамі,
Кляновымі сонцамі.

1964

СЭРЦА І КРЫЖ

Жыў доктар у нашай мясціне.
Няма ўжо такіх дактароў:
Паставіць ён банькі ці п'яўкі —
І заўтра ты жыў і здароў.
Дарадчык, суддзя, павітуха,
Мужыцкі сівы кастапраў,
Ён ведаў душу кожнай хаты,
Сакрэты ўсіх кветак і траў.
Не быў прагавіты на срэбра
І жыў беднавата, дзівак.
Дзе іншы урваў бы чырвонец,
Ён браў сарамліва пятак.
Бурчаў ён на гразь, забабоны,
Ды вельмі тут не пакрычыш:
Няўроды, пажары... А сохі
Ламаюцца аб карчы.
На п'яніц вясковых сварыўся,
З галечай людской не мірыўся,
А там пастарэў, занядужаў,
Ад працы бяссоннай змарыўся.
Пастукала смерць да старога...
А доктар, раней чым сканаць,
Паспеў запаветнае слова
Мужчынам старэйшым сказаць:
«Ля вёскі мяне пахавайце,
На горцы, дзе белы бярэзнік;
Пастаўце мне крыж на магіле
Высокі-высокі, жалезны...»
Памёр без пакут ён, і людзі
Маўкліва схіліліся ў горы.
Прыйшла на хаўтуры ўся воласць,
І плакалі бабы уголас:
«Бывай, наш вялікі заступнік,
Ты быў справядлівы і чэсны...»
Сяло на магіле яго
Паставіла крыж высачэзны.
І дзіва! З вясны той журботнай
Пажары у вёсцы звяліся,
Хоць грукаў пярун і маланкі
Ляцелі з падвоблачнай высі.

Пра цуд разышліся легенды,
І мала хто знаў у народзе,
Што крыж навальнічныя беды
Ад стрэх саламяных адводзіў;
Што мёртвае сэрца
Людзей, як жывое, любіла,
Агонь на сябе выклікала,
Маланкі ў магілу лавіла.

1964

РУСКАМУ БРАТУ

Луг да лугу,
клён да клёна,
гай да гаю —
То зялёнае суседства дзвюх рэспублік.
Ты ў сэрцы ў нас, Расія дарагая,
След сыноў тваіх у памяці не згублен.

Замяніла востры боль туга тупая,
Не забыць, як узрывалі мы масты.
З рускім братам праз лясы мы адступалі,
Адступалі мы з баямі да Масквы.

Пасівелі ад бяды і пылу каскі...
Помніш, на ускраіне сяла
Беларуска з ціхім плачам: «Калі ласка» —
Малака гладыш нам падала.

І цябе сынком яна назвала,
Ну а мне стаў родным рускі дом.
Нас адным снарадам забівала,
Руская жанчына бінтавала
У санбаце нас адным бінтом...

З той пары радні у нас багата
Крэўнай, партызанскай, франтавой.
Слава вам, адважныя салдаты,
Што ў абдымку з беларускай спяць зямлёй!

Беларусь нікога не забыла,
Мёртвых і жывых сваіх салдат.
Вырас каля кожнае магілы
Светлы дом ці яблыневы сад.

І цяпер на нашым добрым свяце
Зноў абдымкі, слёзы і сцягі.
Запрашаюць людзі ў кожнай хаце:
«Калі ласка, брат наш дарагі!»

1964

МАСКІ

На Беразе Слановай Косці
У белым Абіджане
Мы, першыя з Расіі госці,
Два дні былі ў пашане.

Мы ездзілі ў гілеі,
Мы бачылі гарыл.
І гэтак загарэлі,
Што думалі — згарым...

Ад той спякоты вязкай
Схаваліся ў музей мы.
А там на сценах — маскі
Ва ўсёй красе туземнай.

І белыя, і чорныя
З чырвоным абадком.
Трапічных, страшных, чортавых,
Набіта іх бітком:

Абрадавых, таемных,
І новых, і старых.
Мне смешна і прыемна
Было глядзець на іх.

У масках тых вядзьмарскіх —
Наіўны жах дзяцей.
А я успомніў маскі
На тварах у людзей...

Я ведаю такіх,
Што ходзяць век у масках.
Злаба на сэрцы ў іх,
А носяць воблік ласкі.

Дзве маскі прада мной
На нечым твары тлустым:
То велічы тупой,
То ліпкага халуйства.

Насіў адзін ліхвяр
З душой крывой садыста
Спакутаваны твар,
Нібы са злом судзіўся.

Жывуць, нібы браты,
На дабрачынным твары
То маска дабраты,
То маска божай кары.

Я добра знаю тых,
Чый заліхвацкі рогат
Ператвараўся ўміг
У рогат скамарохаў...

Калі б сабраць усе
Мне маскі ды па жанрах,
Адкрыў бы я музей
На зайздрасць Абіджану.

А лепей збыць бы іх
Для аперэт і казак.
А лепш пісаць пра тых,
Хто век жыве без масак.

1964

ФРАНТАВІКІ

Франтавікі старэць не маюць права,
І колькі там гадоў ні набяжыць,
А нашы твары, як і нашы справы,
Заўсёды будуць маладымі жыць.

Бо іх такімі — з добраю усмешкай —
Запомнілі гісторыя і час,
І тыя полькі юныя і чэшкі,
Што ў сорак пятым абдымалі нас...

А хто не паспрыяў людскому шчасцю,
Каго і сёння гне халуйскі страх,
Дык той не франтавік, не нашай часці,
А недзе акалачваўся ў тылах.

1965

У СОРАК ПЕРШЫМ

Жоўты месяц у пчаліных сотах,
І ляціць ад зор пчаліны звон.
Спіць на лузе пыльная пяхота,
Бомбы не ірвуць салдацкі сон.

Перш чым леглі, цэлы месяц беглі...
Адпачынак крохкі і малы.
Над ракой туман узняўся белы,
Маскіруе чорныя ствалы.

Камандзір чакае данясення,
Думае аб жонцы маладой:
«Эх, навошта пасляшыў з вяселлем...»
Смерць і рэўнасць ходзяць над вадой.

Ёсць вінтоўка і махоркі пачак.
Ёсць ватоўка, хлеб і зрэдку боршч.
Б'ешся чэсна ты, а людзі плачуць,
І на сэрцы ўсё цяжэй і горш.

Будзе ганьба. Будзе акупацыя.
Будзе потым пераможны май.
А пакуль што вокліч: «Акапацца!»
Уставай, салдат, і зноў капай.

Тэхніка пазней загрукатала.
А найбольш запомнілася нам,
Як сапла, варочала, крахтала,
Ціха мацюкалася вайна.

Ноч капалі моцныя акопы,
На світанні — зноўку адступаць...
Мы перакапалі паў-Еўропы,
Перш чым перамогу адкапаць.

1965

САМАЕ СТРАШНАЕ

Жахлівых малюнкаў цяжкія альбомы:
Руіны і асвянцімскія стражнікі.
Але на вайне
Руіны і бомбы
І нават смерць —
Не самае страшнае.

Страшна пакінуць дзяцей між бяды.
А потым ісці і не ведаць куды.
І, адступіўшы да сэрца Расіі,
З крыўдай падумаць: навошта хлусілі?

Страшна зняверыцца у святынях,
Бачыць змарнелых жанчын у тыле,
Ад якіх адрываецца твой паёк...

А потым, адбіўшы чужы гарадок,
Рукамі, што ад агню не астылі,
Раздаваць галодным, малым і старым,
Цяжкія салдацкія сухары.

1965

АПЕЛЬСІНЫ

Ішлі мы на Дзям'янск.
Тылы адсталі.
Пасля адлігі —
Снег нібы з жарствы.
Хоць бомбы ўсё радзей,
Радзей свісталі,
Было шмат мін
І не было жратвы.

І раптам каля нейкіх сутарэнняў
Байцоў сустрэў з ухмылкаю начпрод.
Трымаў ён, нібы ўласнае тварэнне,
Іспанскі фантастычна яркі плод.

Мы апельсінаў да вайны не елі...
Ахрышчаныя сотнямі баёў,
Трафеі залатыя мы умелі
Цаніць не горш іспанскіх каралёў.

У залатых вёсялых апельсінах
Быў прысмак перамогі.
Дажылі.
На восем вёрст за намі ў снезе сінім
Аранжавыя кветкі расцвілі.

Пакуль мы гарадок разбіты бралі,
Ішлі на захад па чужых слядах,
Забітыя сябры на снезе спалі
У белых апельсінавых садах.

1965

ЯК ЗЯЗЮЛІ ЗАКУКУЮЦЬ...

Паўтараецца вечна,
А гучыць не завучана
Кожнай новай вясной
Кукаванне зязюльчына.

Маладым лічыць годы,
Непаседам — прыгоды,
Нам, салдатам старым,—
Баявыя паходы

І магілы, магілы...
Ля кожнае вёскі —
Нашы аднапалчане,
Аднафамільцы і цёзкі.

Як вясною зязюлі
Ў Беларусі маёй закукуюць,
У Сібіры, на Волзе
Па мёртвых сынах засумуюць.

Не патрэбна забітым
Ні славы, ні вечнасці.
Іх матулям сівым
Трэба ціхай сардэчнасці.

Прыязджаюць да нас
Яны ў светлыя дні перамогі
На зялёныя нашы
Лясныя дарогі.

Кожны год мы і плачам,
І чарку бяром разам з імі,
І становяцца ў дні тыя
Мёртвыя зноўку жывымі.

1965

* *

Зерне праўды і праўда зерня —
Тут істотная розніца ёсць.
Пышната экспанатаў музейных
Не ўлагодзіць жытнёвую злосць.

Зерне любіць на цёплай далоні
Перад новай сяўбой паляжаць.
Зерне верыць: не заўтра, а сёння
Будуць людзі яго паважаць.

І тады яно закаласуе,
Колас будзе паўнюткі надзей.
І тады яно прагаласуе
За багацце і шчасце людзей.

1965

ПАМЯЦІ М. СВЯТЛОВА

І сыплецца снег, і знікае...
Начных галасоў перакат.
«Страхуйце жыццё!» — заклікае
Зялёны электраплакат.

Начныя хлуслівыя зоры,
Вялікі ўстрывожаны свет...
«Старык, [redacted] ты знаеш кантору,
Жыццё дзе страхуе паэт?»

Картавы, ласкавы твой голас,
Слабенькі удар па плячы...
А дзе ж ты? Нікога наўкола...
Сумленне, хоць ты не маўчы:

Паэты жыццё не страхуюць,
Паэты адкрыта жывуць,
Часамі без грошай кукуюць,
Гарэлку пякучую п'юць.

І ўсе назаляюць занадта:
«Ах, Міша, такі ды сякі...» —
Зайздроснікі і мецэнаты,
П'янчужкі і літбасякі.

Прыяцелі хмура бядуюць,
Чыноўнікі шэпчуць: «Распад...»
Паэт нават ім не шкадуе
Свой досціп аддаць для цытат.

Зайздроснікі моршчацца: «Міла...»
Ды лічаць крупінкі удач.
А сэрца паэта ўмясціла
Увесь боль чалавечы і плач.

Жартуе паэт і смяецца,
Але над людзьмі ён не кпіць,
Бо радасць нялёгка даецца,
Бо жартам няцяжка і збіць.

А ён, недагледжаны, кволы,
Быў добры і стойкі салдат;
Заўсёды быў з моладдзю молад,
Старэйшы таварыш і брат.

Паэты працуюць, гаруюць,
Ваююць і песні пяюць.
Паэты жыццё не страхуюць,
Таму у вяках і жывуць.

1965

У БЕЛАВЕЖЫ

На пушчу нацэлены
З розных бакоў фотавочы,
Ласі ды алені
Красуюцца перад табой.
А дзік не ахвочы здымацца,
І зубр не ахвочы,
Адзін — у гушчар,
А другі можа рынуцца ў бой.

І так недарэчы
У гэтых лясах непацёртых
І рогат турыстаў,
І бляск тых прылад рэпарцёрскіх,
Што хочацца пушчы
Зялёныя вочы заплюшчыць,
Каб тлуму эпохі не бачыць,
А быць толькі пушчай...

І зубр белавежскі
Прыжмурыў журботнае вока,
І вуха трывожна наставіў,
І чмыхнуў зласней.
Імкнецца успомніць
Аб нечым далёкім-далёкім,
Ды, так і не ўспомніўшы, знікне
І каля зуброўны засне.

1965

КАСЦЁР НА ЛУЗЕ

Вось і май падышоў неўпрыкметкі,
Зноў рассыпаны ля берагоў
Адуванчыкі — рыжыя кветкі,
Залатыя вяснушкі лугоў.

І табе трохі іх перапала,
Каб прыкметней была за сясцёр...
Мы сягоння над рэчкай запалім
Свой апошні вясновы касцёр.

Будзе сонца павольна заходзіць,
Рэчка хвалямі не калыхне,
І шумлівае наша стагоддзе
З намі ў лодцы крыху адпачне.

На губах, на рыбацкім вядзерцы
Водбліск полымя будзе ляжаць.
Будзе юшка гарачая з перцам
Злабадзённасць і вечнасць сцвярджаць.

У нязвычных умовах са свістам
Будзе чайнік злавацца, кіпець.
Будзе наш пашлаваты транзістар
Песні мілыя Зыкінай пець.

Будуць зоркі гарэць не ўрачыста,
А па-свойску, адным толькі нам...
Усе творы абстракцыяністаў
За такую канкрэтнасць аддам.

Павучай мяне, крытык, і злуйся,
Намячай рэалізму шляхі.
Я з любімай сягоння на лузе
І да крытыкі мудрай глухі.

1965

МОЙ КАЎКАЗ

«Чарох-Карабах, Чарох-Карабах»,—
Па-азербайджанску цягнік гаворыць.
Заваконны вецер б'е па губах,
Вітаюць нас белымі шапкамі горы.

Люблю я вяршыняў магутны натоўп.
Якая ў іх годнасць і веліч!
А што там за імі?
Грымотны паток
Ці сонна сады ружавеюць?

Я чую ўжо мора прыглушаны звон,
А вунь і яно — навальнічнаю хмараю.
І логіка шумна ляціць пад адхон:
Дзе тут Балкарыя?
Дзе Балгарыя?

У горных рэспублік — арліны маштаб,
Калі яшчэ мора ды сонца,
Якой бы краіна малой ні была б —
Прасторы яе бясконцыя.

Зачараваны, бадзяюся я
Па вуліцах душных Сухумі.
Выходжу да мора, гляджу на маяк
У нейкай трывозе і суме.

Патокі сонца лагодна журчаць.
А колькі прыгожых дзяўчат,
Духмяных, нібы мацыёла,
Ад сонечнага мацыёну.

Прыезджыя гейшы тут п'юць айгешат,
А я цынандалі заказваю...
Відаць, то не гейшы. Яны не грашаць.
Яны захварэлі Каўказам.

І мне ж дастаткова твайго кіўка —
Я плюну на ўсе насмешкі
І зноў памчуся на сіні Каўказ
У пошуках згубленай сцежкі.

1965

* *

І неба не праяснілася,
І дождж затапіў паплавы,
І ноччу мне сёння прыснілася,
Што быццам бы я нежывы.

Дапісаны пісьмы і вершы,
Запоўнены сотні анкет.
Пісьменнікі ў гонар памершага
Ладзяць прытворны банкет...

Прачнуўся. На сэрцы — дрэнна.
Трывога ў сэрца б'е:
Няўжо пражыты дарэмна
Гады агнявыя мае?

Мацней бы хацелася верыць
І людзям, і дружбе, і вершам,
Ды толькі дарог тых не мерац,
Што змералі мы ў сорак першым.

Не паўтараць памылак,
Не даравацб зняваг,
Адстойваць з большай сілай
Чырвоны ленінскі сцяг.

1965

ПРОСЦЕНЬКАЯ ПЕСНЯ

Была Аксана пекнай,
Прыгожаю такой:
Хадзілі хлопцы ў пекла
За ёю талакой.

Скажы — разваляць хату,
Скажы — паставяць зруб.
Чарнявы, зухаваты
Быў ёй хлапчына люб.

А што ты нарабіла,
Шалёная краса!
Ля хаты на рабіне
Пасохла ўся раса.

Жыць выпала ёй з іншым —
Нядрэнным, ды не тым.
І вусны ўжо не вішні,
І косы — шэры дым.

Завяла, пастарэла,
Не хочацца старэць.
А шчасця не сустрэла,
Што думала сустрэць.

Не ведае Аксана,
Каб з тым яна жыла,
Журылася б таксама,
Што шчасця не знайшла.

Не пахне болей мята,
З рабін сышла раса.
Ва ўсім тут вінавата
Прапаўшая краса.

1965

* *

Мы выцерпелі
многа,
Нас гора часта мяла.
Для жыхара зямнога
Скупога сонца
мала.

Не трэба
мерадь лета
Працягласцю зімоўкі:
«Лепш не пішы
пра гэта,
Пра цяжкасці замоўкні...»

А па якой рацэ
Плыве к нам
столькі пошасці?
Як мельнік у муцэ,
Свет у хлусні
і пошласці.

Сумленныя мы ўсе,
Ды рэдка
дружым з подзвігам.
Рака жыцця нясе
Зашмат струменяў подленькіх.

А як ачысціць муць?
Скажы,
якімі фільтрамі?
Жывуць
і ў вус не дзьмуць
Прыстасаванцы хітрыя.

З іх кожны
быццам б'е
Старое
грозна розгамі,
А сам дабро грабе,
Схаваўшыся за лозунгі.

Па мне дык лепш турботнае
Жыццё, ды без хлусні.
Змарыўся —
плечы потныя
Дажджом апаласні.

Не заімшэй надградамі,
Над скрынямі з дабром.
Працуй,
дружы і радуйся
За наш вялікі дом.

Бо трэба нам
пакінуць
Наследнікам навек
Праўдзівую краіну
Між салаўіных рэк.

1965

* *

Прыязджаюць людзі у горад,
Пасівелыя людзі.
Ходзяць,
Прыпыняюцца, уздыхаюць
І з трывогаю нешта шукаюць,
Але не знаходзяць
Аніводнай прыкметы знаёмай:
Ні вежы, ні дрэва,
Ні плошчы, ні дома...
І толькі ноччу, цёмнай і горкай,
Паглядзяць на высокія зоркі —
І пазнаюць,
І зразумеюць,
Што гэта іх родны горад,
Незнаёмы
Пасля перажытага гора,
З мільёнам новых прыкмет
Для іншых.

1965

ДОБРЫ НАСТРОЙ

Малаверы, песімісты, ныцікі,
Скептыкі і нігілісты худасочныя,
Гляньце, як бушуе
Сонца у зеніце,
Як набраклі слівы
Сокам сонечным.

Што вам не жартуецца
І чаму бунтуецца?
Я таксама з вечных бунтароў.
Нашы беды, нашы крыўды забінтуюцца,
Вылечымся мы без дактароў.

Можна ў мутным побыце азлобіцца,
У такой складанасці
Трэба жыць прасцей.
І тады на кожным школьным глобусе
Пальма залатая прарасце.

Трэба рана ўстаць,
У холад рэчкі бухнуцца,
А няма ракі — нырнуць пад кран,
Каб у душнай і маленькай куханьцы
Адгукнуўся звонам акіян.

Перакіньцеся з суседкай
Словам, з ласкаю,
Жонцы пацалунак падарыце,
Пяць хвілін паразмаўляйце ў скверы
З ластаўкай,
Нос малому плаксу падатрыце.

Хворага наведайце ў палаце,
Добрае нядобраму парайце,
Бюракрата чэрствага палайце,
Што завёўся ў вашым апараце.

Толькі не падтакавайце бонзе,
Толькі не храбрыцеся пасля,
Толькі не таўчыцеся ў абозе
З гордай незалежнасцю пасла.

Помніце пра ўсе зямныя мукі,
Напрацуйцеся, каб забалелі рукі.

Не выдумвайце праблем галаваломных,
Хай вас раўнадушша не саб'е,
І галоўнае,
Галоўнае,
Галоўнае —
Не хлусіце ні народу, ні сабе...

Можна раіць,
Можна лаяць.
Верыць можна.
А чаму на сэрцы
Так журботна і трывожна?

Патрэбна зубы сцяць,
Змагацца з муццю звыклай,
Каб з нашага жыцця
Бездапаможнасць знікла.

ЗА ВОГНЕННЫМІ ВЯКАМІ

У паэтаў няма забароненай зоны,
Ты заўсёды нам сніўся,
Бяскрайні сусвет.
З цёплай зямлі,
Зялёнай, азоннай,
Кліча нас уладарна
След касмічных ракет.

Знаю, што ў калысцы
Нам не заставацца.
Толькі сэрца часам просіць злітавацца:
«Не спакушай нас высокай песняй
Гэтак рана, Галактыка.
Як валуны неачэсаныя —
У нас цяжкія характары.

Ёсць у нас і турмы
З арміяй канвойнай,
Ёсць у нас плямёны
З каменнага веку.
Мы яшчэ ў жорсткасці,
Мы яшчэ ў войнах,
Мы яшчэ ў злосці,
А ты нам — пра Вегу.

Мы яшчэ сварымся з-за прапіскі,
Загрудкі бяромся з-за розных прэмій...»
Кружаць спадарожнікі
З марсіянскім піскам:
«Будучыня блізка!
Будучыня блізка!
Ты — чалавек,
Ты мацней за крэмень».

Што ж, калі нізрынуты
Багі і ўся хімерыя,
Даць трэба людзям нешта,
Раўнацэннае багам.
Расшчапілі атам,
Зараз космас мераем
І з зямлі ірвёмся
К зорным берагам...

Там, за ліўневымі, за снежнымі,
За вогненнымі вякамі,
Пэўна, будзем здавацца мы смешнымі,
Наіўнымі дзівакамі.
У таемнай і грознай будучыні
Будуць жыць не адны касманаўты.
А булачнікі?
А будачнікі?
А распуснікі і манахі?
Хутка чалавецтва
На зямлі падвоіцца,
Недзе будзе ўпасці
Яблыку разладу.
Дзе падзець грабежнікаў, забойцаў?
Што рабіць нам з ядзернымі складамі?

Што нам прынясуць наступныя гады?
Толькі б не сышлася сіла з сілай,
Толькі каб не сталі гарады
Атамнаю брацкаю магілай.

Афрыка і Азія
У бядзе крывавай...
Зорная фантазія,
Станавіся явай!

Касманаўт
Зямны духмяны хлеб жуе,
Вальсы Штрауса
Паміж зорак гойсаюць...
Толькі б захаваць
Усё найлепшае,
Толькі б пахаваць
Усё найгоршае.

Бо без чалавечнасці
Не будзе і вечнасці.

1965

СЛОВА ПРА МІНСК

Я помню франтавыя гарады,
Я помню вас, паселішчы сляпыя.
У памяці маёй сірэны выюць,
Як вылі ў тыя цёмныя гады.
Нічым нас не застрашыць, не здзівіць:
Здаецца, з намі ўсё ўжо бывала.
І грозны гул ваеннага абвала
У сне нас хоча часам раздавіць.
Ты стаў ізноў відушчым, горад мой!
І нам не сорам Мінскам пахваліцца.
Ды хочацца часамі нахіліцца
Над скруткам старажытнасці сівой.
А з даўніны нічога не чуваць —
Вайна спаліла помнікі і кнігі,
І берагоў няма на берагах Нямігі,
І Мінск стары ўжо нельга і пазнаць.
Хацеў я, каб і Мінск Градчаны меў
І бронзу палкаводцаў ганарыстых,
І нейкім замкам спакушаў турыстаў...
Ды ён другою славай прагрымеў.
Дык што, падлічым, дасталося нам?
Імя сталіцы, нараджэння дата,
Падполля слава з кроўю напалам
Ды каракумы попелу ў дадатак.
Ты — горад мой і быццам бы не мой:
Усё ў табе нязвычнае і новае,
І рокат завадскі тваёю стаў асноваю,
І пахнеш ты жалезам і сасной.
Ад плошчаў да лісточка на вярбе
Мы зноў цябе стварылі, родны горад,
І рукатворным цёмна-сінім морам
Завабілі мы чаек да сябе.
Мы дзецям горад свой перададзім,
Свой дом, свой дождж і месца на заводзе...
А хочацца звязаць усе стагоддзі
У сноп адзін.
Бо Мінск у нас адзін.

1965

ГАЙНА, ГАЙНА...

Што за кара!
Вечна трапятацца,
Мучыцца
З-за кожнай драбязы...
З мітуснёй
Пара мне развітацца,
На лугі падацца
Ды ў лясы.

На пісьмовы стол,
Нібы на плаху,
Болей
Галавы не пакладу.
Не хачу
Ні жартаваць, ні плакаць,
Ні чытаць
Мастацкую нуду.

Ад шаблонных слоў,
Ад папугайных
Паўтарэнняў
Знікну ў глушы.
Паблукаю
Каля ціхай Гайны
У сасновай
Сонечнай цішы.

Хай грымяць
Спаборніцтвы па боксу,
Хай спявак
Па радыё хрыпіць...
Дзеці спяць,
І птушкі спяць,
І бог сам
З неба збег
І ў нечым сэрцы спіць.

Там, дзе зоркі
Чыста перамыты
У крыштальных водах
Сініх рэк,

Нібы фараон
У пірамідзе,
Буду спаць я ў стозе
Цэлы век.

І прысніцца мне,
Што жыў калісьці
Па законах музыкі
Сусвет.
Раніцой знайду
Між траў і лісцяў
Самых лепшых вершаў
Цёплы след...

Зноў званок...
Пабойцеся вы бога:
У мяне нагрузак —
Цераз край!
Любіць засядаць
Мая эпоха...
Гайна, Гайна,
Трошкі пачакай.

1965

ДЗЯЎЧАТЫ МЫЮЦЬ ТАНК...

Дзяўчаты мыюць танк
Ля Дома афіцэраў.
Стаіць герой атак
На пастаменце шэрым.

Даўно закончан бой,
І танк астыў ад злосці,
Стаў славай гарадской
І часткай прыгажосці.

Дзяўчаты мыюць танк,
Смяюцца без прычыны,
Смяюцца проста так,
Бо сонца за плячыма,

Бо ўжо ў садах балююць
Шпакі,
Бо дзень іскрысты,
Бо танк фатаграфуюць
Замежныя турысты...

А збоку на дзяўчат
У нейкім неспакоі
Глядзіць былы салдат
З апаленай шчакою.

1965

НАШЫМ СЫНАМ

Не гаруйце, хлопцы,
Што нарадзіліся позна,
Што замест рамантыкі —
У вас нуда граматыкі.
Вы яшчэ на подзвігі
Атрымаеце позвы,
І па вас наплачуцца
Сёстры і маткі.

Не журыцеся, хлопцы,
Што нарадзіліся рана,
Вы нарадзіліся
У самы добры час:
Вы бачылі ўчора
На блакітных экранах
Першага пешахода
Завоблачных трас.

А я нарадзіўся
У вялікім Семнаццатым,
Гэты год запомніць
Трэба нам усім:
Рэвалюцыя —
Пачатак касманаўтыкі,
Нашай праўды,
Нашай славы,
Нашых сіл.

Не забудзьце, хлопцы,
Перад стартамі
Ўспомніць наша гора,
Нашы страты.
А заганы нашы,
Страхі і хваробы
Пакідайце
За зямным парогам.

1965

ПРЫ СВЯТЛЕ МАЛАНАК

Вясне так хочацца прысесці
На сакавітую траву:
Каштанаў факельнае шэсце
Ёй закружыла галаву.

Ды толькі часу не хапае.
Вунь вецер з дрэў сагнаў шпакоў,
Лімоннай пенай закіпае
Сівая хмара з двух бакоў.

Пракаціўся атамны грукат,
Асляпіў нас касмічным бляскам,
І крывыя нажы маланак
Распаролі мяхі дажджу.

З вясной мы ў ліўневым палоне,
Ў чужым пад'ездзе я стаю.
Прыкрыў манашаскай балонняй
Тут хлопец дзеўчыну сваю.

Пакуль гарачы лівень шастаў,
Для гэтых я не існаваў.
Я каля іх на ўскрайку шчасця
З трывожнай думкаю стаяў.

Свет для іх тварыўся нанова,
Пачалася эпоха цудаў:
Сэрцы прагнулі сініх маланак,
Вусны сохлі ад спелай смагі.

А мне ўсё мроіўся той выбух,
Што ў кінафільме бачыў я.
А мне было тужліва, нібы
Згарала маладосць мая.

Гатоў ізноў ісці на мукі,
І замярзаць, і галадаць,
Каб нашым дзецям і ўнукам
Не бомбы ў спадчыну аддаць.

А Радзіму, ды чыстыя ліўні,
Ды зялёнае сонца лесу,
Ды блакітнае сонца мора,
Ды янтарнае сонца жыта.

1965

КАВУНЫ

Расказ салдата

Не частуйце мяне кавунамі:
Разлюбіў іх навек на вайне...
Немцы пёрлі на танках за намі,
Лупцавалі па мокрай спіне.

Мы тады абарону трымалі
Пад Херсонам
На душнай бахчы.
Да апошніх гранат ваявалі,
Не было нам каму памагчы.

Мы з салдацкай адвагай суровай
Паміралі,
Ачуньвалі зноў.
Прыхіналі свае галовы
Да халодных тугіх кавуноў.

І бясконцае пекла...
А потым
Тупацелі нямецкія боты.
Гарлапанілі гады над намі.
Абжыраліся кавунамі.

Гучна чмякалі, аж пацелі.
А пасля,
Пасля для пацехі
Кавуны ўзнімалі пудовыя
Разбівалі аб нашы галовы.

Разляталася ў пырскі мякаць.
Катастрофа.
Гібель планет.
Пачыналі мы кроўю плакаць,
Адыходзячы на той свет...

Двух нас выжыла з гэтай бойні.
З той пары сню нядобрыя сны.
Ненавіджу фашыстаў
І войны
І, прабачце мяне,
Кавуны.

1965

У ГАСЦЯХ

Дажджавое памяло
Жоўтых лісцяў намяло.
Я іду па шумным лісці
У знаёмае сяло.

Пахне восень бульбаю,
Кмінам і цыбуляю,
Перагрэтай лебядой,
Мутнаватаю вадой.

Сёння лазня паліцца,
Буду доўга парыцца...

У сяброў былых замашкі —
Дома сэрца выбаліць.
«Кум, падкінь у печ паўражкі,
Каб нуду ўсю выпарыць».

Тут у парнасці імглістай
Дыскусійны тарарам:
Трэба меней футбалістам,
Трэба болей пастухам.

Што за ўсё смачней таранкі,
Ды яны у космасе...
Потым хвошчамся старанна
З прадзедаўскай коснасцю.

Толькі гэта ўсё прадмова,
Уверцюра шэрая
Перад дзіўнай, адмысловай
Святочнай вячэраю.

Тут і з чаркай і без п'янкі
Гаспадыніна краса —
Халадзец і вантрабянка,
Паляндвіца, каўбаса,

Агуркі крамяныя,
Шлапакі румяныя.
Паглядзіш на рыжыкі —
Аж у сэрцы дрыжыкі.

Слава людзям,
Слава полю,
Аддаю усю хвалу
Беларускаму застоллю,
Беларускаму сталу!

Дай жа бог табе, радня,
Залатога працадня.

Некалі надарыцца,
Зноў прыйду папарыцца.

1965

ЖЫЦЦЁ МАЁ...

Жыццё маё, ты — як цягнік бясконцы:
Святло і цень,
То змрок, то светласць рос.
І людзі з-за мільгаючых аконцаў
Не бачаць ні пакут маіх, ні слёз.
Я добра знаю ныцікаў мізэрнасць,
Не страчу моцнай веры
Ад няўдач...
І тапаліны пах, і шорах зерня,
І над труною горкі матчын плач,
І выкрык развітальны паравоза,
І галасы з касмічных караблёў,
І смех дзяцей,
І ворагаў пагрозы,—
Жыццё сваё навек я з вамі сплёў.
Мой белы свет,
Мой свет цяжкі ды мілы,
Я ведаю, як трэба шмат рабіць,
Каб нам было бліжэй, чым да магілы,
Да шчасця і да сонечных арбіт.
Таму крывінкай кожнай ненавіджу
Я раўнадушных,
Чэрствых,
Прагных,
Хіжых,
Якія, каб паболей адхапіць,
Гатовы праўду Леніна забіць.
Гаворыце, што выйшлі вы з народа?
Куды? Чаму?
Якой цяпер пароды?
Я са свайго народа не выходзіў
І жыць да скону буду у народзе.
Мне сорамна народ агітаваць,
Каб людзі больш і больш штодня рабілі,
Мясілі гліну, валуны драбілі:
Ён ведае і сам, як працаваць...
Жыццё маё, ты столькі мела стратаў,
Што на паўстанку ціхім не сысці.
Я перад вамі вечна вінаваты,
Усе, каму нялёгка у жыцці:
Перад калекамі —

За ўсе іх пакуты,
Перад сінімі рэкамі —
За патокі атруты,
Перад птушкамі —
За браканьераў,
Перад памяццю мужных —
За чыёсьці нявер'е,
Перад старымі —
За кніжак убогасць,
Перад маладымі —
За хлусню дэмагогаў.
І я кажу трывожнаму юнацтву:
Жыві і вер, няхай цябе вядзе
Чырвоны сцяг,
Што вылецеў у Семнаццатым
З сэрцаў найсумленнейшых людзей.

1965

* *

Адплывае белы цеплаход
За абруч блакітны небакраю,
На прасторы хваляў і прыгод.
Я гляджу услед...
І забываю.

Бо на той на палубе няма
Ні сяброў,
Ні нечых мілых ножак.
Хай там будзе сонца ці туман,
Цеплаход мяне больш не трывожыць.

Так і цуды нейкіх авеню
І сады ружовыя Сарэнта
Ў памяці падчас пераганю,
Быццам бы старую кіналенту.

А было:
Старэнькі грузавік,
Абшарпаны і заліты граззю,
На якім мой сябра-франтавік
Ад'язджаў,—
Навек мяне уразіў.

1965

СУСЕДКА

Кавалачак скарынкі
Засунеш за шчаку,
З суседчынай дзяўчынкай
Імчышся на раку.

Пад вейкамі — азерцы,
Пачатак першых мук.
І коле рэўнасць сэрца:
«А дзе Янук?»

Луг свеціцца ад зорак —
Вясёлая раса.
Вымай хутчэй сцізорык,
Вудзільна выразай.

Тут акуні і плоткі
І ціхая лаза.
Аеру сок салодкі
На халадку ляза.

І хочацца дзяўчынцы
На памяць падарыць
Расінку на травінцы,
Агарачак зары...

Пяць год рыпелі весніцы,
А сэрцу ўсё цяжэй...
Хадзі ка мне, равесніца,
Бліжэй, бліжэй...

І што са мною сталася!
Ад гэтых вачанят
Мне і цяпер, у сталасці,
Ніяк не ачуняць.

Усё баліць, не гоіцца
Той самы першы боль,
І успаміны гоняцца
Усюды за табой.

І ўсё наскрозь прасвечана
Да дна, да дна.
І ўсім жыццё засведчана,
Што ты была адна.

Хоць зноў бяжы да веснічкаў
Шапчы: «Адтай, адтай!
І шчасця хоць давесачак
Аддай, аддай...»

1965

ДРУКАРАМ

Люблю я друкароў,
Люблю лінатыпістак,
Ратацый грозны роў
З трывожным, тонкім свістам.

І свежай фарбы пах,
Што ўперамешку з газай.
Тут навіна, як птах,
Ляціць у друк адразу.

У друкароў запас
Навін на ўсе гучанні:
Часамі цешаць нас,
Часамі засмучаюць.

І ведалі яны
Куды раней за бога,
Калі канец вайны
Пратрубіць перамога.

Я з вамі фронт прайшоў,
Жыў у зямлянках душных,
Я рад, што вас знайшоў,
Такіх адданых, мужных.

Хацеў вам пажадаць
Хвіліны той сардэчна,
Каб вы змаглі набраць,
Што мір заключан вечны.

Ды чую: «Не пылі!»
Дык набярыце заўтра,
Што нашы адплылі
На Месяц касманаўты...

Калі ж вам прынясуць
Радок аб маёй смерці,—
Не стаўце ў паласу,
Хаць пару дзён не верце.

1965

ПАСЛЯ ВАНДРОВАК

Чаканне радасней здзяйснення:
І ў свята часам нудзімся.
Шуканні і перасяленні,
Мы ў вашым рытме круцімся...

Жыві, працуй,
А там, глядзіш,
Мясцком дасць атэстацыю —
І ты да караблёў ляціш,
Мінаючы ўсе станцыі.

Бадзяешся, цікавішся
І праўдаю, і казкамі...
Музеі ватыканскія,
Халупы афрыканскія.

Падзівішся на Нотр-Дам
І Луўрам ты насыцішся.
А лепш, калі з людзьмі і там
На добрым слове сыдзешся.

Адразу робіцца прасцей
Зямля з птушыным гоманам.
Пшаніца добрая расце
Пад Рымам, як пад Гомелем.

Сустрэнеш каля нільскіх вод
Бусла свайго палескага
І вернешся на цеплаход,
Усцешаны паездкаю...

Пабачыў: плаваюць кіты,
Сустрэўся з насарогамі.
А людзі ўсюды, як і ты,
З турботамі, трывогамі...

На моры гул і неспакой,
За хваляй хваля коціцца.
Убачыць родны бераг свой
Табе да болю хочацца...

Сысці на станцыі малой,
Дзе гай ды неба ціхае,
Дзе пахне сонцам і смалой
Ды птушаняты ціўкаюць,

Дзе глушыць колаў перастук
Паленіка сарочая,
Дзе мальвы свецяць на вярсту
З лахматых агародчыкаў.

Чмялі над кветкамі басяць,
Гудуць над сапяжанкаю.
— Ну што, нагойсаўся, басяк,
Спаткаўся з парыжанкамі?

Праўленне.
Тэлефон звініць,
Удакладняе графікі.
— Адкуль?
І хочацца зманіць,
Ды буркнеш ціха:
— З Афрыкі...

Круглеюць вочы друга...
— Што ж,
А мне дык хоць бы выспацца...
Кароткатэрміновы дождж
На пыл дарожны сыплецца.

1965

* *

На Палессі восень...
Гусі белыя
Выскублі мядовую траву.
І вятры, ад сцюжы ашалелыя,
То журботна свішчуць,
То равуць.

Смех і кветкі,
Вы куды падзеліся?
Навакол
Стагі, стагі, стагі.
Чым жа ты цяпер са мной падзелішся,
Прыпяць, пачарнелая з тугі?

Ліст пажоўклы да плашча прыколеш?
Ці на момант вернеш мне ізноў
Каснічок зары,
Світальны колер
Тапалёў, буслоў і тумаиоў?

А сама замкнешся ў лядоўні,
Лета у стагі паклаўшы спаць...
Будуць коні сніць лугі мядовыя
І, як людзі, цяжка уздыхаць.

1965

ПАХАВАННЕ

Здыміце шапкі:
Вязуць нябожчыка.
Мажліва, грузчыка,
Мажліва, возчыка.

Вязуць не нейкага,
Вязуць сумленнага:
Сябры — як непагадзь,
Жонка — самлелая.

А за нябожчыкам —
Шыпенне шын,
Жалобным пошчакам
Гудкі машын.

На бруку слотным
Разгон гасі:
Не меней сотні
Таксі, таксі...

Прасілі людзі —
Ехаў праз ноч.
Таксісту ў грудзі
Ўсадзілі нож.

Таксісту выбілі
З вачніцаў сонца.
Бандыты выпілі
На тры чырвонцы...

А шофер, можа,
Калісь малых
Вёз асцярожна
З радзілкі іх.

Што ім, грамілам,
Наш добры век!
Памёр карміцель
І чалавек.

Няма запчастак
Для нас, мой друг...
Лісток зубчасты
Ляціць на брук.

1965

* *

Мітынгі вялікай рэвалюцыі —
Боль адзін,
І стогн адзін,
І гнеў адзін.
Сходы для будзённай рэзалюцыі —
Шум адзін,
І сум адзін,
І сон адзін.

Словы праўды,
Нас вы ратавалі
У часіны грозных небяспек.
Словы фальшы,
Вас па рытуалу
Мямліць раўнадушны чалавек.

А хацеў бы я збіраць натоўпы
Дружных, але стомленых людзей
Толькі
Для вялікай справы,
Толькі
Ў тыя дні, калі набат гудзе.

1965

КАНДРАТУ КРАПІВЕ

Цябе вітаем мы па-брацку:
Расці вышэй, ідзі далей!
І толькі племя гарлахвацкіх
Твой не адзначыць юбілей.
А ты і рад: іх біў нямала,
І будзеш біць нястомна, каб
На белым свеце меней стала
Махальнікаў, аслоў і жаб.
Віншуючы з пачэснай датай
Цябе і чытачоў тваіх,
Гатоў даць «Вожык» кандыдатаў
Для новых п'ес, для новых кніг.
Народ з тваім здружыўся смехам
І праўду палюбіў тваю
І сёння ў гонар твой над снегам —
Усюды жаўранкі пяюць.

1956

* *

На сходах часта ў звон мы гучна б'ём
І, абалдзеўшы ў пустаслоўі тлумным,
«Давайце вып'ем, — розум не прап'ём,
Бо ў нас яго няма»,— жартуем сумна.

Прывыклі ўсе мы да прамоў грымотных,
Да спіскаў памінальных, тэмаў модных.
Зрабілася ўжо звычкай неўпрыкметкі
Усё ўзгадняць і прад'яўляць даведкі.

Каб разжаваць пытанняў важных соль,
Да старшыні у кабінет нас клічуць.
«Трэ узгадніць!» — і пальцам тыц у столь.
А там, на версе, столь падлогай лічуць...

Цікава там! Ды што ты ні кажы,
Сягоння я за іншае ў трывозе...
Грабуць зямлю зубастыя каўшы
Аднолькава на Свіслачы і Волзе.

Аднолькавы убогі пах катлет
У душных падарожніцкіх харчэўнях...
Я сам штодзень кіплю ў жыцця катле,
Навошта мне набег? Я не качэўнік.

Я не хачу за модаю ляцець,
І так іх шмат лаўцоў кар'ер і моды.
Не балбатаць — за працаю святлець,
Не узгадняць, а жыць жыццём народа.

І хто мяне за тое папракне,
Што слова я пакутліва шукаю,
Каб расказаць аб роднай старане
І пра цябе, любоў мая цяжкая.

1956

* *

Звязаць бы ўсіх, хто прагне новай бойні,
І выселіць і як мага далей.
Вось выспа вам, кароў тут сотні дойных,
Вось луг і плуг і семя на алей.

Арыце самі, сейце і гатуйце,
Гуляйце у парламент і бейсбол,
Хлусіце колькі ўлезе, агітуйце
За лад свой і парадак, за разбой.

Вырэзвайце дубовыя дубіны,
Атручавайце стрэлы сокам змей,
Сабе збівайце самі дамавіны...
Нядрэнны план для мірных асамблей!

О, як заверашчалі б дыпламаты
І сталі б ад нянавісці дрыжаць...
Яны майстры жаваць з усмешкай вату,
Затым зарэзаць праўду без нажа.

Яны майстры усё і ўсіх заблытаць,
Яны майстры палохаць і хлусіць.
Ды выбіты цяпер яны з арбіты
Маланкамі, якіх не пагасіць.

Мы для планеты толькі міру хочам,
Хоць голас наш яшчэ не перамог,
Забегалі юрлівыя іх вочы,
Манішкі прапацелі ад трывог.

Паслоў наглянцаваных бура трэсла.
Ёй не сціхаць. І знае кожны з нас,
Што некаторым з іх у гэтых крэслах
Даводзіцца сядзець апошні раз.

1960

ГАЛОЎНАЕ СЛОВА

Мы ходзім пад прыцэлам
Амерыканскіх ракет,
Амерыканцы ходзяць
Пад прыцэлам нашых ракет —
І гэта называецца —
Пасляваенны свет.

У Пентагоне
Сядзіць вар'ят на вар'яце.
І гэта называецца —
Мір у палепшаным варыянце.

Буду радавацца турбінам,
Футбольнаму голу
І тарфяному брыкету,
Буду славіць касмічныя палёты,
Фестывалі і форумы,
Дружбу паміж людзьмі,
Але пакуль чалавецтва
Ходзіць пад нацэленымі ракетамі,
Першае слова,
Якому трэба вучыць
Дзяцей і прэзідэнтаў,—
МІР!

1963

* *

З тэлемачты ліпы насміхаліся:
«Голая канструкцыя.
Сухар.
Ты абстрактнасць.
Ты не закахаешся
Ні ў Юпітэр, і ў чырвоны Марс».

А яна работніцай жыла:
Пра Еўропу, Афрыку ды Азію
Столькі перадач перадала,
Што сама зраднілася з фантазіяй.

«Ах, як сёння лектар нудна роў,
Высушыў мяне сухімі фактамі...»
Запаліла васемнаццаць ліхтароў
І зрабілася маленькаю галактыкай.

Рада навагодняму сняжку,
Зорная, заіненая холадам,
Узнялася ў серабрыстым кажушку
Ёлкаю касмічнаю над горадам.

1963

САЛОДКАЯ ЛЯЧЭБНІЦА

Як толькі за Оршай
Направа павернеш —
Прыедзеш у вёску
Пад назвай Цукерня.

Бабулі ласкавыя
Добра там лечаць
Дзяцей, што цукеркамі
Зубы калечаць.

Тут мыюцца толькі
Салодкай вадою,
І весела ўсім
За салодкай ядою.

З вішнёвым варэннем
Тут варыць ірыскі,
Густы мармелад
Наліваюць у міскі.

На сонечным мёдзе
Піражныя смажаць.
Гузы, сінякі
Тут марожаным мажуць.

З лугоў навакольных
Злятаюцца пчолы
І робяць ласунчыкам
Дзесяць уколаў...

Ды хутка ўсе дзеці
Пытаюць трывожна:
— Ізноўку цукеркі?
— Не хочам піражных!

Ні хлеба, ні мяса,
Ні кроплі гарчыцы.
Як цяжка лячыцца —
Цяжэй, чым вучыцца.

І плачуць, і просяць
Ласкавых бабулек:
— Ах, дайце, бабулі,
Хутчэй нам цыбулі!

Нам хочацца хлеба,
І супу, і кашы:
Прайшла ўжо хвароба
Салодкая наша.

1967

* *

Ламае час былыя звычкі,
Да наслаенняў я прывык:
Асліны голас электрычкі,
І старажытны маладзік,

І аўтаматыкі шарады,
І хітрай хіміі гушчар,
І чарнаморскія шаланды,
І лісця восеньскага жар,

Будзённы космас,
І Будзённы
Яшчэ ўсё скача на кані,
І чалавека воблік цёмны,
Што знік у атамным агні.

І два зубры, што з пушчы збеглі,
Убачыўшы счарнелы снег,—
Усё на сэрца цяжка легла,
Перамяшала страх і смех.

Тыпова, чорт вазьмі, тыпічна:
Тэлеантэны над вярбой,
Выпрабаванні стратэгічных
Ракет
І ракавы разбой.

Як мнагалюдна на планеце!
Больш тых, хто з голаду век пух,
Дакуль гібець, дакуль калець ім
У свеце здзірцаў і хапуг?

Хоць не парожняя дзяжа ў нас,
І добры хлеб наш не гарчыць,
І Ленін мудрую дзяржаўнасць
Нам даў, што трэба берагчы,

Ды часам думаеш да стомы:
Што нам нясе шалёпы век?
А хто такія мы?
А што мы?
Якім ты станеш, чалавек?

Ад колькіх ісцін адрачыся
І адцурацца хіб якіх,
Каб жыць прасцей, а не ўрачысцей,
Ды і чысцей на ўсе вякі?

А восень сыпле горкім лісцем,
І вечнасць свішча у трысці.
Як цяжка ўсім да простых ісцін
Праз лес хлусні старой дайсці.

1969

РАЎНАПРАЎЕ ДРЭЎ

Пара падумаць пра раўнапраўе дрэў.
Даволі падглядваць,
Як горнецца тонкая рабіна
Да самаўпэўненага дуба.
Не кляніцеся ў каханні
Да белай бярозы:
Вы даўно ёй здрадзілі,
Нож у белыя грудзі ўсадзілі,
Каб толькі напіцца
Яе свежай вясновай крыві.
І гэтага вам было мала.
Вы перарэзалі ёй сухажылле,
Кінулі ў прагную печ,
Каб яе апошнім гарачым дыханнем
Пагрэць свой стары раматус...
І так, я пра раўнапраўе дрэў!
Слава табе, вольха!
Ты самая мужная і адданая
Захавальніца нашых рэчак
І заступніца сарамлівых дзяўчат.
Асіна, мая асінка!
Я больш не дазволю нікому
Удавіцца на тваім суку —
Няхай разбіваецца
На раўнадушнай машыне.
А тваё ласкавае лісце
З ціхім журчаннем
Будзе пераліваццца
У горлы птушак...
Хвала і вам,
Цярплівыя таполі!
Хай рукі адсохнуць у тых,
Хто бязлітасна вас высякае.
Ім боязна пуху твайго лебядзінага,
Ім боязна паху твайго салаўінага,
Яны баяцца тваёй красы.
Ім падабаюцца
Толькі слупы
На пустых бальшаках
Ды часам кактусы.

1969

МАЕ НАСТАЎНІКІ

З пажоўклых пергаментаў,
З прапыленых фаліянтаў,
З усіх шчылін мінулых стагоддзяў
Вылазяць галовы
Мудрых разбойнікаў,
Кволых філосафаў,
Фанатыкаў і прарокаў,
І кожны
Дагматычным пальцам
Тыкае ў маё набалелае сэрца:
Я твой настаўнік.

Каб я паслухаў адных —
Мне патрэбна было б знішчыць
Палову чалавецтва.
Каб я паслухаў іншых —
Знішчыў бы другую палову.
І на кожнай вярсце
Нечуванай адлегласці
(ад каменных дзідаў
да атамных шахтаў)
Пакінулі знакі свае
Прагнасць, злаба, і нянавісць.
Для мяне непрымальна
Ніводная форма прыгнечання,
І я ненавіджу
Чырвонае вока вайны.
Мне хочацца бачыць зямлю
З'яднанаю працай і дружбай,
Любоўю і сонцам,
І песняй «З Інтэрнацыяналам...».
Таму я і выбраў
Сабе у настаўнікі
Леніна,
Праўду
І родны народ:
Ім толькі і можна даверыць
Зямлю,
Рэвалюцыю
І дзяцей.

1970

ВУХНАЛІ

Зноўку тупаць давядзецца,
Падышла, відаць, пара,
Ад дзіцячага вядзерца
Да дзявочага вядра.
    Там я трохі прыпынюся.
    Не зганю хоць смагі той,
    За навуку пакланюся
    Кузні чорнай і старой.
Ад світання да абеду
Малаткі у ёй гулі.
З той пары я добра ведаў,
Што такое вухналі.
    І зязюлі там кувалі,
    І на кожнае «ку-ку»
    Кавалі, брат, забівалі
    У падкову па цвіку.
А ў мяне па кожным разе
Сэрца — як шалёнае...
Кавалёва цурка Казя —
Каснікі чырвоныя —
    Ім прыносілааладак,
    Сыраквашы ў гладышы...
    Пахне грэчкаю на лядах,
    Сонца з мёдам на душы.
А далей зязюлі сховы,
Дурнап'ян і буякі.
Тут ні следу, ні падковы,
Аігліца — як цвікі.
    Сустракайся і не кайся:
    Мы ж не злыдні нейкія,
    Што ж ты, Казя, Казя, Казя,
    Гасіш вочы вейкамі?
Пагасіла. Назаўсёды...
Друг, прашу — на двух налі!
То не годы, не паходы —
Колюць сэрца вухналі.

1970

ШЛЁНСКІ ТАНЕЦ

Пер'е на шахцёрскіх чорных шапках,
Полымя шугае з труб аркестра.
Топні ножкай, Зося,
Выгні лапку.
Крутаніся. Так. Зусім не кепска.

Шлёнскі танец, ён такі стракаты,
Горды, звонкі, трошкі цырымонны,
Россыпам рассыпаны дзяўчаты
Горных эдэльвейсаў ці рамонак.

Ён такі фігурны, выгінасты,
Віхравы і раптам аж самлелы.
Стукаюць абцасы часта-часта,
Аж душа, як вугаль, засмылела...

Вунь Бяскіды, а вунь там Судэты.
Пахне сонцам і апалым лісцем.
Як тут слаўна!
Дык чаму ж дагэтуль
Сэрца ные, ные, як калісьці?

Бо адгэтуль у крыві і дыме
Наша з вамі гора пачалося.
Глівіцэ!
Вы чулі гэта імя?
...Там жыве і скача панна Зося.

1971

КРЫШТАЛІЧНЫ ХРЫБЕТ

Не завоблачны, не Каўказскі,
А загнаны пад балаты,
Часам казкай
І зрэдку ласкай
Цешыў нас гэты скарб залаты.

Крышталічны хрыбет палескі —
Перавернутая дуга...
Ціха, ціха цвітуць пралескі,
Над дрыгвою плыве туга.

Не шчымлівы голас жалейкі
Я пачуў, не ласіны роў —
Адгукнулася ў нетрах жалеза,
Чалавечая гордая кроў.

Справу мы пачалі не жартоўную,
Бо народ загадаў: пара!
Ад Карэліч і да Жытоміра
У капальнях агні гарэць.

Там усё таямніча, прывабна.
Прабіваюцца праз туман
І граніт, і мармур, і вапна,
І касмічны метал-тытан...

Тытанічную бітву Айчына
Тут вяла, на зямлі дарагой...
Не заціхне званочак птушыны
Пад зялёнай палескай дугой.

1971

БЕЛАРУСКІЯ ШРЫФТЫ

Мы адступалі з Бранскага паспешна,
Машыны буксавалі у гразі,
І навісала тая непазбежнасць,
Калі ці памірай, ці дрот грызі.

І трэба ж нам было перавярнуцца,
Шрыфты, вярстаткі — у начную гразь.
А ў Мінск за імі нельга нам вярнуцца...
Крычым: «Аб'едзь ці на падмогу злазь».

Няхай шафёры крыюць хрыплым матам,
І цягнецца там хтось да кабуры,
А ты на плашч-палатцы, як зярняткі,
Ўсё да апошняй літары збяры.

Асенні вецер звар'яцела гойсаў,
Пякло душу: «Няўжо не давязём?»
І рускі наш таварыш Віктар Гольцаў
Мачаў далоні ў тлусты чарназём.

Сабралі, і давезлі, і адмылі ўсё
Старанна газай
Для наборных кас,
І ў Беларусь, дзе ўся зямля дымілася,
Газета наша даляцела ў час.

1971

* *

Асеннімі дажджамі заліло
Апошнія чаканні і спатканні,
Пажоўклых клёнаў ціхае святло,
Скупога сонца роснае дыханне.

І пачала зямля крыху цвярдзець,
То сцюжа — пераможца ў паядынку
Раскідвае зары світальнай медзь
У лужынах барвовыя ільдзінкі.

А потым навалілася на дол
Вялікая і белая бясконцасць.
І заблудзіўся кожны мінскі дом
У пошуках растрачанага сонца.

А твар зямлі заснежанай не мёртвы:
Ён зменлівы, як пошум баравы.
Там, у барах, аж да вясны ў сумётах
Схавалі свае трубы жураўы.

Яны іх знойдуць і яшчэ зайграюць,
Склікаючы дзяцей, ліству, блакіт.
І па ўсім краі аж да небакраю
Маланкамі набухнуць аблакі.

1971

* *

Ілюзіі, ілюзіі...
Як густа вы наслоены!
Травы не бачу ў лузе я,
Хаджу занепакоены.

Сады. Сланечнік з макам.
Кругом асабнякі.
Не сенам — пухам мяккім
Набіты сеннікі.

Мяшчанства атлусцелае
І тук, і сок тут чэрпае.
І думаю дзень цэлы я
Пра гэта племя чэрствае.

Пра іх няпраўды вечныя,
Што праўдай прытвараюцца.
Тут справы чалавечыя
У смех ператвараюцца.

Тут баязліўцы хцівыя
Глядзяць на нас героямі.
Халтуршчыкі пачцівыя
Сігнуць уверх настроены.

Ці не зашмат
Надзьмутага,
Бязлітаснага,
Прагнага?
Уласнасць каламутная
Засмокча многіх багнаю.

Я ім не прапаноўваю
Нішчымныя пайкі...
Каб жыў народ па-новаму,
На смерць ішлі палкі.

Мае гады — не лёгкі пух,
Даўно юнацтва страчана...
А ўсё было: і луг, і друг,
І галасы дзіцячыя.

1971

ІХ ВЕЧНЫЯ АГНІ

Да болю можа кожны прыцярпецца
І да няшчасця, толькі не яны,
Што страцілі дзяцей...
Гарыць для іх цяпельца
На тым далёкім беразе вайны.

Ці зойдзе сонца, ці на дзень займецца,
Адны сярод вялікай цішыні
Старыя маці ў печах старасвецкіх
Штодзённа паляць вечныя агні.

У печах, быццам небасхіл, паўкруглых
Зара ўсё разгараецца ярчэй.
А за акном — свет цёмны і аглухлы,
А пры агні суцішней і лягчэй.

І бульбу абяруць, і ўсё згатуюць.
Пасля сядзяць, пакуль не грукне дзень.
Апроч дзіцячых галасоў, не чуюць
Нічога...
Толькі полымя гудзе.

Уюцца каснікі агню і скачуць.
І твары узнікаюць з небыцця.
Цалуюць іх кабеты, ціха плачуць
І не клянуць самотнага жыцця.

1972

* *

І мяне хвароба тузанула,
Ведзьме рыхтавала на пасаг.
Адыдзі — дабром прашу — зануда,
Дай мне пра здаровых напісаць.

Бо пакуль шукаў я слоў глыбінных,
Каб душой не пакрывіць ні ў чым,
Пачарнелі ўсе мае рабіны,
Зледзянеў ядловец уначы.

Не жадаю ў буркатні пагразнуць!
Скардзіцца не ўмею, не хачу.
І не стану прытварацца бла́знам,
З маладымі ціха памаўчу...

Маладосць, не хочаш — не вяртайся:
Мне не сорам жыць і з сівізной.
Толькі зрэдку ты са мной вітайся,
Не пад Новы год і не вясной.

Прывітайся ты са мною ўвосень,
Калі дождж так цяжка б'е ў душу,
Можа, не ўпаду я на пракосе,
Можа, луг апошні дакашу.

1972

* *

У «Спідале» равела.
Рыкала і раўло.
Хацелася Равеля
Паслухаць «Балеро».

Прыглушаны, аднекуль
Прытупаў ён здалёк,
Чыгунны поступ веку,
Жыцця вярблюджы крок.

І не заглушаць бітлы
Іспанскі той напеў:
У ім зародак бітвы
І нераскуты гнеў,

Бясконцыя прасторы
І вечны, вечны рух,
Далёкі голас гора,
І сіла дужых рук,

І гордае каханне,
Агонь і маразы,
Пустыні калыханне,
А ў далях — міражы.

Нідзе няма прывалу,
А бубны б'юць: «Хутчэй!»
І небасхілу мала,
І сонца ўсё ярчэй.

1972

ВОПЫТ

Пярун пяражагнаў
Зялёнай бліскавіцай
І чорную жаўну,
І чорную крыніцу.

Пакуль шукала шлях
Аслепленае вока,
Я зразумеў: не страх
Прыйшоў ка мне, а вопыт.

Жагнала нас вайна
Нянавісцю і гневам.
З в'етнамскіх рэк яна
Не раз яшчэ махне вам.

Узводзіць цяжка мост,
А на звышбомбу — попыт.
І можа згінуць мозг
І чалавечы вопыт.

Усё запамінай...
І што спявае Сопат,
Ты слухай, выбірай,
Але не гэта вопыт.

Ты працаю трывож
І дружбаю сумленне
І вопыт рук памнож
На розум і натхненне.

1972

ГРЫФЕЛЬНЫЯ ДОШКІ

Мы іх насілі ў торбачках белых
Разам з антонаўкамі і гарохам.
Навука грыфелем ціха скрыпела
І рыхтавала нас у дарогу.

Пісалі словы, пісалі лічбы,
Сціралі з дошак, але не з сэрцаў.
І мы ўжо зналі, якім Ільіч быў,
Што з намі будзе ён аж да смерці.

Ад гэтых дошак няма і следу...
Не, след застаўся, глыбокі, вечны,
І слова «Ленін» ляціць над светам.
І герб савецкі — пад Шляхам Млечным.

1972

НЕСПАКОЙ

1

Вечная незадаволенасць —
У сэрцы балючым рэхам.
А можа, гэта няздольнасць
Угнацца за ярасным векам?

А можа, лепей, чым гнацца
За простай і яснай ісцінай,
Цішком над гатовым згінацца
Ці слацца апалым лісцем?

Толькі не гэта, не гэта.
Не здолею — кропка. Труна.
Іншыя будуць паэты
Сэрцы людскія кранаць...

Я ганаруся партыяй,
Ды мала цяпер прысяг.
Чаго, пытаюся, варты я,
На якой вышыні мой сцяг?

2

Эпоха на аркане
Трымае моцна нас.
Навошта нараканні
На звар'яцелы час,

Што забіваюць хуткасці,
Што забівае тэмп?
Мы на ўспаміны хукаем,
На свежасць першых тэм.

А мо не забіваюць —
Адсталых з ног збіваюць?
А можа, хуткасць грозная —
Выратаванне розуму?

Ратунак ад галечы,
Цяжкіх блакадных зім...
Калі ж ты, сонца, ў глечык
Нацэдзіш мёду ўсім?

1972

* *

Прырода на дзіва праўдзіва —
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет нас яна нарадзіла,
А мы забіваем яе.

То шротам, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом...
Планету мы так прапалолі:
Патомкі заплацяць жыццём.

Альбо выпрамляем машынай
Рачулкі, што любяць пятляць.
І сохне цяністы ляшчыннік,
І мяккія сцежкі пыляць.

Прырода на дзіва праўдзіва...
І толькі скрані валуны —
Калоссе зашэпча пра дзіва,
Пачнуць хваляваццa ільны.

І толькі збяры ўсё каменне
З тваёй неўрадлівай зямлі —
І сам ты замрэш у здзіўленні:
Як дзякуюць шчодра палі!

Накормяць цябе і напояць,
Бо ты нарабіўся за трох...
Пясчанае роднае поле
І крушні ля белых дарог.

Цяжкое ліпнёвае голле
Пад пылам схілілася ніц.
З трывогай сачу за Бягомлем:
Ідуць табуны навальніц.

1972

НАША ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Петрусю Броўку

Не, такога яшчэ мы не ведалі!
Гэта свята без пышных прамоў:
Беларуская энцыклапедыя,
Радасць першых вішнёвых тамоў.

Тут усё: наша праца, гісторыя,
Геральдычныя знакі вякоў,
І Сафія, і замак Баторыя,
І бяссмерце бальшавікоў.

Тут уборы, і песні, і рэкі,
Краявіды і цені зуброў;
Абеліскі, якія навекі
Здабылі нам мільёны сяброў.

Мы далёкія ад убоства:
Знойдзе кожны ў нядробных радках
Партызанскую маці
І бой свой
Ці героя свайго земляка.

Знойдзе кожны свой горад, ці вуліцу,
Ці станок,
Ці метал,
Ці матор.
Беларуская,
Ды не вузкая:
Любім мы ўсёй радзімы прастор.

А калі там што-небудзь прапушчана:
Мала песень, азёр, навальніц —
Прыязджайце да нашых пушчаў
І напіцеся з першакрыніц.

1972

Я АБ ДЗЕЦЯХ, АБ ДЗЕЦЯХ...

Сонца маё,
Сосны мае,
Людзі мае,
Дазвольце хоць раз зажурыцца.
У чабор твой, радзіма,
Хачу я
Прытомленым тварам зарыцца.

Разбягаюцца рэкі мае
На захад, на поўнач, на поўдзень.
Разлятаюцца дзеці мае —
Хутка іхняга ценю не знойдзеш.

Я трымаюся цудам
Між зямлёю цяжкою і небам,
Між травой і жарствой,
Паміж ноччу і днём.
На рабочай зямлі
Аж да скону
Хацелася б мне быць
І гарэць для людзей
Хоць малым,
Але толькі агнём.

Хлебаробы, ліцейшчыкі,
Творцы машын вылічальных,
Вам — адданасць мая,
І любоў,
І маё велічанне.
Соль зямлі
І святло вы,
Сумленнасць
Найбольшая ў свеце:
Толькі вы захавайце
Праўду,
І пушчы,
І рэкі,
І святыя сцягі...
Я аб дзецях, аб дзецях, аб дзецях —
Хай жа ваша дарога
Ім роднаю будзе навекі.

І пляваць мне,
Што сквапны хітрун
Нешта подлае выбрыкне
Ці які кар'ерыст
З плеткарамі за пляшкай заседзіцца.
А аб дзецях, аб дзецях...
А што, калі выбухне,
Над жывою зямлёю
Пякельнае сонца засвеціцца
І навекі пагасне?

1972

* *

Паўвека... Гэта шмат — паўвека.
Сплылі, змялелі сотні рэк.
І ўжо адно тваё павека
Нібы закрылася навек.

Ты аднавокі, аднаногі
І аднарукі, небарак;
І задуменныя дарогі
Чакаюць іншых у барах...

Пляткарце, мілыя, пляткарце,
Што нехта ў крук мяне сагнуў.
А я улёгся на плацкарце
І правадніцы падміргнуў.

Эх, правадніца, правадніца,
Люблю я твой вандроўны дом.
Хачу з табою парадніцца,
Зрабіцца паўправадніком.

Каб ад паглядаў чалавечых
І загарацца, і гарэць;
І хоць далёка, хоць пад вечар,
Што не сустрэў яшчэ, сустрэць.

Каб на людскім дарожным сходзе
Патрэбным гэтым людзям быць
І ведаць, дзе каму сыходзіць,
Якія станцыі любіць.

І каб на той, на канчатковай,
І не пазней, і не раней
Сысці не ў табар Канчаковы,
А ў свет бяроз, што ўсіх радней.

1972

* *

З працы пачынаецца Купала,
З песні, што яднала ўсіх людзей;
З казак, дзе крыві і слёз хапала,
З калыханкі, сонца і надзей.

З болю пачынаецца, з пратэсту,
З прыгавору гнеўнага панам...
І прыйшлі мы з ім у свет братэрства,
І дарог не трэба іншых нам.

1972

ВЫСПА «БЕЛАРУСЬ»

На выспе «Беларусь» вы елі шашлыкі?
Браты нам гэту выспу падарылі,
На сушы смачным пловам замарылі —
І вось мы пасярэдзіне ракі.

А тут яшчэ прывязаны баран:
Запас бяды не чыніць у імя братэрства.
Ды грымнуў бубен, бухнуў барабан,
Карнаі затрубілі па-майстэрску.

Цудоўная ханум чарговы плоў варыла,
А побач уздыхаў мясцовы вадзяны.
Амудар'я жаўцела і вірыла,
Каб даказаць, што не падобна да Дзвіны.

Пасля квяцістых тостаў і забойнай ежы
(Нас гнаў няспынна тамада узбекскі)
Пры спёцы не палескай,—
каракумскай, рэзкай
Скакалі мы са спрытнасцю мядзведжай.

Ну хоць бы што на выспе прарасло!
Як добра сеяць прыязні насенне.
А потым нас аднолькава трасло
Ташкенцкае землетрасенне.

1972

МАЛАДЗЕЙШЫМ

Вы мне нічым не абавязаны,
Жадаю гучнай вам вядомасці.
Але было ўсё ж нешта сказана:
Яно у вашай падсвядомасці.

Я вас не няньчыў і не песціў,
Ды нечы шлях крыху прадбачыў.
А лепшыя складзеце песні —
Не пазайздрошчу, не заплачу.

І на кручок пралаз не клюньце,
Бо прададуць (спярша паліжуць).
І на мае парады плюньце,
А болей кніжак, добрых кніжак.

1972

ВЯЗЫНКА

Мелі шмат мы раскіданых гнёздаў,
Дзе ні глянь — курганы, курганы.
Свет застаўся пахмурны і грозны
І пасля найвялікшай вайны.

Толькі Вязынку, хату Купалы
Наш народ захавае навек,
Бо і сёння адгэтуль нямала
Пачынаецца песенных рэк.

1972

* *

Не люблю я слова «пакарыцель»,
Не люблю я слова «уладар»,
Вось зямля зялёная — бярыце
Для жыцця, і працы, і для мар.

Хто ўладарыць, той і ўдарыць раптам —
Па надзеі, па душы жывой.
Пакарэнне пахне трохі рабствам,
Карай, і рабункам, і крывёй.

Пакарыць хацелі нас,
І мукі
Спаленай Хатыні — не забыць.
Для людскога шчасця, для навукі
Хочацца і лётаць, і рабіць.

Сваякі Міклухі, а не Стэнлі,
Мы асвоім шмат і абжывём,
Пракладзём дарогі праз пустэльні,
Гнёзды салаўіныя саўём.

Пакарэнне — гэта не карэнне
Будучых прасветленых эпох.
Для стварэння лепшых пакаленняў
Трэба помніць гора ўсіх дарог.

Акіян і космас вывучайце
З добрым сэрцам,
А яшчэ прашу:
Пакідайце і буслу, і чайцы
Больш вады і неба на душу.

1972

* *

На дзесяць працэнтаў болей,
Чым у мінулым годзе,
Збожжа сабрана ў полі,
Морквы на агародзе.

На дзесяць працэнтаў болей
Здабыта вугалю, нафты,
Пабольшала вучняў у школе,
Прыбавілася касманаўтаў.

На дзесяць працэнтаў болей
Прачытана Буніна, Бёля.
На дзесяць... забіта шайбаў.
На дзесяць... смачнейшы чай быў.

На дзесяць працэнтаў болей
З братамі з'едзена солі...
На дзесяць працэнтаў болей
Надзеі, трывогі і болю.

1972

ТОЛЬКІ ГОЛАС

Неба жураўлінае, журботнае,
Цёмная вільготная зямля.
Птушка ты балотная, адлётная!
Бачылі вы зблізку жураўля?

Можа, добра, што не бачылі намоклага,
Смешнага... Цяжкі птушыны быт...
Толькі неба ды курлыканне нязмоўклае,
Толькі вочы, толькі голас ды блакіт.

1972

* *

Нешта журботнае вецер пяе
У лясах парыжэлых.
Аддам я ўсе перамогі свае
За адно паражэнне.

А ты не хочаш у палон мяне браць,
Не хочаш майго разгрому...
Сцюдзёным агнём
Рабіны гараць,
Ні цішыні,
Ні грому.

1972

НАПАЎГОЛАСУ...

Галандыя ці Турцыя —
Даруйце прастаку —
Усюды прастытуцыя,
Усюды прастыту...

Жаночая, мужчынская,
Паўзучая змяя,
Бязвусая, маршчыністая,
Нават лесбія...

Аўфвідэрзэйн, Германія!
Круці вінты, карма.
І ў Кілі наркаманія,
І ўсюды наркама...

І ў старамодным Лондане,
Што ад дажджу распух,
Як лоўля рыб падлёдная —
Туманная распу...

Туга людзей прыціснула,
Ідзі і пратэстуй.
А слабака стрыптызная
Захопіць прастыту...

Гэй, хіпі, хіпі, хіпі,
Калматыя пратэсты...
А свет не толькі гібель,
А свет яшчэ братэрства,

А свет яшчэ змаганне
З няпраўдаю, з багамі,
Дык трэба быць з мазгамі
Пад дзікай валаснёй.

1972

* *

Свой лёс мы самі выбіралі
Не на гады, а на вякі.
З усёй Pacii памiралі
За Беларусь бальшавікі.

Я не магу ўявіць без рускіх
Жыцця,
Каб іншы лад ішоў.
Мне б здаўся свет занадта вузкім
Без украінцаў, латышоў.

Без мора Чорнага, без Волгі,
Без Енісея і тайгі:
Там ёсць і нашыя трывогі,
І кроплі нашае тугі.

Там ёсць і нашай працы жмені...
Хачу ад сэрца пажадаць:
Спяшыце, людзі, новай змене
Любоў і дружбу перадаць.

1972

СНЕЖАНЬ

Ад Дзвіны да Прыпяці —
                    бела, бела,
Ад Дняпра да Нёмана —
                    снег і снег.
Свята сінім полазам
                    зранку зарыпела,
Тысячы аўтобусаў
                    пачалі свой бег.

Добры дзень, суседзі!
                    Будзем век сябрамі.
Добры дзень, суседкі!
                    Светлая зіма...
Нас усіх радзіма
                    у сям'ю сабрала,
Нават тых, адважных,
                    каго ўжо няма.

Брацкія імёны
                    злічыць не бяруся:
Кожная рэспубліка —
                    у сваёй красе.
А на абелісках
                    нашай Беларусі,
На суровых помніках
                    знойдзеш іх усе.

Вам паклон сардэчны,
                    воіны-паплечнікі,
З кім зямлю я родную
                    разам бараніў.
Слаўлю службу верную,
Слаўлю дружбу вечную!
Нарадзіў Кастрычнік нас,
                    снежань парадніў.

1972

ПРЫСНІЎСЯ СОН...

Навошта ты прысніўся, Глебка, мне,
Ні то ў зары, ні то ў сцягах чырвоных?
Жылі з табой мы на зямлі чароўнай,
І ты раптоўна знік, нібыта ў сне...
Прамоўца і застольны чараўнік,
У снежанскай маўклівасці ты знік.

І мне зіму страчаць усё цяжэй,
Гадзіннікі ўсе цікаюць цішэй —
Тут не памогуць лекі і замовы.
Відаць, і я памру у час зімовы.
І падыбае мала хто за мною,
За жалкай абалонкаю зямною.

Навошта ім дыбаць, трэ пра жывое дбаць,
І раны ў кожнага свае, і ўсе баляць,
Адным гарэць, а іншым дагараць,
Адным рабіць, астатнім — зарабляць...
І дзе мяжа паміж «было» і «ёсць»,
І дзе ты — гаспадар, а дзе ты — госць?

Успомніце, таварышы-сябры,
Нікога не штурхаў я пад абрыў,
Не мыліў шыю і галоў не брыў,
Ганебныя даносы не кляпаў,
Магілы я нікому не капаў
І з неба вашых зорак не хапаў.

Бываў часамі рэзкі, часам грубы.
Смылелі, як абвугленыя, губы,
Калі я ў некім бачыў подлы фальш,
А чмут віно каўтаў ды налягаў на фарш.
Як шчыра хлусіць, аж пераэкагнецца!
Глядзіш — ізноў уверх махляр праб'ецца.

Калісьці Гоя маляваў ляніўцаў.
Яму я не раўня.
А пра зласліўцаў
І плеткароў не хочацца пісаць:
Ім сняцца грошы, пышната пасад.
Лісьлівыя смаўжы, яны бываюць лютымі,
Задушаць ці апырскаюць атрутаю.

І так да скону муцяць, круцяць-верцяць...
Пра што цяпер ім марыць?
Пра бяссмерце.
Гатовыя на ўсё: шумець высокім клёнам
Ці дубам векавечным і зялёным
Не выйдзе клёнам — выб'юцца травой
Ці помнікам —
Табе, нашчадак мой,
Ківаць пачнуць глінянай галавой.

1972

СЕКУНДА

Галоўны Захавальнік Часу
Падарыў чалавецтву секунду,
Кожнаму з нас па секундзе —
Тры з паловай мільярды секундаў,
Больш як дзевяць гадоў жыцця.

Колькі можна пасеяць зерня
За секунду.
Крылатыя д'яблы
Тоны смерці паспеюць скінуць
На дзяцей.
А грудзі салдата
Чалавецтва прыкрыюць ад смерці
За секунду.
Адну секунду.

Тры з паловай мільярда секундаў
Больш як дзевяць гадоў жыцця,
Як шкада, што многія з нас
Не заўважылі гэтай секунды.

1972

* *

Мне не патрэбны суцяшэнні...
Хоць раз задумайся сама.
Прыйшла. Прынесла спусташэнне
Не як тайфун, а як чума.

Няма ні крыўды, ні адчаю,
Нянавісці і той няма,
І за халоднай шклянкай чаю —
Адна сцюдзёная зіма.

1972

ГОРКАЯ ГОРДАСЦЬ

Каралеўскімі замкамі
Ганарацца,
Саборамі.
Мы — зямлёй партызанскаю,
Перамогай над ворагам.

Нехта хваліцца рознымі
Трыумфальнымі аркамі.
Мы — аршанскімі соснамі,
Магілёўскімі хмаркамі.

Хай наўкол электроніка
І машын табуны,—
Плача тоненькі, тоненькі
Ў сэрцы голас вайны.

Жыта шчодрае косім,
Славім шчасця гады,
А гасцей усё возім
У Хатынь, у Хатынь.

На зямлі нашай светлай
Добра жыць і любіць.
Аб чацвёртым, чацвёртым
Мы не можам забыць.

Наша горкая гордасць
Прасвятлее ў вяках.
Не скрышылі нас орды,
Не адолеў нас страх,

Ні трапічная парнасць,
Ні мароз невыносны...
Каралеўскія пальмы,
Партызанскія сосны.

1973

* *

Калі пачалася вайна для мяне?
У самае першае тое світанне,
Ад бомбы найпершай...
І ўсё як у сне —
Сустрэча з вайной і з табой развітанне.
Нядаўна сады адцвілі,
Па начах
Так пахла наўкол белавежскай сасною.
Я нават хадзіць асцярожней пачаў:
Я быў перапоўнен табой і вясною.

А што, мая родная, мог я зрабіць?
На захад мы ехалі ворага біць
І апынуліся раптам на ўсходзе.
Я слухаў загады,
Я быў у паходзе.
Ні ў чым не вінюся:
Не лашчыла нас
Дарога вайны,
Але гэта не ўцеха...
Пытаўся, шукаў — і ні слыху ў адказ,
Ні следу нідзе, ні далёкага рэха.
Я часта з надзеяй і страхам лавіў
На станцыях
Мільгануўшыя вочы.
Ва ўсіх ён вайною аднолькавы быў —
З трывогай і просьбай, той погляд жаночы.

І ноччу ў зямлянцы прасіў я тайком
Цябе, можа быць, нежывую: прысніся.
Сабе загадаў я:
Салдацкім пайком
І з дзецьмі, і з бежанкай кожнай дзяліся.
І больш не было ўжо сустрэчы з табой,
А толькі з вайною было развітанне...
І кожнай вясною
Не першы свой бой —
Цябе ўспамінаю
І тое світанне.

1972

* *

Цяжкое партызанскае качэўе,
Ад выбухаў у лесе ўсё гуло.
У цёмных ямах, у глухіх карчэўях
Хавалася ад карнікаў сяло.

Там маці маладая з белым скруткам,
З дзіцём, сядзела ў роспачы цяжкой;
Таўкала ў рот яму худую грудку,
Бязбожніца, малілася цішком.

І кожны думаў: выдасць, выдасць крыкам,
Але ні слоўца, ні папроку ўслых.
Маўклівай просьбай, страшнай і вялікай,
Здавалася, гарэлі вочы іх.

Праз дзень ці два не трэба ўжо хавацца,
І так усім хацелася ім жыць.
І на парозе чорнага вар'яцтва
Яна была гатова задушыць...

Прайшлі гады...
Глядзіць на сына з ласкай:
Высокі, дужы, і два ўнукі ёсць;
Расказвае малым, нібыта казку,
Пра партызан, блакаду, маладосць.

Гатуючы сняданкі і абеды,
Перабірае ў памяці гады.
І кожны раз жахаецца кабета:
«А што, калі б?..» — і млее ад жуды.

1972

АГОНЬ

Я столькі бачыў агню,
Я столькі бачыў пажараў,
Што часам пра цішыню
Неяк збянтэжана мару.

Не пра цыбульны загон,
Не пра вішнёвы засценак —
Пра невялікі агонь
І пра вячэрнія цені.

Двое ці трое сяброў,
Шчырасць павольнай размовы,
Вецер з лугоў і бароў,
Сіні дымок сасновы,

Сала скрылёк на ражне,
Рэчка плюскоча пад крушняй,
І дамаўляемся дружна
Не гаварыць аб вайне,

Не дакранацца да ран —
Мы ваявалі чэсна...
Наіўны самападман,
Сам ад сябе не ўцячэш ты.

Толькі агонь шугане,
Толькі мы чаркі напоўнім,
Зноў аб вайне, аб вайне
Абавязкова успомнім.

Усе мы ў баях гартаваліся,
І не забыць нам страт.
Многія не дачакаліся
Ні цішыні, ні кастра.

Годы мае агнявыя!
Памяць навек устрывожана...
З намі сябры франтавыя
Каля агеньчыка кожнага.

1972

КАЗУЛІЧЫ

Многае з мінулага касуючы,
Я да скону ў сэрцы зберагу
Вёску на Бабруйшчыне, Казулічы —
Маладосць маю,
Маю тугу.

Там чытаў я школьнікам Купалу,
Сам пісаў я нешта аб вясне...
Вёска тая
Ў полымі сканала,
Крык апошні
Знік у чорным сне.

Пра пакуты не раскажуць сведкі,
Гэты жах баюся зразумець,
Як зганялі вас, мае суседкі,
Душагубы лютыя на смерць.

Не патрэбна слёз і слоў прачулых...
У якой траншэі мокнуў я,
Як палілі вас,
Матруна Булах,
Гаспадыня добрая мая?

Попел чалавечы доўга стыне,
Адлятае ў хмары маладосць...
На сцяне журботнай у Хатыні
І маіх Казуліч імя ёсць.

1972

ДАТЫ

Што даты? Гэта толькі вехі
Гісторыі.
А для салдат,
Чые навек закрыты вейкі,
Няма ўжо дат, ніякіх дат.

За рысай той — маўкліва, пуста,
І на дарогах крыжавых
Узводзім помнікі і бюсты
Мы не для іх, а для жывых.

І для дзяцей, каб не зблудзілі
У гушчары нікчэмных дат.
Каб памяць песні нарадзіла
Аб неўміручасці салдат.

1973

* *

Мы, людзі,— дзіўныя стварэнні,
Сярод удач, турбот, абраз
Жывём у розных вымярэннях
Адначасова ў розны час.

Ніхто не верне рэк дзіцячых,
Яны даўно ў марах жывуць.
А я штодня іх чую, бачу:
Яны у памяці плывуць.

Святкуе светла перамогу
Мой незлапамятны народ.
А я па чорных тых дарогах
Усё іду, іду на ўсход.

Жыццё сказала нам, забудзьце
Пра боль, пра жорсткія часы.
Ды раптам схопяцца пачуцці,
І думкі счэпяцца, як псы.

Калі мы мерзлі, галадалі,
Кацілісе ў імгле атак,
Няўжо мы гэтага чакалі?
Як быццам не, як быццам так.

Мяне нявер'е не скруціла,
Не пахіснула горды сцяг
Самаупэўненасць крэцінаў,
Настырнасць хітрая дзяляг.

І, не спакушаны маною,
Павінен ведаць цвёрда я:
І што за мной, і што са мною,
Як будзе жыць зямля мая.

І ўсё ж прызнацца мне не сумна,
Што між людзей я добрых жыў —
Адважных, мудрых, неразумных —
І, можа, сам не з горшых быў.

1973

* *

А пабываць там даўно я мару,
Праехаць ціха, прайсціся пеша,
Дзе жыў Твардоўскі, дзе жыў Гагарын,
Дзе сам хадзіў я у сорак першым.

Усё змянілася — я гэта знаю —
Паміж барамі Смаленшчыны мілай.
І ўсё ж я кожны куток пазнаю
Па незабыўных старых магілах.

1973

МЫ

Праслаўлены лётчык,
Герой пасівелы
(І радуга плапак,
І Зоркі святло)
Расказваў проста
І трошкі няўмела
Прыцішаным вучням,
Як неба гуло.

Ён «мы» гаварыў.
«Я» гучала не часта.
Успомніў усіх,
Абавязан каму,
Як быццам належала
Зорка спачатку
Згарэўшым і збітым,
А потым — яму.

А быў ён адважны,
І жыў ён не ціха, ды помніў
Свайго гераізму выток:
Вучонага розум
І нітку ткачыхі,
Галоднага тылу
Падмецены ток;
Шыфроўкі разведчыкаў,
Хлеб і жалеза,
І дружбу,
І ленінскай праўды тамы.
І быў ён шчаслівы,
Што можа адрэзаць
Дакладна і горда:
Што мы — гэта мы.

1973

ДАРОГА

Ад наіўнасці бязмернай
У трыццатыя гады
Мы пісалі ўсе пра вернасць,
Пра каханне ды сады.

А жыццё — настаўнік строгі —
Праз пажары павяло,
Абвіло мяне дарогай,
Сэрца болем наліло.

І ў бязлітаснасці гэтай
З горкім прысмакам рабін
Ёсць закон галоўны свету:
Лепш рабі, мацней любі.

Нашы доўгія дарогі...
Сам сябе не раз пытаў:
Ці далучаны хоць трохі
Да людскіх вялікіх спраў?

На дарогах людзі, людзі...
Там касцёл, а тут мячэць...
Сэрца ў грукаце і гудзе
Пачало крыху мякчэць.

Легла ўсё да сэрца блізка:
Колас буйны і тугі,
І усмешка, і калыска,
І асеннія стагі.

Свет мой добры, свет вар'яцкі,
З новай сілай прагну жыць.
Толькі б сонца, толькі б праца,
Толькі б слухаць капяжы...

Старасць — не замілаванне,
Не чуллівая сляза.
Падступае хваляванне
К сэрцу вастрынёй ляза.

Нас не скруціць боль і роспач:
Кожны жыў з нас за траіх.
Я гляджу на хлопцаў рослых,
Што чакае заўтра іх?

Будзь, зямля, ім маці добрай!
Веру: з гэтых хлапчукоў
Многа вырасце падобных
Да сяброў-франтавікоў.

1973

У ПОЛЬШЧЫ

У каго рана большая —
У таго і боль больш ы.
Песня старадаўняя
Енчыць у вушах.
Езджу па Польшчы,
Хаджу па Польшчы —
І захлынаецца
Гаркотай душа.

Тут кожны касцёл —
Як вогненны стог,
І я баюся, Польшча,
Наступіць на твае сляды,
На твой крык,
На твой стогн,
Варушыць горкі попел
Тваёй бяды.

У вас, як і ў нас,—
Каля кожнай дарогі магілы...
А Вісла ўсю копаць глынула,
А памяць не змыла,
У мора занесла
І стогны, і пыл ад віхураў...
Спявае Варшава,
Спявае Зялёная Гура.

Не знаю, каму
Прашаптаў я:
Хвала вам і слава!
І болей ні слова
Пра гора, пра раны старыя...
Бо я закахаўся
Ў цябе, маладая Варшава,
І ў песні пра Віслу,
І ў пані Радовіч Марылю.

1973

* *

Азону,— просім мы,— азону!
На горы лазім.
І ўсё ж зямля святлом зялёным
Зноў налілася.

Знаёма ўсё, і нечакана,
І непаўторна.
Вясна паслалася туманам
На лядах чорных.

Я не стамляюся дзівіцца:
Ліняе заяц,
Цвітуць няярка касцяніцы,
На дзічках завязь.

Зноў заляцанні і спатканні,
Вясёлкі стужак.
Май пачынае кальцаванне
Дзяўчат і птушак...

У лесе дзіўна ўсё:
Зарніцы,
І гул трывожны,
І кропелькі начы-чарніцы,
І грыб тварожны.

Любоў да лесу не пагасла,
Шум бору сніцца...
Раней любіў я леспрамгасы,
Цяпер — лясніцтвы.

1973

* *

Даруй, жыццё, што ў слабасці часовай,
Калі імгла мне засцілала зрок,
Я горкія разгубленыя словы
Бяздумна устаўляў у свой радок.

Яны мой боль, яны не мой характар,
Я не хвалюся, толькі знаеш ты,
Які цяжар на абгарэлых трактах
Узвальвалі на сэрца мне франты.

І, ходзячы цяпер пад мірным сонцам,
Захліснуты агнём касмічных спраў,
Ніяк я не магу ўявіць бясконцасць,
Я ўсё яшчэ ля дымных пераправ.

І ў чалавека грэшнага я веру,
І на памылках дробных не лаўлю.
Ні птушцы, ні затуканаму зверу
Я кулю аніколі не пашлю.

Я дзякую жыццю і ганаруся,
Што быў заўсёды ў гушчары падзей,
І на змярканні ціхім не журуся,
Што дзень прайшоў, бо ён заўжды ідзе.

1973

* *

Ізноўку гром на лес, на голы,
І хмурацца сябры мае:
У сэрцы нейкі даўні голас
Сігнал трывожны падае.

Нябёсы грозяць нам патопам,
Грамы раз'юшаныя б'юць.
Галіны прыпяцкіх прытокаў
Сябе ў маланках пазнаюць.

Ды верыцца: не пакалеча
Сады, палі дачасны гром.
А бесклапотная малеча
Шумліва цешыцца дажджом.

Размыты цёплыя дарожкі,
Далёка ў лесе гром асеў.
І асцярожна басаножкі
Дзяўчына босая нясе.

1973

ЛЯСЫ І РЭКІ

Лясныя рэкі вучылі плаваць,
А лес карміў нас, сушыў анучы.
Народным мсціўцам аддаў ён славу,
Сабе пакінуў адну пявучасць.

З ягад крушыны рабіў чарніла,
Арэхі сыпаў шчодра ў кішэні.
Аддаў нам стойкасць, аддаў нам сілу,
Сабе — куванне зязюлі шэрай.

Дык як мы любім?
І што ратуем?
Якое заўтра ўнукам рыхтуем?
Паціху ў нас лясы высякаюць,
Таму і рэчкі перасыхаюць.

Паглядзіш — і камяк у горле:
Парадзеў і збяднеў наш бор,
І блакітную скуру здзёрлі
Дзе-нідзе з нашых рэк і азёр:

Леглі плямы мазуту і нафты,
Бруд сцякае з усіх бакоў.
Як там птушкам пяецца?
Не надта.
Як там рыбы?
Спытай рыбакоў.

Смерць лясоў для мяне непрымальна,
Як і гібель павольная рэк...
Людзі, людзі, жывіце нармальна
І пра будучы думайце век.

1973

* *

Мы пільней пазіраем на рэкі
І з дэльфінамі падружылі.
Лес нам дорыць
найлепшыя лекі:
Мы прыродзе яшчэ не чужыя.

Садзім клёны
і мальвы ля хаты,
І вядзе праз усе непагоды
Караблі чарадзейны лакатар —
Набліжаемся да прыроды.

Прызямляемся на парашутах,
Пагружаемся ў цёмныя воды,
Вывучаем бусловы маршруты —
Набліжаемся да прыроды.

А калі хто наважыцца,
горды,
Чалавека стварыць у прабірцы,
Сам адлучыць сябе ад прыроды
І не здолее ў заўтра прабіцца.

Згінуць нормы усе і законы,
Паімчымся па іншай арбіце...
Богам стаць, далібог, рызыкоўна!
А прабіркі пакуль што не біце.

1973

МАЁ ГАРЫШЧА

Пара снягоў і нудных
Прамоў. Прыйшла зіма.
А я такі ж няўклюдны,
Як ты, зіма, сама.

Ударныя дэкады,
Не ўсё ідзе на лад.
Адны клянуць нарады,
Другія ўсё падрад.

А я усё карпею
Над нейкаю страфой.
Птушыная капэла
Зацiхла пад страхой.

Сказаў не вельмі ўдала:
Няма страхі, няма.
Згубілася у далях
Дзіцячая зіма.

І ўсё-ткі засталіся
І ластаўкі з тых пор,
І сад, і сонца ў лісці,
І беласнежны бор,

І колер хмар і грому,
І пах баравікоў,
І яблыкі ў саломе,
І слодыч кіяхоў.

Мне сёння ўспомніць трэба
Цябе, сухі праснак;
Гуркоў, цыбулі, хлеба
Непараўнаны смак.

Маленства, ты не збегла
У край туманных сноў.
Знікае ўся адлегласць —
Я ў роднай вёсцы зноў.

І хоць малы ты ўласнік,
А подсвінка пакінь.

Пазней у курнай лазні
Пракопціш кумпякі.

Развесь іх на гарышчы
Ля венікаў радком,
Затым чакай ігрышчаў
Пад бубнаў звон і гром.

А дзе маё гарышча?
Наш дом цяпер з гару,
Пад дахам вецер свішча
У слотную пару.

І борам металічным —
Антэнаў стаякі.
Прапісаны ў сталічных
Кватэрах сваякі.

І ўсё ж маё гарышча
Заўжды было са мной —
На горкіх папялішчах
І лепшаю парой.

І там, за акіянам,
Забыць яго не мог...
Я чуў твой пах духмяны,
Ядлоўцавы дымок.

1973

* *

У садзе ўсё лісце апала,
Адзін толькі дуб не пажоўк.
На плечы цяжкія Купалы
Ўжо сеецца першы сняжок.

Любімы паэт Беларусі,
Высока народ вас узнёс.
Я шчыра кажу: ганаруся,
Што ў гэтай старонцы я рос —

Не лепшай, не горшай — адзінай
З яе ракатаннем бароў,
З яе яснатой лебядзінай,
Адкрытай для верных сяброў.

Пад вечар, калі пацішэе,
Я ўсё раскажу вам ізноў,
Як колас на нівах цяжэе
За Оршай ля вашых Ляўкоў.

Як моладзь ізноў прывучаюць
Зямлю дагледзець і любіць.
Камбайнам на жоўтых прычалах
Забытымі болей не быць.

Бо хлеб здабываецца цяжка,
Яму самы нізкі паклон,
Бо хлеб і ў бязважкасці важкі,
Ракеты ўздымае і ён...

Прабілася сонца.
Яснее.
Наш горад у белай красе.
Да вас пад'язджае вяселле,
Вам кветкі нявеста нясе.

1973

* *

Рыгору Барадуліну

З нас многія прагнуць разумнага,
Сапраўднага і чалавечнага.
А восень, цяжкая і сумная,
Шпурляе ліствой пакамечанай.

З нас многія прагнуць праўдзівасці,
Звычайнай людской натуральнасці,
Для радасці мы нарадзіліся,
А гора ізноў паўтараецца.

І знікнуць адразу дарадчыкі,
І ластаўкі пырхнуць у Крым.
У радасці — звонкая складчына,
У горы — самотна гарым...

Хлусня да хапугі прыцерлася,
Зрадніўся ён моцна з рублём.
Бязлітасным смехам хацелася б
Такога прабіць.
Ці праб'ём?

А можа, пытанне замажам?
Дадзім адпачыць і радку.
Далей ад кулацкіх замашак —
Па першым нясмелым лядку.

А верш адпачынку не просіць,
Імкнецца да лепшых людзей.
Хай ластаўкі зноўку прыносяць
У дзюбах драбочкі надзей.

1973

ПАЛЁТ У СІБІР

Мне кожны вечар нібы развітанне
З вячэрнім сонцам, ціхаю зарой.
Як падарунак кожнае світанне,
Сустрэча з новай рэчкай і гарой...

Агорнута зямля дрыготкай слотай,
Вятры асінам вушы прагулі.
Асеннія начныя самалёты
Ірвуцца ў вышыню з сырой зямлі.

Турбіны выюць ад гарачай зморы,
І самалёт мяне на ўсход нясе.
Сібірскіх не хапала мне прастораў,
Цябе мне не хапала, Енісей.

Я абдымаў цябе, зямля, пад Бранскам,
Капаў пад Селігерам твой падзол,
Вось і да глыбінных рубяжоў дабраўся,
Да Мінусінска, да хакаскіх зор.

Якая ты бязмежная, Расія!
Тайга, і стэп, і цішыня, і гул...
Палкоў сібірскіх ведаем мы сілу,
Братоў імёны ў сэрцы берагу.

Шчаслівы я, што ўбачыць давялося
І Енісей, і хараство Саян,
Як там плыве ракою жоўтай восень
У цёмны і далёкі акіян.

1973

* *

Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог;
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.

Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг
І, попелам пасыпаны, сканаў,
Калі не падзяліў з суседам радасць
І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.

Той дзень, лічы, завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць куточак свету
І хараство людзей, і дрэў, і траў.

Той дзень зусім закрэслены табою,
Калі ты раўнадушна абмінуў
Бяду чужую, пабаяўся болю,
Абразу хама моўчкі праглынуў...

Пазней старэць пачнеш самотна ў хаце
І будзеш скаргі гнеўна кідаць нам.
Не мы, жыццё табе даўгі заплаціць
За раўнадушша.
Вінаваты сам.

Мы не плюём на дружбу і на працу:
Нам без трывог не зберагчы жыцця.
Сябры, давайце будзем хваляваецца
За ўсіх і ўсё: за зерне і дзіця...

Я не святы, хоць і не сквапны злыдзень.
Даруйце, калі часам быў глухі
Ці чалавека грубасцю пакрыўдзіў...
Грахі мае, бясконцыя грахі.

1973

* *

А я маладых не лаю
За доўгія валасы,
А я маладым не раю
Галіцца дзеля красы.

Не бэшчу ні міні, ні максі,
А джынсы і сам надзеў.
Былі б толькі твары, не маскі
У маладых людзей.

Ды ласкі пабольш назапашана
Стрыманай, без маны.
На працу, як мы ў рукапашны,
Ўжо сёння ідуць яны.

Шырокі там гальштук ці вузкі —
Дык гэта, дальбог, не бяда.
Прыхільнікам бітлаўскай музыкі
Я сам зраблюся, бадай.

Вось толькі жылі каб цвярозей,
Астатняе ўсё — лухта.
Абы ім свяціў на дарозе
Надзейны і яркі ліхтар.

А трэба — пойдуць на міны,
На танкі.
Не задрыжаць.
А што там — максі ці міні —
Самім маладым вырашаць.

1973

* *

А сонца цябе прасмаліла,
Ты пахнеш чаборам,
сасной.
А тут яшчэ спее маліна
На ціхай палянцы лясной.

Забудзь падрабязнасці быта,
Будзёншчыны потны рэжым.
Нырнём
у лясоў першабытнасць,
А можа, ў дзяцінства збяжым.

Ах, словы,
высокія словы,
Ва ўзнёсласці — фальшу налёт.
А ёй бы пад ветрам сасновым
Пазбавіцца вечных турбот;

Ад кухні заўжды цеснаватай,
Адкуль толькі сцены відны,
Сябе я адчуў вінаватым,
І горка ад гэтай віны...

Асеннія будні нахлынуць,
Ты ў кухні цішком запяеш:
Успомняць чабор і маліну
Пабляклыя вусны твае.

1973

* *

Касманаўт заўжды пасля палёту
Прывыкае да зямлі ізноў.
Думаю пра гэта я з палёгкай:
Мы ўвесь час вяртаемся дамоў.

Век мой, я прашу ў цябе не многа:
Без расчараванняў — абнадзей,
Прывучы да шуму гарадскога,
Да касмічнай хуткасці падзей,

Да заводаў нафтаперагонных
Каля нашых рэчак і балот,
Да таемных цудаў электронных,
Да трывог дзяржаўных і турбот.

Прывучы да новых нашых вёсак,
Да рыкання вечнага дарог;
Да таго, што мне ўжо нельга босым
Выбегчы на росы за парог;

І да звычак моладзі нязвычных,
Дзе крыклівых песень цераз край;
Да зямнога новага аблічча
Прывучай, штодзённа прывучай...

Толькі не прывыкнуць мне ніколі
Да цябе, вясновы крыгаход,
Да цвіцення яблынь і таполяў,
Што цвітуць іначай кожны год.

Я сам-насам зноў з вясной пабуду,
У здзіўленні новым памаўчу.
Да зямных, знаёмых змалку цудаў
Прывыкаць не ўмею, не хачу.

1973

* *

«Спі спакойна, дарагі таварыш...»
Ах, які там сон, які спакой.
Раўнадушша звыклае на тварах,
Спеў журботны хвой над галавой.

Нехта сапраўды цішком гаруе,
Нехта мямліць: «Рэдкі чалавек...»
Дарагі таварыш нам даруе,
Нават тым, хто дні яго падсек.

1973

* *

І няма каго нам папракаць —
Быт стары эпоха раздрабіла.
Развучыліся мы коней запрагаць,
Не адрознім панарад ад біла.
Мы з нагі не збіліся нідзе,
І не нам за старызну чапляцца.
Толькі трутняў шмат яшчэ гудзе
Над зямлёй людзей, над нашай працай.
Бо, «з другога боку, ёсць у нас»,—
Гэта я казаў ці вы казалі?
Мы хавалі ўласніцтва не раз,
А яно ізноўку выпаўзае.
Людзі робяць, як ва ўсе часы,
А другія век жывуць улегцы.
Ім бы толькі славу для красы,
Ім бы за стырно ды ў рукі лейцы.
Нахапаць паболей барахла,
Лепш пажыць, смачней папіць, паесці,
Пакадзіць начальству,
З-за вугла
Друга аглушыць,
Вышэй пралезці.
Спрытны чмут не любіць сеяць, жаць,
Ён на хлебным месцы прымасціўся
І лагодна можа разважаць
І пра «Песняроў» і пра Мацiса.
Староваты сыты галасок,
Ён наскрозь фальшывы і ілжывы.
Яго поіць не з бярозы сок —
Прагнасць, бессардэчнасць і нажыва.
«Я табе, ты мне — яго закон,—
Гні сяброў і гніся сам, дзе трэба,
Ды трымай язык свой пад замком
І не вер сябрам, зямлі і небу...»
Хочацца пра іншае пісаць,
Ды занепакоены я шчыра,
Што няма каго нам папракаць
І смяюцца трутні над сатырай.

1973

* *

Грызе усіх нас нецярплівасць:
Хутчэй бы той чаканы век,
Дзе б жыў,
                    рабіў і быў шчаслівы
Сумленны кожны чалавек.

Здаецца,
                вырвалі карэнне,
Няма ў мінулае шляхоў.
Ды бачым зноўку паўтарэнне
Усіх запыленых грахоў:

Злабы і зайздрасці успышкі,
Нахабнасць лютую хапуг,
І самагонныя адрыжкі,
І кар'ерызму рабскі дух.

Усё змяняецца з узростам,
А нейкі кут яшчэ глухі...
Ах, як няпроста,
                            як няпроста
Адскрэбці плямы і грахі.

І з пакалення ў пакаленне
Яно пакутліва ідзе —
Да працы добрай прылучэнне,
Ачалавечванне людзей.

1973

ПРОСТЫЯ ІСЦІНЫ

Мы ўсе аматары амністый,
І патуранняў, і спагад.
Няма складаней простых ісцін,
Што «пройдзеш свет, але назад...».

Я свет няпраўдай не праходзіў,
Быў часам тлум у галаве —
То бузіна расце ў гародзе,
То дзядзька ў Кіеве жыве.

Бог зберагае беражоных —
Сівая прымаўка бабуль,
А на ражон не лезь піжонам,
І не кажы ты «гоп» пакуль...

І хоць не хочаш — заякочаш,
Калі, кума, ты падпіла.
Вышэй пупа, брат, не падскочыш,
Хоць з'еш вала — адна хвала.

І хай ты будзеш вельмі сыты
І на патэльні тук падскроб,
А ўсё-ткі і вала з'ясі ты
І нечакана скажаш «гоп».

Так век жыві і век вучыся,
Не плюй у студню... Гэта так...
Як доктар, сам лепш палячыся
І на ўсе рукі будзь мастак.

Час нашы беды перамеліць,
Сыны цыбатыя растуць,
Яны і самі зразумеюць
Складаных ісцін прастату.

1973

* *

Сягоння не засну...
Мяне так дзіўна хваляць,
Як спелую сасну,
Якую хутка зваляць.

Сумую я па тых,
Што згаслі, нібы свечкі.
А тут і б'юць пад дых
З усмешкаю, па-свецкі.

Там свечак не было,
Свяцілі нам ракеты.
Сляпіла і гуло
Усюды без прасвету.

Успомню тых людзей —
Гатоў хвастаць па мордзе
Таго, хто бой вядзе
З-за імпартнай камоды.

Такому не відно
Красы зямнога шара.
Ён верыць у адно:
Манеты ўсё рашаюць.

Я іншай веры сам:
Бліжэй было б да шчасця,
Каб удалося нам
Хутчэй суняць мяшчанства.

1973

* *

Першыя раны жанчына лячыла,
Травы збірала з відна да цямна.
Першых звяроў прыручыла жанчына,
Першай пасеяла зерне яна...

Той і шчаслівы, хто зведаў каханне,
Хай потым беды, хвароба і золь,
Мы не скупіліся на абяцанні,
Ўсё ім далі:
ад пярсцёнкаў да зор.

Ведаю:
час раўнадушна імклівы,
Дзьмухне у твар скразнячок ледзяны.
Лісце ў садах ападае маўкліва,
Зноўку ў кватэрах жанчыны адны.

І субяседнік адзін — тэлевізар,
Кветак няма,
ды і ласкі няма.
Я правяду сорак восем рэвізій
І аддалю тваю сцюжу, зіма.

Не паціскайце, мужчыны, плячыма,
Не спасылайцеся хітра на час.
Першых звяроў прыручыла жанчына,
Можа, як-небудзь прыручыць і вас.

1973

ТВОРЧАСЦЬ

З паэзіяй мне развітацца пара,
Пакуль не зрабіўся сапраўдным вар'ятам.
Прыгожа, дасціпна... І ўсё ж — мішура...
Лятуць на падлогу усе варыянты.

А словам дакладным не трэба прыкрас,
Сапраўдным пачуццям не трэба аздобы.
Паэзія мучыць бязлітасна нас.
Даволі!
І я выбіраюся з дому.

Іду, як заўсёды, ў купалаўскі сад,
Падняўшы каўнер і насунуўшы кепку.
А ў садзе шуміць залаты лістапад...
Шапчу я: Іван Дамінікавіч, кепска...

Працуем, а нас не чытаюць амаль,
Жартуем, а людзям чамусьці не смешна...
Спакойны і мудры, глядзіць ён удаль,
Усё перад ім: гэты сад і бязмежнасць.

Крычаў і маліўся, стагнаў і спяваў,
Каб кроў мужыка не лілася на росы;
Ён сонца выворваў,
З магілы ўставаў,
Каб толькі убачыць у шчасці народ свой.

Я жорстка ўпікаю самога сябе
І тых, што не страцілі гонар і сорам.
І так, аб будоўлі... І так, аб сяўбе...
А мы тут пры чым?
Мы бясконца гаворым...

Стаіць ля Карэлічаў жыта сцяной,
Шыпшына цвіце каля Мірскага замка,
Да брацкай магілы ідзе партызанка...
Я зноў на вайне.
Я падбіты вайной.

Успомніў ізноўку сырыя лясы,
І Ловаць, і Полу, і тыя балоты,

Шчаціну на шчоках
І гразь на пілотках,
Сержантаў ахрыплыя галасы.

І грукат, і стогны, і пыл, і туман,
І той пад Бягомлем глыбокі калодзеж,
Дзе кідалі немцы жывых партызан...
Ізноўку нянавісцю сэрца калоціць.

Ля брацкіх магіл трэ спыняцца часцей,
Чытаць надмагільныя надпісы моўчкі.
У сэрцах людскіх залатыя замочкі
Тады адамкнём, калі станем чысцей.

Хай хітрая слава мяне абміне,
Жыццё не пакіне трывожыць і вабіць.
А нехта ссылае у старасць мяне,
Імкнецца мой гнеў да мяшчанства аслабіць.

Не здамся!
Бяссоннаю працай спалю
Сябе, ды ад праўды я не адступлюся.
І словам я сцверджу усё, што люблю
Ў народзе сваім і ў сваёй Беларусі.

1974

6 Зак. 2000

БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНЦЫ

Чыгунка Беларуская,
Трывожныя гудкі...
Твае тугія шпалы —
Пявучыя радкі.
У кожнага ці станцыя,
Ці хоць паўстанак ёсць,
Дзе пачалася, скончылася
Наша маладосць.
Мы не былі абражаны
Вакзальнай духатой
І цеснатой вагоннаю...
Абы не пехатой.
На станцыях ты шчодра нас
Паіла кіпятком
І частавала вішнямі,
А зрэдку і мядком...
Даруй, цябе ірвалі мы
І трушчылі на друз,
Калі да нас вазіла ты
Чужы смяротны груз.
Не па сваёй ахвоце,
Не па сваёй віне.
І ўсе перакаваліся,
Што гнеў жалеза гне...
А потым быў твой лепшы дзень,
Высокі зорны час,
Калі скрозь кветкі, слёзы, плач
З вайны ты везла нас.
Легендаю зрабіліся
Дні «рэйкавай вайны»,
На стыках зноў ты цокаеш
Абцасікам стальным.
Цяпер ты ўся інакшая,
Інакшы груз вязеш...
Ды часам, чарку выпіўшы,
«Зямлянку» зноў пяеш.
І ўсё адразу робіцца
Сардэчней і прасцей.
І для народа сцелеш ты
Вандроўную пасцель.

1974

* *

Апошні дзень вясны і першы лета.
А дзе мяжа?
Мяжы такой няма.
І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты,
І ў спёку жыгане цябе зіма.

Усё жыццё:
Юнацтва, сталасць, старасць —
Свае адзнакі ў нас пераплялі.
Як юнакі, цяпер мы часам марым,
А ў маладосці сталымі былі...

Клянёмся, што жывём усе мы дружна,
Ды першы друг мой дом зусім забыў,
Другі застыў у сытым раўнадушшы,
А трэцяга і сам я разлюбіў.

Ідуць гады,
Рады сяброў радзеюць,
А новых мне, напэўна, не знайсці...
На скверах клёны ціхія ірдзеюць,
І хутка цёмным сіверам гусці.

Таму хачу надыхацца, нагледзецца,
Напрацавацца да апошніх сіл,
Пакуль не пахісне мой небасхіл
Зімы няўмольнай злая галаледзіца...

Жыццё ў бядзе і радасці — адзінае.
Пакой мой заліло
Такое дзіўнае:
То дзеці лісця жоўтага назносілі.
Апошні летні дзень
І першы — восені.

1974

* *

Скажы мне адно толькі слоўца,
Адно славечка,
І я застануся з табой не на вечар —
Навечна.

Але не скажаш:
Яно для другіх,
А мне — толькі даўняе рэха.
Пара забываць пра іх, дарагіх,
Адводзіць вочы ад грэху.

Няпраўда, што ўсё з гадамі праходзіць,
Прыглухне, прыціхне.
Закружыць у новай цябе прыгодзе
І сэрца прыцісне...

Ды застаецца заўсёды на свеце
Недасягальнае нешта:
І горад, які табе не пасвеціць,
І востраў, які мінеш ты.

Павінна застацца кніжка адна
Цудоўная — непрачытанай.
Яе прачытае твая радня —
Больш маладая, плячыстая.

І будуць іншыя моцна любіць,
І сцежкі твае назавуць сваімі...
Сыходзяць сівыя мужчыны ў нябыт
І шэпчуць чыёсьці імя.

1974

ДЗЕЦІ

Вочы свецяцца добрым даверам,
Дзеці вераць так шчыра усім:
Чалавеку, і дрэву, і зверу,
Тэлефільмам і кнігам сваім.

Што ім нудныя нашы парады!
Цуды веку выкладвайце ім.
Справядлівасці, ласкі і праўды —
Вось і ўсё, што патрэбна малым.

Ды зямлю ўсю ў прыдачу, ды космас,
Ды цудоўную казку на ноч,
Ды па травах набегацца росных
Без апекі бацькоў басанож.

То народ кампанейскі і чэсны,
А схітруюць ці зманяць парой,—
Гэта мы, гэта нашая чэрствасць,
Наш далёкі нядобры настрой.

Не спяшайце іх грозна праверыць,
За свавольства хутчэй асудзіць.
Я ў дзіцячую жорсткасць не веру,
Бог вясёлы ў іх сэрцы сядзіць.

Мы, успомніўшы годы маленства,
Хочам бачыць ва ўсім падабенства.
Дзеці мала падобны да нас:
Іх не мы нараджаем, а час.

Гэта час падсабляе ім выжыць,
Стаць дужэй, разумней і чысцей...
Ціха!
Маці зямлі ўсёй калышуць
Міліёны маленькіх людзей.

1974

* *

З маленства мы ірваліся у горад,
Хто ў інстытут, а хто і на завод.
І для Радзімы сталі мы апорай
І ў працы, і ў імгле ваенных год.
Пасля вайны жылі мы беднавата,
А вёскі проста слеплі уначы.
Мы перад імі ў нечым вінаваты,
Хоць мала чым маглі дапамагчы.
Зямля і неба звязаны дажджамі,
Мы з роднай вёскай — памяццю навек.
Прывыкшыя да тлуму гараджане,
Цяпер ірвёмся да лугоў і рэк.
Не з настальгіі, не для пакаяння,
Не на густы асенні медазбор —
Мяне завуць свая зямля і бор,
Як марака мары і акіяны,
Каб зноў адчуць салёныя турботы
Гаспадароў адроджанай зямлі.
Вясна ідзе...
На мне чужыя боты,
І я, крыху чужы, іду ў палі.
Халодны вецер, ты не скавычы
І не свішчы так рэзка і трывожна.
А ногі месяць гразь, нібы квачы,
Спрачаюцца з вясновым бездарожжам.
Сапраўдныя зямлі чараўнікі
Свае паэмы трактарамі пішуць.
Палі, палі — сялян чарнавікі —
І працаю, і вечнай праўдай дышуць.
На іх радкі пшаніцы прарастуць,
Хай дзень жніва ад сонца будзе яркі.
Люблю вясновы гуд, і перастук,
І рэактыўны голас цыркуляркі...
Якая непаўторная паўторнасць!
Я маладзею.
Зноў гатоў к рыўку...
Пачаўся дзень,
І на палетак чорны
Паклала сонца цёплую руку.

1974

БАЛКОНЫ

У шматгалосым гуле
Заблудзішся парой...
Балконы — шыльды вуліц
І выстаўкі двароў.

Наш горад на уздыме,
Дарос да хмараў ён,
І дбаюць гаспадыні
Пра кожны свой балкон.

У добрых, рупных жонак
Заўжды святочны лад —
І кветкі, і вазоны,
І дзікі вінаград.

Ніхто тут не пярэчыць —
Спявай, іграй, любі.
На вузкія парэнчы
Садзяцца галубы.

Тут ранак вельмі звонкі
Гадзін з шасці-сямі.
Як вымпелы, пялёнкі:
Прыбаўка у сям'і.

Заспаную падушку
Абвеяў вецярок.
Дубовая кадушка
На сонцы грэе бок.

Высока у надхмар'і
Спакусай дражняць нас
І кумпякі у марлі,
І тузіны каўбас...

Прыедзе з вёскі маці,
Нясмела зойдзе ў двор,
А дзе дачку шукаці —
Муры тут вышай гор.

А гляне на балконы —
І сэрца запяе:
Па посцілцы чырвонай
Кватэру пазнае...

Стаю ў двары зялёным,
Сумую нездарма:
Няма ў мяне балкона
І маці ўжо няма.

1974

* *

Генадзю Бураўкіну

Мы вельмі любім слова «малады»,
А паглядзіш — і маладым пад сорак.
Гады, гады... А што? Такой бяды...
Для ўсіх нас хопіць працы, сонца, зорак.

Вам тэмы для раманаў і паэм
Дае не заіграная пласцінка,
Жыццё само:
Да інтэгральных схем
Прыпайваюць дзяўчаты залацінкі.

А ім цяжэй, чым бабцы ля дзяжы,
Хай не кране дзяўчатак гэтых немач...
Вам сэрцы іх чытаць і чарцяжы,
А мне сваё:
Я ў інтэгралах невуч.

Чыя дарога лепш: мая, твая,
Мы не спрачаемся,
Жывём у добрай згодзе.
Але ў адным табе зайздрошчу я:
Часцей ты па лясных дарогах ходзіш.

Мне поўнач наша ўсёй зямлі мілей.
Там некалі на валунах замшэлых,
Як чэрці, ў павуцінні і смале,
Мы слухалі куванне птушкі шэрай.

Там, пад Бягомлем, дзіўныя бары,
Гасцінец пад бярозаваю вартай.
Там і цяпер жывуць мае сябры,
Не заязджаў да іх я даўнавата.

І ўсё цяжэй мне выкупіць віну:
Калі не можаш, лепей не кляніся.
Паедзеш зноў па вершы на Дзвіну —
Маёй зямлі юнацкай пакланіся.

1974

* *

Я гаварыў занадта гучна
Ды і пісаў
занадта гучна,
Пара праўдзівей і цішэй,
Да сэрца нечага бліжэй,
А гэта ў сотні раз цяжэй.

А ці пачуюць,
ці пачуюць?
А што пачую ад другіх?
Усе спяшаць,
усе качуюць,
Адзін другога дрэнна чуюць,
Грызуць свае турботы іх.

Сказаць бы хмурнаму суседу:
Заходзь,
расказвай мне пра беды,
Давай пакурым,
пасядзім,
На рэчаіснасць паглядзім.

Чаму наш час
нервовы, тлумны,
Чаму парою
мы прыгорблены,
Чаму так многа недадумана,
Чаму так многа недаároблена?

Ды не заву,
а сам сяджу,
Сябе бязлітасна суджу,
Пасля бяруся за другіх —
Сваіх калегаў дарагіх.

Той хлусіць,
гэты прытвараецца,
А той над градкамі заціх —
І вось няма ўжо
з кім параіцца,
І вось няма куды зайсці.

Той знемагае у палаце,
А той ад славы ачмурэў.
Няўжо ў сяброў я веру страціў?
Цішэй, цішэй,
мой хатні гнеў.

Яны ні ў чым не вінаваты,
Яны такія,
як і ўсе;
Іх, слаўных, грэшных, дзіўнаватых,
Жыццё шалёнае нясе.

Ты сам спагадлівей зрабіся,
Ты сам такое напішы,
Каб узняліся трохі высі
І пасвятлела на душы.

1974

* *

Хадзіў я па лесе і сведчу:
Ад звонкіх аглух галасоў.
На соснах зялёныя свечкі
Зарніцай запалены зноў.

Ды што старасвецкія свечкі!
Іншы агонь той лясны:
Бушуе зялёная вечнасць,
Бясконцасць жыцця і вясны.

Не любіць жыццё аднастайнасці,
А прагне штодня навізны.
І цёплыя фарбы вясны —
На змену сцюдзёнай крыштальнасці...

Вясна пачынаецца з мод,
Шаўковым павеяла шэлестам.
І самы занудлівы жмот
На плацце адно раскашэліцца.

А кветкі ідуць нарасхват:
Усюды вяселлі, заручыны.
І дзецьмі засыпаны сад —
Усе каруселі раскручаны.

І новы заселены дом —
Вясёлая, добрая тэма.
І ластаўкі селі радком
На тэлевізійных антэнах.

1974

СКАРБОНКА

Я сябе адчуваю скарбонкаю.
Пацяшайцеся, хто ахвоч,
Я не грошы збіраю, а звонкія
Галасы салаўёў усю ноч.

І дзяцей галасы, і ветру,
Кроплі сонечныя капяжоў.
Глянь на лес: ён зялёна-светлы,
Паглядзі ізноў: ён пажоўк.

Мудрасць кніг і радасць людскую,
Гнеў і гора — усё лічу.
Я збіраю, пішу, святкую,
Сто разоў у бездань лячу.

Ах, як многа імгненне важыць!
Над сталом мяне, праца, гні.
Калі выйдзе, дык гэта і ваша,
А не выйдзе — спалю на агні.

То знаходкі, то непаладкі,
То ярчэй мой дзень, то цямней.
Не разгадваюцца загадкі,
Што жыццё падкідвае мне.

Бо жыццё — акіян, не задачнік,
Дзе падглядзіць можна адказ.
Што там значна і што нязначна
У табе, наш напорысты час?

Я на ідалаў не малюся
І з няпраўдаю не міруся,
Дык, удача, хоць раз мне падзьмі!
Зноў збіраю і зноў дзялюся
Сваім скарбам малым з людзьмі.

1974

* *

На Брэстчыне карыбскі ураган,
Паводка бангладэшская увосень.
Дажджы зімой.
Снягоў няма.
Туман.
На бронетранспарцёрах сена звозім.

Калі б тут не сапраўдная бяда,
Дык можна б пастаяць і падзівіцца.
Але вада,
Страшэнная вада,
Нялёгка часам да людзей прабіцца.

Жывой вады руйнуючы удар,
Мы зубы сцялі, не клянём нікога.
Плывуць стагі па небу паміж хмар
І не знаходзяць сонца залатога.

Дае прырода зноў урокі нам:
Не верце цішыні, салодкім снам,
Бяда і радасць ходзяць побач вечна,
Людзей ратуе толькі чалавечнасць.

1974

У МАГАЗІНЕ

Ідзе вясёлы продаж.
Сам выбірай, бяры
Садоў і агародаў
Духмяныя дары.

Сябе хваліла лета
І верасня-суседа,
Ад паху тут званілі
Пчаліныя званы.

Капуста, памідоры
І сопкай бульбы горы,
А кут запаланілі
Цяжкія кавуны.

Цыбуляй залацела,
Грыбамі на шнурочку,
Са слоікаў глядзела
Зялёным агурочкам;

Арэхамі звінела
І пахла часнаком
І яблыкамі спелымі
З бурштынавым бачком...

Машыны ўсё падвозяць
Мядовы пах густы.
Прыйшла ў наш горад восень
На лапках залатых.

1974

* *

Зямля мая то мяккая, то мулкая,
Ад навальніц прасторная і гулкая —
Такая непаўторная заўсёды.

Ад спёкі разамлелая, спакойная,
Бярозавая, бэзавая, хвойная —
Яна найпрыгажэйшая заўсёды.

У кожнага свае лясы, і ластаўкі,
І песні, і жаночы голас з ласкаю —
Яны мне найраднейшыя заўсёды.

І зоркі нашы, і сцягі гарачыя
Вялікай перамогаю адзначаны —
Адданы ім я ўсюды і заўсёды.

1974

* *

Турабу Тула

Вось яшчэ малое намаганне,
І дакладна ўсё успомню я...
Недзе ў Бухары ці Намангане
Ты ішла, харошая мая.

У такой вясёлкавай спаднічцы,
А на кофце трыццаць тры касы.
Пэўна, я на сто гадоў спазніўся,
Не сустрэў раней такой красы.

На яе глядзець было няёмка,
Толькі немагчыма не глядзець.
Са спякотнай казкі незнаёмка
Некуды спяшалася паспець.

Як фазан, прашастала імкліва,
Пазаві — я следам паспяшу...
А мой друг Тураб глядзеў раўніва
На маю славянскую душу.

1974

* *

Прыляцелі з Канады і Бірмы,
Знемаглі ад высокіх турбот.
— Прад'явіце багажныя біркі,—
Патрабуе аэрапорт.

Мы не з Бірмы.
Жывём ля Нямігі,
Нешта пяішам штодня у блакнот.
— Прад'явіце не біркі, а кнігі,—
Скажа некалі ўсім нам народ.

— Ці глыбока пранікдлі вы ў душы,
Ці высока ўзляцелі да зор?
І, пазбаўлены крывадушша,
Нам надпіша народ прыгавор.

1974

* *

Жывая рака у няспынным руху,
Размыла хуткасць абрысы бору.
І засталася на сэрцы скруха,
Што нам заўсёды вакзалы дораць.

І буду думаць я паўдарогі
Ўсё аб табе, аб табе, а потым
Стамлюся трохі, забуду трохі:
Сустрэчы, справы, званкі, работа.

Найлепшая з нашых дарог —
Дарога
Дадому.
Ад'едзеш сто вёрст зваротных,
І зноў аб табе, аб табе трывога,
І зноўку думкі аб доме родным.

1974

* *

А радасць — не шумлівая,
А шчасце — сарамлівае,
Бяда — зусім маўклівая,
І так, я пра цябе...

Называў бяздоннымі,
Не было ярчэй.
А цяпер бяздомны я
Без тваіх вачэй.

Не таму, што вычарпаў
Сіняву да дна.
Колькі гора выцерпеў,
Знаеш ты адна.

Бачу твар, ды толькі
Ён, як зімні дом,
Раўнадушным тонкім
Пакрыты ільдом.

Нас, відаць, сурочылі,
Як ішлі мы ў бор,
Балбатня сарочая,
Бабскі нагавор.

Я не весялюся,
Хоць і не крычу.
Дзе я пасялюся,
Лепей памаўчу.

Як няўтульна сёння,
Хоць бы грымнуў гром...
Пашлі, божа, сон мне
Пра той сіні дом.

1974

* *

На пягоды жыцця не жальцеся,
Не было б перамог без нягод.
Нараджайцеся, нараджайцеся
Кожны месяц і кожны год.

У вачах любімай дзяўчыны,
У вачах суседзяў, сяброў,
У вачах прафесараў чынных
І забеганых дактароў,

І ў шырока раскрытых дзіцячых
Вачанятах,
І ў плыткай вадзе.
Не старэйце, людзі, дачасна,
Нараджайцеся кожны дзень.

1974

БЯРЭЗІНА

Міколу Айрамчыку

Мы вандроўнікамі ўсе
Знатнымі зрабіліся.
У дарозе пакрысе
Ад сям'і адбіліся.

Наглядзеўся на мадонн
Ціхіх і гарэзлівых...
Каму Тэмза, каму Дон,
Мне — рака Бярэзіна.

Петлі вузенькія ўе
Недзе каля Докшыцаў,
Пераходзіў праз яе
Па маленькай дошчачцы.

З бацькам ездзіў я на рум —
Сосны, воды сінія.
Знаў я кожную нару
І шляхі ласіныя.

Начаваў над ёй не раз
І не мог наглядзецца,
Як плыве рака-зара,
А бярозы свецяцца.

І плыве, і мые жвір,
І нідзе не спыніцца,
З радасцю ў дняпроўскі вір
З галавою кінецца...

Поўнач ты аб'ездзіў, брат,
Ды і поўдзень сонечны.
А Бярэзінскі фарштат?
А сяло Любонічы?

А які лясны прастор
За Слабодкай мілаю!
У адзін і той жа бор
Па грыбы хадзілі мы.

Ад нахмураных вачэй,
Гоману штодзённага
Ірванём давай хутчэй
На сваю, сцюдзёную.

Паначуем ля стагоў,
Пазбіраем голачкі.
Ля бабруйскіх берагоў
Ёсць мае аполачкі.

Гэта наш бацькоўскі дом,
Ствол, вайной падрэзаны...
Каму Волга, каму Дон,
Нам — рака Бярэзіна.

1974

ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ

А на Палессі ўсё нядробна:
Цяжкая спадчына вякоў,
Цяжкія рукі хлебаробаў,
Цяжкія сны палешукоў.

Якую трэба мець адданасць
І сэрца сынава, каб так
Любіць палескі край туманны
І маці бедны андарак.

Якую мужнасць мець патрэбна,
Каб хуткасці наперакор
Уваскрасіць і воблік зрэбны
Сяла,
І водбліск даўніх зор.

Нас б'е па сэрцах паскарэнне,
Сціскаюцца прастора, час.
А матчынай зямлі карэнні
Ніколі не адпусцяць нас.

Хвалюючае падабенства!
Старонкі Мележа крані —
І з небыцця, з майго маленства
Мае узнікнуць Курані.

І час імкліва незваротны
Мастак ізноў вяртае нам,
І ажывае ўладна роднасць,
Хоць я з мясцін іншых сам.

Пад навальнічны подых рэзкі
Я пад буслянкаю стаю
І ў ціхай вёсачцы палескай
Сябе малога пазнаю.

І, навальніцаю абмыты,
Па сцежцы, як па пояску,
Іду па лузе аксамітным
Ля выспаў белага пяску.

Развеяўся настрой паганы,
Каліны зноў цвітуць мае.
І свеціць мне усмешка Ганны,
Любоў яе і боль яе.

Зямля бацькоўская, святая.
Так, гэта мы. Увесь народ...
Мне ў сэрца бусел залятае
З трывожных прыпяцкіх балот.

1975

АСЕННЯЯ НАВАЛЬНІЦА

Услала пажоўклае лісце дарогі,
Буслам ужо Афрыка цёплая сніцца.
І раптам прыйшла, прыпазніўшыся трохі,
Да нас навальніца.

Варочае восень цяжкія грымоты,
І паляць маланкі апошні свой порах.
А ліўні прыбавілі людзям работы:
Купаецца бульба у свежых разорах.

Чаму страпянуліся ўсе мы так рэзка,
Нібыта з нас кожны вярнуўся кудысьці...
А хмары ўзрываюцца з гулам і трэскам,
І долу ляціць абгарэлае лісце.

Няўжо пераблытала нешта прырода?
Такая нязвыкласць у гэтым вяртанні,
Нібыта з далёкага нейкага года
Прыслала табе маладосць прывітанне.

1975

КУФАР

Яшчэ ён не пусты,
Наш куфар старажытны.
Цвіце ў ім лён густы
І каласіцца жыта.

У куфры тым ляжаць
З ільну і кветак скарбы.
Лясы і сенажаць
Далі свае ім фарбы.

Мастак адзін рашыў
Зарысаваць узоры.
Дзяўчат разварушыў,
А ім чамусьці сорам.

Прасіў падзвіжнік той
Іх — у імя мастацтва —
З нейлонавай красой
На вечар развітацца.

А хлопцаў вон хутчэй!
Няхай ля ганка мокнуць.
Ад хітрых іх вачэй
Завесілі ўсе вокны.

А фарбы аж пяюць!
Пахарашэла хата.
На прыгажосць сваю
Дзівуюцца дзяўчаты.

А ў полі вярба...
Што ні убор — то песня,
Каханне і журба,
Дзявочае прадвесне.

А бедны ж быў народ,
І людзі гаравалі,
І труны кожны год
На ручніках спускалі.

А тут жа кожны штрых —
Не з нітак, а з праменняў:

Фантазія майстрых,
Людскія летуценні.

Абрусы, ручнікі
І посцілкі — на дзіва.
Любоў, жыццё, вякі
І ўся мая радзіма...

Не буду варажыць
Аб густах і жаданнях.
Я знаю: скарб ляжыць
У куфрах старадаўніх.

1975

* *

А страціць годнасць — невыносна,
Які б ні быў там дабрадзей...
Глядзіце знізу ўверх на сосны,
На воблакі.
Не на людзей.

А калі вас уздыме слава,
Аб гэтым думайце радзей...
Глядзіце зверху ўніз на травы
Ці на ваду.
Не на людзей.

1975

* *

Было ўсё неба нада мною,
А пада мною ўся зямля.
Жыццё нялёгкае, зямное
Я знаю зблізку, не здаля.

І шлях цяжкі мне быў пад сілу,
Хоць ён з выбоін і канаў,—
Па ўсёй зямлі мяне насіла
Жыццё,
І стомы я не знаў.

І думаў я, што будуць вечна
Высокі дзень, і пругкі крок,
І песні тыя, і надрэчны
З аерным пахам вецярок,

І найдрабнейшыя праявы
Вясны, і лета, і зімы.
І любы зноў мне тыя стравы,
Што у маленстве елі мы.

І хоць былі мы ўсе галота,
Ды мяккая расла трава,
І быў гарачы пах жніва.
І водар кропавы гарода...

Я ў памяці дзень цэлы рыўся
І з болем зноў перабіраў
І тых, з якімі пасварыўся,
І тых, з якімі памірыўся,
І тых, якім не дараваў;

І тых, каму заўсёды верыў,
А болей — самых лепшых, тых,
З якімі разам перамераў
Гады, трывогі і франты.

Вы так цяпер мне ўсе патрэбны,
Сябры, дарогі, гул бароў...
Глядзіць палоскай вузкай неба
З-за двух агромністых муроў.

1975

ЧОРНЫ БУСЕЛ

Стань ля Прыпяці,
Любуйся,
Прыхаваўшыся ў лазе.
Чорны бусел,
Чорны бусел
На адной стаіць назе.

Я люблю буслоў і белых,
Дык скажы: чаму, чаго
Вінавата і нясмела
Пазіраю на яго?

Ну, вядома, гэта рэдкасць,
Ну, вядома, гэта госць...
Успаміны колюць едка:
Іх звяла людская злосць.

Пра сініц пісаў і чаек
І пра салаўіны свіст.
Гэты бусел незвычайны,
Як ад продкаў нашых ліст.

Што са мною нарабілі
Вы, таемныя паслы:
З песні —
Чорныя рабіны,
З казкі —
Чорныя буслы?

1975

МІНСКІЯ СВЯТЫ

Люблю я вас, мінскія святы,—
чырвоныя рэкі сцягоў.
Выходзяць на вуліцы песні,
і радасць, і наша любоў.

З'язджаюцца госці з паўсвету,
найбольш — партызанскай радні...
У першых шарэнгах героі,
іх зоркі зіхцяць, як агні.

Гучыць у іх гонар ваенны,
авеяны славаю марш.
Сівыя мае камсамольцы,
я з вашага племя, я ваш!

І ўсё ж я заўсёды смуткую,
як новае свята ідзе,
Бо падаюць воіны моўчкі,
рады партызанаў радзей.

Усім абавязаны вам мы,
мы кожную помнім з ахвяр.
На дужых плячах свайго бацькі
сядзіць наш мільённы жыхар...

Усюды так светла і ярка,
што з космасу Мінск наш відзён.
З вянкамі і кветкамі ціха
да мёртвых герояў ідзём.

Здаецца, я чую іх голас
з апошніх прыстанкаў зялёных:
«А як там гадуюцца ўнукі,
ці помняць хоць нашы імёны?»

Стаяць у страі дом ля дома,
нібыта баец ля байца,
На вуліцы Варвашэні,
на вуліцы Казінца.

На вуліцы светлай Казлова,
на вуліцы Веры Харужай
Па вашых святых запаветах
жывуць працавіта і дружна.

1975

БЕЛАЕ ВОЗЕРА

Вы былі на Белым возеры ці не?
Не былі?
Дык не кампанія вы мне.

Вам бы ўсё на поўдзень, на курорт,
Там і мора, там і горы,
І віно там першы сорт.

Так і трэба вам, адступнікам,
А нам
Сонца будзе, юшка будзе і сто грам.

Мажа, я сакрэт палескі выдаю:
Пра куточак запаветны зноў пяю.

Дзе імклівей Случ да Прыпяці бяжыць,
Недалёка дзіва белае ляжыць.

Ты ляжыш паміж высокіх берагоў,
Дзіва белае, а рыба — для багоў.

Маладзееш ад празрыстых ясных вод.
Ёсць малькі тут, ёсць і ясельны народ.

Ёсць дашкольнікі і школьнікі — усе
У сваёй адменнай рыбінай красе.

Ёсць адборныя цяжкія бугаі,
Плясне гэткі па вадзе — гудуць гаі...

Сосны стромкія глядзяцца у ваду,
Пэўна, раяцца, адвесці як бяду,

Бо навaліцца рыбацкая арда —
Стане чорнай наша белая вада...

Хоць і сам не гаспадар я тут, а госць,
Не на рыбу клічу вас — на прыгажосць.

Вы паедзеце?
Дык шлях на Салігорск.

Не паедзеце —
Нам з возерам не горш.

1975

7 Зак. 2000

* *

Кажуць: «Калі б давялося спачатку
Дарогу сваю прайсці — прайду».
А я не хачу зноў у курную хатку,
У цемру былую, бяду і нуду.

А я не хачу вяртацца да зрэб'я,
Да дзён лапцюжных, ваўчыных начэй.
Хачу быць радзіме сягоння патрэбным
І не збягу туды, дзе лягчэй.

Не нудны прарок я і не прапаведнік...
Ды сэрца трывожна гудзе: «Не маўчы».
Зямля наша — самы святы запаведнік,—
І трэба, як маці, яе берагчы.

1975

КРЫК СОЙКІ

Рыжаватая, чарнапёрая,
А на крылах — блакіт для красы...
Кожным летам ад тлуму і зморы я
Уцякаю ў твае лясы.

Ды заўсёды такі насцярожаны
Крык твой, сойка.
Птушыны гнеў.
Можа, мне тут хадзіць няможна?
Не крану я ні гнёздаў, ні дрэў.

Ты ахоўвай, што ахоўваеш.
Хто спакою табе не дае?
І яловыя, і альховыя,
І дубовыя — ўсе твае.

Што ж ты крыкам мяне сустракаеш?
Мы маглі б падружыцца, бадай.
Ці то ворагаў многа маеш?
Ці то мне пагражае бяда?

1975

ГНЕЎ І ЛІТАСЦЬ

Дабрадушны я
Альбо сярдзіты,
Весела бывае
Ці невесела —
Я штодня
Мяняю гнеў на літасць,—
То маё прызванне
І прафесія.

Пакаўзнецца
Нехта незнарок,
Наламае дроў
З малога розуму,
Будзе хай урок,
А не курок,
І не трэба
Прыгавору грознага.

Прагнасць,
Зайздрасць
Ненавісны мне,
Колькі імі
Душ людскіх знявечана.
Я змякчу прысуд,
Калі на дне
Нешта засталося чалавечае.

П'янае дзікунства
І паклёп,
Гвалтаванне,
Цёмнае грабежніцтва,
Падхалімства подлае
Ўзахлёб —
Ім заўсёды
Кара непазбежная.

1975

ПАЭЗІЯ

1

Абывацель гавора,
А нехта ўжо ў паніцы:
Паэты — фантазёры,
Пустазвоны і п'яніцы.

Паэты — эгаісты,
Да славы раўнівыя.
А як жа загаіцца
Сэрцу ранімаму?

Кажуць, непатрэбшчына —
Рыфмы нават геніяў.
А што рабіць з трэшчынай?
Помніце? Гейнэ.

А што ваша маці спявала,
Калі вас калыхала:
Дысертацыі, рэфераты?
Былі вы песеньцы рады.

Народ — пясняр, народ — паэт.
Народ без паэзіі? Недарэчнасць.
Паэзія — самы няўлоўны сакрэт,
Які не будзе нікім рассакрэчаны.

2

Паэзія — гэта пакута і радасць,
Праклён і бязлітаснасць, споведзь і гордасць,
Вогненны сцяг над барыкадай,
Цішыня травы і рыканне горада;

Гэта вар'яцтва і гэта мудрасць,
Розум і ачышчэнне;
Плаванне ў рэках бурлівых і мутных
І зоркі далёкай свячэнне;

Гэта чаканне каханай дзяўчыны
Сцюжы і здрадзе наперакор;
Гэта душы найвышэйшая шчыльнасць
І задыханне, разрэджанасць гор;

Гэта трывога за касманаўта
І ручаіны жаночых рук;
Чыстая, з самага донца праўда,
Сэрца дзіцячага здзіўлены стук;

Гэта ныранне ў прасторы марскія,
Гэта палёты ў заўтрашні век.
Гэта здабыткі і мары людскія,
Крыўды і страты твае, чалавек;

Цень трапяткі ад абеліска
Каля дарогі пад чорнай сасной;
Матчыны вочы над першай калыскай,
Матчыны вочы над першай труной;

Вера у шчасце, з няпраўдай змаганне,
Чорнае неба і сонца ў расе;
Гэта спрадвечныя нашы пытанні,
Гэта адказы, ды толькі не ўсе...

Вось і блукай апантаны па лесе,
Як і твой прадзед калісьці блукаў...

Каб жа я знаў, што такое паэзія,
Гэтыя б вершы не напісаў.

1975

НА СХІЛЕ ВЕКУ

Цеснавата стала на зямлі.
Мы жывём цяпер на схіле веку.
Два тысячагоддзі, тры нулі
Падплываюць не па ціхіх рэках.

І такая ў свеце мітусня...
Балбатні не веру, хоць зарэжце,
Дзе жывая праўда, дзе хлусня,
Справядлівасць дзе — ледзь разбярэшся.

Дзе старая хітрасць, дзе прагрэс,
Дзе тут новы цуд, а дзе найноўшы...
Толькі грукат хуткасці — і стрэс,
Толькі ўсё цяжэй людская ношка.

Дзе там па-старому б'юць людзей,
Дзе катуюць на узроўні веку?
І няма прыпынку.
І радзей
Радасць ахінае чалавека.

Дзе знайсці без стронцыю і без
Хімікатаў трохі людскай ежы?
І шукаюць запаведны лес
Мудрыя асілкі з Белавежы.

Бруд вякоў і ліўням цяжка змыць...
Любім мы на саначках катацца.
Прагнуць свет машыны задыміць,
За усе вякі нагрукатацца.

На планеце ўсё ўжо ў нас было,
І ахвяры ўсе мы падлічылі.
Раптам новым болем загуло
Слова акрываўленае — Чылі.

Дык пастой, падумай, памаўчы:
Зло знікае цяжка і марудна...
І на схіле веку уначы
Б'юць званы трывожныя Нэруды.

1975

ОДА ПЕШАХОДУ

Без дачы, без аўтамабіля
Жыццё пражыў.
І дай мне бог
Астатнія адмерадь мілі
Пры дапамозе ўласных ног.

Ідзеш, знаёмых сустракаеш,
З табой усе турботы дня.
Жывеш, працуеш, адчуваеш,
Што землякам ты ўсім радня.

А што ў машыне? Мільгаценне...
Лятуць сады, дамы, гаі,
Снуюць у шкле людскія цені...
А вечны страх перад ГАІ?

Сустрэў знаёмых выпадкова,
Гулі гадзіну іх басы
Пра «Запарожац» нейкі новы,
Пра гаражы ды тармазы.

Пытаюся: ну як унукі?
Не разумеюць ні мур-мур.
Адзін другому ціснуць рукі:
І так, заклёпана. Ажур.

Таемнае людское шчасце:
Не спіць, худнее і дрыжыць,
За дэфіцытныя запчасткі
Гатоў ён жонку залажыць.

Да вандраванняў не пагасла
Мая любоў... Але цяпер
Не сяду нават на Пегаса,
Ён шмат бяды перацярпеў.

А лепей з моладдзю ў паходы
На рэкі, у лясы, сады.
Няхай зайздросцяць пешаходам
Аўтамабільныя зады.

1975

МАСТАДОНТ

У яго жалезны кожны тэзіс
І цытат жалезных грозны звон.
І чаго, чаго ў навуку лезе
Гэты мастадонт?

Выбівае п'едэстал з-пад Ніцшэ,
Шпенглера лупцуе, аж касее,
А на кожнай вузенькай спаднічцы
Вочы сее.

Цёмны ідал, кнырысты і дужы,
Што яму да ісціны жывой!
Ён стагоддзяў мудрасць тупа душыць,
І бяднееш ты, сучаснік мой.

Толькі ён сябе не лічыць лішнім,
На цытатным корме раздабрэў.
Дзе тут дыялектыка?
Калі ж ён
Грукнецца, загнецца, адамрэ?

1975

ГАЛЬШТУК

Ён крыху запэцканы чарнілам,
Не святочны — змяты і стары.
Мне яго дзяўчынка падарыла
У спякотнай шчодрай Бухары.

Там ішло усё па рытуалу,
Ну а плошча шчырасцю гула.
Ты ўбаку маленькая стаяла,
Ростам ты па сэрца мне была.

Не ўзялі цябе у строй парадны,
Можа, з-за адзнак ці нейкіх бед.
Толькі бачыў: сапраўды ты рада,
Госці падабаюцца табе.

Я знарок з галоўнай сцежкі збочыў
Непрыкметна і не напаказ.
Божа мой, якім прызнаннем вочы
У малой заззялі мне ў адказ...

Успаміны я перабіраю,
Свецяць вачаняты мне здалёк.
І часцей цяпер я пазіраю
На дзяцей, адціснутых убок.

1975

* *

Шумяць планавікі і прагназісты,
Жыццё будуюць мудра ў галаве.
А час імчыцца
З грукатам і свістам,
Прагнозы часам
На хаду ірве.

Ён зменлівы, наш час,
Такі гарачы!
Не слухае драздоў,
Не ходзіць па расе.
Над чым смяяліся —
Над тым сягоння плачуць,
Над чым мы плакалі —
Смяюцца ледзь не ўсе...

Вучыцеся лічыць!
Пры чым тут росы?
Інакшы тэмп,
Інакшы песняў тон.
Паміж зямлёю
І нагою босай —
Метал і гума,
Пласцік і бетон...

Усе плануюць:
Так і гэтак будзе,
Не за гарамі поўны росквіт наш.
Мы верым.
Толькі ёсць такія людзі,
Што думаюць інакш,
Ды і жывуць інакш.

З жыццём народа
Не шукаюць элітнасці,
Ім цэласнасці нашай не стае.
І псеўданавуковай
Шмат элітнасці,
І многа ўяўнай працы
На стале.

Я не заву
Дзве змены запар выстаяць.
Устурбаваны чэрствасцю,
Пішу
Пра тых,
Што набылі душу дваістую,
Прыстасаванцаў
Коўзкую душу.

Пішу пра тых я,
Што сумленне страцілі
І спачуванне людзям
Назаўжды;
Забылі,
Што бацькі калісьці радзілі
Ім пасля той
Ваеннай злыбяды.

1975

* *

Яму пад шэсцьдзесят, і часта ён цяпер
Сутуліцца, нібы пад мехам зерня.
Ні дробязным не стаў ён, ні мізэрным,
Хоць шмат абраз і крыўдаў ён сцярпеў.

Хвалёнай ціхай мудрасці няма
І не павінна быць, калі ты жыў як трэба,
Больш на зямлю глядзеў, а не на неба,
І ўсё да сэрца горача прымаў.

Пра старасць не павінна вершаў быць,
Яе прытулак у суровай прозе.
А старасць ўсё бліжэй,
Яна ўжо на парозе.
Дык што ж, утаймавацца ці завыць?

А замыслаў яшчэ на тры жыцці,
І сонца добрае яшчэ ласкава свеціць,
Ды дзьмухае эпохі жорсткі вецер,
І трэба не спыняцца, а ісці.

Спакойна дажываць — яму не райцэ:
Ён працаваў да стомы кожны дзень.
З астатніх сіл наперад ён ідзе,
Ён каля выхада...
Цішэй, не напірайце.

1975

* *

Яшчэ адзін шумлівы год прайшоў —
Адна прыступка на кароткай лесвіцы.
Я пастарэў на тысячу дажджоў,
Памаладзеў на тры вясновых месяцы.

Пісаў, чытаў, па свеце вандраваў,
То цешыўся драбніцай, то злаваўся;
Сто лепшых дзён бязглузда засядаў
І з масаю пісьменніцкай зліваўся.

Зліваццца трэба з радасцю людской,
З турботамі жыцця і з чалавечым горам.
Хай мой такі нялёгкі неспакой
Вядзе мяне па ўсіх кутках да зморы.

І стане мілым кожны снегапад,
На ўсё зірну я з большаю прыязнасцю
І кожнаму дажджу заўсёды буду рад:
За ім ідуць дні цеплыні і яснасці.

1975

* *

Усемагутная эстрада,
Для моладзі ты цар і бог.
А для мяне ты ўжо не радасць,
Я ад цябе крыху знямог.

І я журыўся і смяяўся,
Калі спявалі «Песняры»
І пра Алесю, і пра Яся,
Пра тры дарожанькі ў бары.

Але найшла на сцэну пошасць,
І з мікрафонам у руках
Крыўляецца і скача пошласць...

Дзе зніклі вы, грымотны Бах,
І шчодры зорны Шастаковіч,
І дзіўны сонечны Равель?

Скажыце, што гэта такое,
Адзін сіпіць, другі раве
Нібы пра нас, а дапатопна:
То рэха шлягераў чужых —
І аднастайна, і падобна,
І пачынае мучыць слых.

Іх сёння тысячы — нахабных
Кляпальшчыкаў халтурных нот
І тэкстаў,
Ім бы толькі хапнуць
Ды мікрафон знайсці, ды рот...

А мы былі ўпартыя,
Спявалі песні, вартыя
Салдат і партызан:
Мы маладая гвардыя
Рабочых і сялян!

1975

* *

Даверлівая прастадушнасць,
Знікай — табе кажу цяпер.
Я вызваляюся ад дружбы
І ад падманлівых папер.

Былы мой друг зрабіўся жмотам,
Прыварак чэрпае густы.
Ірву яго старыя фота,
Палю няшчырыя лісты.

Не гіне род майстроў нажывы...
А я малюся аб адным:
Не дай мне, божа, стаць ілжывым,
Зайздросным, злосным і старым.

1975

* * *

Самападман — такі занятак,
Што ён жыве ўжо шмат вякоў...
Мы перабольшваем занадта
Свае нянавісць і любоў;

Свае імкненні, дружбу, шчодрасць,
Свае бадзёрасць і тугу;
І светласць нечую, і чорнасць,
І цішыню, і грозны гул.

Свет, ён пявучы і хрыпучы,
Ён і брудней, ён і святлей.
І смех маіх малых унучак
Бывае мне за ўсё важней.

Спазнаў, гадáмі перацёрты,
Жыццё — работа, не парад;
Яно прыцісне — і пяцёрцы,
Кавалку хлеба будзеш рад.

І недарэмна мне ён сніўся,
Той некрыклівы чалавек,
Што раўнадушна не прабег,
Каля бяды маёй спыніўся.

Я не зарыўся, не схаваўся,
А проста збег ад мітусні.
Я ад абстракцый адцураўся,
Ад непатрэбнай балбатні.

Бясконцых спрэчак недарэчнасць...
Лепш да людскіх, звычайных спраў,
Каб ажыла ізноў спрадвечнасць
Вады і хлеба, дрэў і траў.

1975

ЯБЛЫКІ

Ёсць пытанне ці няма пытання? —
Формула кіруючых мужчын.
Ад напору яблык на світанні
Пахіснуўся наш палескі тын.

Папацелі садаводы трошкі:
Яблыні — агульная любоў.
Падстрыгалі іх, бялілі ножкі,
Апраналі ў кажушкі з кулёў.

Урадзіла сёлета не скупа
Белых, бурштыновых, залатых.
І плыве ўначы пад зорны купал
Смачны пах садоў, як мёд густы.

Як жа гэтым яблыням цудоўным
Да сталіцы рукі дацягнуць?
Яблыкі галлё у дугі гнуць,
Іх — куды ні глянь — усюды поўна.

Хрубастаць іх будуць не мінчане,
Над ападам горбіцца наш сад.
Тут кароў салодкае мычанне,
Яблачнае свята ў парасят.

Самазвалы на прасёлках грузнуць.
Восень.
На зямлі і ў небе муць.
А па Чорным моры сухагрузы
Яблыкі заморскія вязуць.

Звар'яцелы вецер свішча рэзка,
Недзе ціха тупае зіма.
Хочацца антонаўкі палескай...
Ёсць, сябры, пытанне ці няма?

1975

ЗЯЛЁНАЕ ГНЯЗДО

Неўладкаваны чалавечы дом,
Жывая кропля чорнага сусвету —
Зямля мая,
Зялёнае гняздо,
Адкуль вылётваюць
І птушкі, і ракеты.

Тут акіяны звоняць у званы
І дзьмухаюць вятры на пыл пустыняў.
Ды стала гнёздаў менш пасля вайны,
І пушчы не такія ўжо густыя.

Ў зямным гняздзе —
Мільярды розных схоў
У небаскробах,
На мікробных пашах,
І ластаўкі —
Пад кожнаю страхой,
І пчолы ў вуллях —
На выгодзе пасек.

Разбураныя гнёзды і дамы —
То боль зямлі
І горкі плач сіроцкі.
Жыць і рабіць у шчасці можам мы,
Хоць і прыйшлі ў свет гэты
Без сарочкі.

Мы пасажыры і праваднікі
У рэйсах калясонечных
Транзітных.
І вецер вандраванняў нам вякі
Пяе адно і тое ж,
Як транзістар.

Напэўна, нам шанцуе на святло
Ў Галактыцы...
Дык гнёзды рамантуйце
І сейце жыта,
Праганяйце зло
І пра зямную смерць не лямантуйце.

1976

* *

То ў надзеях, то ў скрусе
Безаглядна жывеш.
Нібы конь той, па крузе
Ўсё ідзеш і ідзеш.

Іншы раз ірванешся —
Па гаючы глыток
Паляціш.
Спадзяешся:
Будзе новы віток.

Спадзяешся і верыш,
Што наперадзе ёсць
І паэзіі неруш,
І сама маладосць.

Мы штодня сабе хлусім...
Ну, а ісціна дзе ж?
Нібы конь той, па крузе
Ўсё ідзеш і ідзеш.

Дні імчацца імкліва,
Не шкадуючы сіл,
За апошні маўклівы
Свой зямны небасхіл.

Я не веру у цуды,
І туга не грызе...
Я развеяны ўсюды
Па шматку, па слязе.

На дарозе суровай
Недзе там, за табой,
І ласкавыя словы,
І пякучы мой боль.

Было шчасця не многа.
Больш агонь ды бяда...
Не шкада мне нічога?
Усяго мне шкада.

1976

* *

Я люблю чырвоны колер цэглы,
Даўнія цагляныя муры.
Я люблю старых заводаў цэхі
У святле рабінавай зары.

То жыцця найпрыгажэйшы колер,
Як і хараство лясоў і ніў.
І вучыўся я ў цаглянай школе
І нямала гліны памясіў.

Хай звініць яна спрадвечным звонам
На будоўлі ў наш бетонны час...
І сцяна Крамля, як сцяг чырвоны,
І музей чырвоны Ільіча.

1976

ХЛЕБНЫЯ СЛОВЫ

Адценне слоў — не глупства,
Ты ім не пагарджай.
Скарынка. Скіба. Луста.
Акраец. Каравай.

Акраец — шлях, дарога
І зайцаў хлеб лясны.
Скарынка — сум, трывога
І боль былой вайны.

Здараецца, вядома,
Што, выпіўшы ў гасцях,
Грызе скарынку дома
Пахмурны халасцяк.

А скіба — дзень вясновы.
Ралля. Плугі. Сяўба.
Наш хлеб — жыцця аснова,
Працяг і барацьба.

А луста — слова сытнае,
Духмянае і шчодрае.
Яно ад маці — сітнае
Ці наздравата-чорнае.

А каравай — вясельнае,
Святочнае яно.
На ручніку нясе яно
І радасць, і віно.

І справа тут не ў ежы,
А ў смачным змесце слоў,
І ў жытнім ветры свежым,
І ў звоне каласоў...

1976

ПАЛЁТ НА ПАЛЕССЕ

Тут не агледзіш усё да канца...
На верталёце паўсутак нас трэсла.
Ад Салігорска да Лунінца,
Ад Мазыра і да самага Брэста.

Што за прасторы!
Дзе некалі ў копы
Капаў слязою аўсяны паэт,
Вежы сянажныя,
Як тэлескопы,
Горда глядзяць
І на нас і ў сусвет.

На паўзямлі —
Дрыгвяная туга
Ды паляшуцкая ціхая мудрасць.
Багны Палесся —
Гэта тайга
З прымессю цёплай тундры.

Багны —
Бязлітасны акіян,
Глынуць —
не ўратуе ні «SOS», ні «Мама».
Балоты вясною —
Сцюдзёны вулкан:
Усё заліваюць
Іржавай магмай.

Зніжаецца
З грукатам
Наш верталёт,
Пыл разлятаецца рыжаваты.
Пара машын,
Мясцовы народ.
На дошцы — схемы і карты.

Знаюць на памяць лічбы усе,
Дзе асушаць ім,
А дзе ўжо асушана.

Думаў:
Буслам не хадзіць па расе,
Думаў:
Балоты на гібель асуджаны.

І памыліўся.
А вочы ўсё ўніз:
Дробных азёраў блакітная нізка,
Новы пасёлак.
Саўгас «Камуніст» —
Быццам кавалак
Сталічнага Мінска.

Зноў прызямляемся.
Зноўку ляцім.
Першы раз бачу цябе падрабязна,
Край наш палескі,
Сіні твой дым,
Дзень твой наступны бачу выразна.

Свеціцца ён у разумных вачах
Меліяратараў, інжынераў.
Тут не забудуцца і аб буслах:
Я назаўсёды ў Палессе паверыў.

1976

КАМСАМОЛЕЦ З РАСОНШЧЫНЫ

Везлі камсамольца у Нямеччыну,
Задыхаўся ад людзей вагон.
Твары ўсе бядою пакамечаны
Ў землякоў,
Ды толькі не ў яго.

Ён рашыў:
Ці куля, ці змаганне.
Толькі б гэта людзям зразумець...
Сціснуліся...
Не чутно дыхання...
У акенца ён палез па смерць.

А дарога гнала ўдаль вагоны
І жалезным плачам аж гула.
Пачарнела ўся зямля ад стогну,
А яму загінуць не дала.

Ён, разбіты, ледзь не паламаны,
Сцяўшы зубы, вецер волі піў.
А з нябёсаў зорка палымяная
Хлопцу ўсё шаптала: «Пацярпі...»

Будзе цяжка, будзе вельмі горка,
Будзе па-геройску злыдняў біць.
І з нябёсаў родных тая зорка
Будзе ўсё жыццё яму свяціць.

1976

НА ВЫСТАЎЦЫ АРКАДЗЯ ПЛАСТАВА

Сягоння ля Манежа
Натоўп людзей густы...
Не думай
аб манеры,
Не развыжай
пра стыль.

Уся як ёсць Расія
Сюды
да нас прыйшла:
Арала і касіла,
Спявала, галасіла,
Змагалася, жыла.

Тут свет,
здаровы, росны,
У сіле спелых ніў,
У сенажацях, соснах
Мяне запаланіў.

Усё дайшло да сэрца:
Лясная цішыня,
Жанчына ў лазні сельскай —
Зямная чысціня;

І грузавік, набіты
Людзьмі святочным днём;
І пастушок, забіты
Фашысцкім груганом.

Тут прастата і мудрасць,
Сялянскай працы пот,
Жыцця святло і мутнасць
І зморшчыны турбот.

З вачэй суровых, сініх
Дапытліва на нас
Глядзіць уся Расія
Праўдзіва,
без прыкрас.

Нам у душу ўлілося
Праз геній мастака
Жытнёвае калоссе,
Туман каля стаўка,

Прасторы даляў росных,
Зямлі сваёй пласты,
Сусвет, Радзіма, розум,
Жыцця настой густы.

1976

* *

Ноч канае ў цёмным завуголлі,
Слуп барвовы сонца устае.
І бягуць насустрач за вагонам
Сосны беларускія мае.

У купэ, дзе шмат людзей бывала,
Дзіўны сон мне сніўся ў гэту ноч:
Нібы ў доме ўсё маім прапала,
Толькі стол пусты
І нейкі нож.

Я з нажом даўно ўжо не дурэю,
На руцэ ад ручкі мазалі...
Што за знак той дом пусты?
Старэю...
А зрабіў так мала на зямлі.

Мне цяпер часцей маленства сніцца,
То лясы Бягомля,
То стагі...
Не паеду болей за граніцу:
Сэрца разарвецца ад тугі.

1976

ДОМ ТВОРЧАСЦІ

Не на узрыхленай дзялянцы,
Не на курорце распісным —
Пішу на сонечнай палянцы
У доме творчасці лясным.

Жыву у цэнтры шчабятання
Мільёнаў птушак на зары,
Сярод будзённых прывітанняў
І сапылятай дзетвары,

Між добрых баб,
Крыху занудных
У дні залётных халадоў;
Паміж старых яўрэяў мудрых,
Паміж затурканых удоў.

Блукаю па ласіных сцежках,
З трыма сабакамі дружу.
У браніраваных адзежках
Садзіцца на паперу жук.

Тут хіпаватыя ялінкі
На мох страсаюць росны звон.
Падсоўвае транзістар Глінку,
А дзеці ў крык:
— Няхай Кабзон!

Альбо Вуячыч ці Ратару.
Не супярэчу.
Сам люблю.
Праз соснаў чуйныя радары
Навіны лесу ўсе лаўлю.

Я не ідылію шукаю,
І тут, паміж дубоў і хвой,
Жыццё з усіх бакоў гукае
І выклікае неспакой.

Калі ж размякну я ад шчасця,
Пісаць пачну пра ціш ды ноч,
Рабіна нахлусіць не дасць мне,
Сучком пастукае ў акно.

1976

ВЯЧЭРНІ ЦЯГНІК

Вочы абганяюць сэрца,
Сэрца абганяе думку,
Думку нараджае цішыня...

Можа, ўсё як-небудзь утрасецца,
Нібы рэчы у паходным клумку,—
Спадзяюся я на схіле дня.

Бо калі няма цябе — пустэча.
І чаканне — рэшта немалая
З голасу твайго, што недзе знік.

Вось таму так прагну я сустрэчы.
На пероне кожны дзень чакаю
Я цябе, вячэрні мой цягнік.

Можа, ты, вячэрні мой, нічога
Мне не прынясеш.
Я зразумею,
Ды змірыцца з гэтым не гатоў.

Можа, не сустрэну я нікога,
Можа, ад вагонаў і павее
Толькі пахам жнівеньскіх садоў.

1976

* *

Учора сэрца сціснула мне жалем,
Хоць звыкся з плачам і сірот, і ўдоў...
Між кветак душных у труне ляжала
Дзяўчынка васемнаццаці гадоў...

Бяры старых распуснік, цісні грудай,
Хапай бандзюг, бязносая карга.
А ты бярэш і маладых, і мудрых.
Ці, можа, пераблытана чарга?

Прырода, ты габлюеш слепа дошкі,
Абкрадваеш сябе ты і людзей.
Гагарын, Каралёў, Ландау, Твардоўскі
Былі на ўскрайку залатых падзей.

Прырода-маці, мы твая часцінка,
Ты нас да чалавечнасці ўзняла,
Расплаў ты абыякасці ільдзінкі,
Займей сумленне, што ты нам дала.

1976

* *

Зялёны Мінск, стары твой сад пасекла
Вайна, але ў адным двары сустрэў
Я выхадцаў з распаленага пекла —
Старыя купы даваенных дрэў.

Яны жывуць, і шалясцяць, і свецяць,
Іх цёмная кара ўсмактала горкі дым.
І хочуць расказаць яны пра нешта дзецям,
Але не зразумець іх боль малым.

Іду штодня пад вадаспады лісця
Птушыную паслухаць талаку;
Ды абыходжу дрэва, што калісьці
Падпольшчыка хістала на суку.

1976

* *

Рэкі не вяртаюцца, як кажуць,
Медзякі старыя не блішчаць...
Захацелася ізноў салдацкай кашы,
Франтавога добрага баршча.

Захацелася ізноў той непагоды
І сухога брацкага пайка...
Глінаю запэцканы, ды горды,
У рэдакцыю вярнуўся я з палка.

І сябры мяне сустрэлі ветла:
Два гады мы разам на вайне.
Сам маёр з біклагі запаветнай —
Хоць скупы — наліў паўшклянкі мне.

Закушу...
А там на пні сасновым —
Мой блакнот ды шолах вецярка.
Я ўначы праз дрот — за словам слова —
З хлопцамі пайду па «языка».

1976

8 Зак. 2000

ЗАМІНІРАВАНЫ ЛЕС

Недзе ад Дуброўны недалёка
З логікаю мудраю ўразрэз
Ёсць адзіны ў нас з бядой нялёгкай
Цёмны замініраваны лес.

Быццам абмінула перамога
Гэты лес, такі стары, стары.
Парасла вайна касматым мохам,
Пісягоў не бачна на кары.

Не прайшлі сапёры тут спачатку,
Не прайшлі сапёры тут пасля.
І нашпігавана ўся ўзрыўчаткай
Ды іржавым страхам тут зямля.

Што там драцяная агароджа!
Разбамбіць бы — і канец бядзе,
Ды шкада: хоць страшны, а прыгожы,
Можа, хто парадак навядзе.

Тут нямецкіх пастак шмат і нашых
Самаробных мін і завадскіх.
Навакол малых тым лесам страшаць
З лесу прыкульгаўшыя дзядзькі.

Хлапчукі на дрэвы тут не лазяць,
Вось бы ім заўсёды памяць мець,
Бо з карэннем тут пераплялася
Даўняя затоеная смерць.

А калі барсук альбо куніца
Зблытаюць знаёмыя шляхі,
Грымне выбух, бліснe бліскавіца,
Пошчакам пракоціцца глухім.

І замлее сэрца ў маці кожнай,
Цяжка партызан сівы ўздыхне...
Час мой, асцярожны і трывожны,
Колькі лес той будзе на вайне?

1976

* *

Пажыць да дна — і кропка, годзе.
У чым жа справа?
Усё запознена прыходзіць:
Набытак, слава.

Той славы з макавае зерне,
На грош набытку.
А маладосць ужо не вернеш,
Хіба што ў спытку,

Дзе ты пракладваеш сцежкі
Зноў у былое.
А на цябе глядзіць з насмешкай
Жыццё жывое.

А што яму да успамінаў,
Да спавяданняў,
Што праляцелі недзе міма
Спадзяванні.

Ты добра жыў.
Чаго смуткуеш?
Не вер жэньшэню.
Жыццё працуе і святкуе
І моладзь жэніць.

Ляціць яно па зорных трасах
І зырка свеціць.
Мы не прыгодны ў суддзі часу:
Яго мы дзеці.

Рук не шкадуючы, рабілі,
Жылі як людзі.
І не прасі, каб не забылі,
Лепш без ілюзій.

Глядзі без зайздрасці, як дорыць
Дзяўчатам кветкі.
Спраў маладым няма да гора...
Ты сам быў гэткі.

1976

КАШТАНЫ

Барысу Алейніку

Штодня выхваляцца не стану,
Ды з радасцю ўспомніць гатоў:
З Барысам садзілі каштаны
Мы ў Мінску на свяце братоў.

Мы рады былі пастарацца:
Глядзелі на кожны каштан
І мудрыя вочы Тараса,
І добрыя вочы мінчан.

І справа не ў нас тут, вядома,
І ўсё-такі, дружа, павер,
Прыемна вяртацца дадому
Праз сонечны Кіеўскі сквер.

Заўсёды з табой і са мною
Святло чалавечых вачэй,
Штогод ад якога вясною
Каштаны палаюць ярчэй.

1976

* *

Мне бацька не пакінуў роднай хаты,
Ні высланы снапамі гулкі ток,
Куды прыходзіў зімнім днём сахаты
Паскубці сена ды пацерці бок.

І кожны дзень
Даваўся нам не дзешава,
Гняла бядой вайна
Маіх старых.
З магіл бацькоў прынёс я на падэшвах
Адзін пясок,
Адзін пясок сыры...

Прабачце, археолагі:
Не надта
Музейную люблю я старызну.
Я у казармах жыў
І ў інтэрнатах
І ў дваццаць тры
Урэзаўся ў вайну.

Мяне расцілі не тэатраў драмы —
Трагедыі жыцця...
Мяне мой Мінск
Заўжды,
Засыпаны ліствою і вятрамі,
Хоць ненадоўга
Робіць маладым.

Мы творым горад,
Горад нас стварае,
Люблю яго
Шматфарбны гул і спеў.
І часта з асалодай паўтараю:
Наш горад,
Наша школа,
Наш праспект.

І тлум люблю падземных пераходаў,
І новы дом рукой хачу крануць.
Глытаю пах сваіх хлебазаводаў
І толькі пах бензінавы кляпу.

1976

ГОРАД

Кожны дом характар мае,
Таямніцы — кожны двор.
Той — балкон свой выстаўляе,
Нібы сківіцу баксёр.

Той — будынак-расплывуха,
Дзе там вокны, дзе ўваход?
Той глядзіць нахабным зухам
На архітэктурны зброд.

Той слановыя калоны
У зямлю навечна ўбіў...
Недагледжаныя клёны
Лістапад абцерабіў.

Недаробкі, непаладкі
Мае ледзь не кожны дом.
Неістотныя ападкі
Густа сыплюцца на дол.

Ды ўстае другі ўрачыста
Над паспешнасцю былой
Новы горад.
Ён празрысты,
З нетутэйшаю красой.

І, захоплены уласным
Харaством, не помніць ён,
Што пад ім, нібы пад прасам,
Кроў, пакута і праклён.

Што пад ім і продкаў косці,
І кальчугі, і шчыты...
Да гісторыі у госці
Заўтра сам паедзеш ты.

Праімчыцца, пранясецца
Ў лабірынце дробных рэк,
Праз дванаццаты праб'ецца
І праз пяты нават век

З рэактыўным завываннем
Наша мінскае метро...
А цяпер машын рыканне
Ды асенні гул вятроў.

Я хаджу, гляджу без стомы,
Што было — не адгадаць.
Ад майго былога дома
Ценю нават не відаць.

Між святла, рэклам, туману
Не магу знайсці той рог,
Дзе калісьці я з каханай
Поўнач мінскую сцярог.

1976

БОЛЬ СЕРБІІ

Шумадзія — сэрца Сербіі
І боль яе невыносны.
Нізіны — таполі срэбныя,
Горы — чорныя сосны.

Але чарнейшы за дрэвы
Быў дзень,
Як стралялі дзяцей...
Народная памяць не дрэмле,
Яна ўсё ясней і чысцей.

Хацелі бацькоў запалохаць,
Забралі са школы малых.
Вялі іх між гор
Сінім логам,
Дзе восені пах і смалы.

Спакойна ішлі пяцікласнікі
На гібель,
На верную смерць...
У хмарныя дні і ў ясныя
Бяссмерцю тут вечна гарэць.

Назаўтра усе цыганяты —
Чысцільшчыкі ботаў чужых —
Пакінулі звычны занятак
У чэсць аднагодкаў сваіх.

Не чысціць забойцаў,
Не чысціць!
Закідаць гразёй гэту дрэнь.
І брудныя боты фашыстаў
Былі у крыві цэлы дзень.

І вось наляцела расплата:
Паблізу ад сербскіх сяброў
Адважныя цыганяты
Палеглі ў скрываўлены роў.

Літасці не прасілі,
Ворагам слалі праклён...

Дэсанка,
Дэсанка Максімавіч,
Паклон Вам,
Нізкі паклон!

Не знаю, ці ўдасца нам стрэцільца
Ізноўку ля Савы-ракі.
Агнём незгасаючым свецяцца
На помніках Вашы радкі.

Штогод пачынаюць званкамі
Тут Школьны Вялікі Урок.
А людзі з вянкамі, з вянкамі
Сцішаюць жалобны крок.

А полымя ружаў і макаў
На ўсіх кантынентах відно.
І я над магіламі плакаў
І піў з цыганамі віно...

Мы памяці мёртвых не здрадзілі,
Навечна спляліся яны —
Званочкі журботнай Шумадзіі
І нашай Хатыні званы.

1976

СЯСТРА ДЗЯРЖЫНСКАГА

Да помніка яго вялікай славы
Ў дзень нараджэння Фелікса
Штогод
Яна ішла цераз усю Варшаву
З гваздзікамі
У пешы свой паход.

Жалезны Фелікс...
Для яе жывы ён.
Праходзіла сястра ізноў, ізноў
Усе яго дарогі агнявыя,
Усю яго і ласку, і любоў.

З Дзяржынава,
Збяднелага фальварка,
Ішла яна праз беларускі бор
Ад першага турэмнага агарка
Аж да святла чырванасцяжных зор.

Любіць умела,
Не умела плакаць;
Як ён,
Для рэвалюцыі жыла...
Здымалі шапкі з гордасцю палякі,
Калі яна
З гваздзікамі ішла.

1976

* *

Як позна ліпы сёлета цвітуць:
Было так доўга холадна і хмарна.
На жоўтых крыльцах зерняты лятуць
І шэрыя фарбуюць тратуары.

А я прыпомніў паваенны час:
Жылі ў скляпах, зямлянках і руінах,
Душыў нас папялішчаў горкі чад,
І марылі мы ўсе пра зеляніну.

Вайна у сэрцах будзе доўга тлець...
Згадзіліся мінчане пацярпець
І мудрых тых людзей не асудзілі,
Што першым чынам ліпы пасадзілі.

1976

* *

Ну, вось табе твой бор, твой верас,
Пах багуну з лясных балот.
І ты яшчэ наіўна верыш,
Што ў лесе ўсё, як і было:

Зеленаватае свячэнне,
Смаліста-ягадны настой,
Над дзеразой дымок вячэрні...
Твой бор стаіць,
І ты пастой.

Да дуба моўчкі прыхіліся
І паглядзі ў лясны ручай.
На дзень мінулы не маліся,
Усё спакойна прыкмячай:

Другія птушкі, дрэвы, травы,
Цябе не ведаюць яны.
Ідзі налева ці направа —
Не знойдзеш край сваёй вясны.

Цяжкая ноч твой бор накрые,
Схавае птушак у галлі...
І толькі тры сасны старыя
Цябе пазналі, загулі.

1976

ЗБАНЫ

А нашы ганчары умелі
Рабіць і міскі, і збаны.
Пад матчынай рукой звінелі
Штодня гліняныя званы.

Амаль на ўсіх малы узор быў —
Знак сарамлівай пекнаты.
У восем лыжак крупнік сёрбаць
Было так смачна з місак тых.

Быў геній наш далёкі родзіч,
Што форму вечную знайшоў:
Капелюшы сучасных модніц —
Ад тых гаршкоў і гладышоў...

Збаны — ў мастацкіх магазінах,
Іх зараз лепяць мастакі.
Ды цвет не той, не тая гліна,
Іх звон і выгляд не такі.

Стаяць на ўсіх сервантах марна,
І малака з іх нам не піць...
Паеду ў Івянец ганчарны,
Мо пашанцуе збан купіць.

1976

* *

Анатолю Вялюгіну

Помніш, друг, як гасцявалі
Ў нарачанскай старане?
Піравалі, начавалі
Пад грымоты у гумне.

Цэлы вечар клапатліва
Хлеб і сала кроіў нож...
Я люблю дажджы і ліўні,
А тады збіраўся дождж.

Соснаў цёмнае кіпенне,
Першых буйных кропляў стук,
А пасля дажджу шыпенне —
Першабытны слаўны гук.

Спалі мы на сенавале.
На духмянай той гары.
Там, дзе нас каранавалі
Пах лугоў і камары.

Мы пра ўсё вялі размову,
Чулі лесу кожны рух...
Пра азёрны край сасновы,
Дзе жыве наш добры друг,

Пра дзяўчатак нарачанскіх:
Ад красы іх не ўцячы...
А праз шчыліны маланкі
Нас хацелі апячы.

1976

СТАРЫМ ПАРТЫЗАНАМ

Таварышы партызаны,
Пабыць вам патрэбна ў баях.
Забудзьце на тыдзень пра раны,
Забудзьце пра старасці страх.

Выносьце са слаўных музеяў
Свае баявыя сцягі,
Выносьце сцягі у завеі,
Выносьце сцягі у снягі.

Хай пройдуць за вамі унукі
Маршрутамі доўгіх сцяжын —
Без вашай блакады і мукі,
Без куляў, гранатаў і мін.

Ім, юным, цяпер неабходна
Не святаў парадная медзь:
Ваш подзвіг
І вашы паходы,
Калі вы хадзілі
На смерць.

1976

* *

Мала сказаць: ненавіджу,
Мала сказаць: прызнаю.
Біцца за праўду — і выжыць,
Нібы салдат у баю.

Дрэннаму — не пакарыцца,
Добрае — не празяваць.
З дробнай хлуснёй не мірыцца,
З буйнай хлуснёй ваяваць.

Гэтым бы і кіравацца...
Толькі і зло, і хлусня
Хітра маскіравацца
Вучацца спрытна штодня.

Нехта і подлы, і хіжы
Клятву паўторыць тваю:
З ворагам біцца — і выжыць,
Нібы салдат у баю.

1976

ПЕНСІЯНЕРЫ

Нам з табой няма чаго спрачацца,
Мітусіцца, нібы кажаны.
Вып'ем па апошняй добрай чарцы
І закусім хлебам аржаным.

Ты маўчыш, дакладчык і выкладчык,
Заратустра ісцін прапісных?
Ну, вядома, мы яшчэ не клячы,
Толькі ўжо ў камандзе запасных.

Нам не жыць у санаторных сховах,
І, калі ўжо нельга піва піць,
Зрэжам па кійку сабе сухому,
Пойдзем бюракратаў зноў лупіць.

А калі яны зусім звяліся,
Будзем грушы ў садзе атрасаць,
А пасля штодня па дзесяць пісем
Адсылаць па розных адрасах.

Падамо заявы ў таварыства,
Дзе тытунь не смокчуць і не п'юць,
Дзе не ўмеюць нават пасварыцца,
Толькі дрэмлюць ды ў далоні б'юць.

Не для здзеку бог прыдумаў старасць,
Скардзіцца на лёс не нам з табой.
Дык давай закурым лепш, таварыш,
А пасля кульнём і па другой.

1976

* *

Сцякае дождж з далоняў светлых лесу,
Пажоўклы мох бясшумна п'е ваду.
Мне сёння ты патрэбна да зарэзу,
Дай толькі знак —
І ў момант я прыйду.

Вучуся век з людзьмі сумленна ладзіць...
Сячэ душу мне бліскавіц агонь,
І без папрокаў хочацца пагладзіць
Цяпер тваю шурпатую далонь.

1976

* *

Тані

Наніжы на нітачку каралі
З ягад падмарожаных рабін.
Слоўцам ні адным не дакараюць
За тваё жыццё дачка і сын.

Хай сабе там нешта не ўдалося,—
А па-чалавечы ты жыла...
У касу тваю і гэта восень
Срэбнай павуцінкі не ўпляла.

1976

* *

Рэлігіі прыдумалі старыя
У цемрадзі дагістарычных нор.
Баяліся: дачасна іх зарыюць
Суседзі згаладалыя з пячор.
Я не магу ўявіць тых краявідаў,
Пачуцці дзікіх продкаў зразумець,
Калі з'явіўся першы чорны ідал
І стаў гразіць:
Пакора альбо смерць.
Зрабіўся хітрым,
Пакарыў народы
І запалохаў маладую плоць.
У тых дзядоў
Быў свой маральны кодэкс:
На маладых накінулі аброць.
Страшней за ўсё непаслухмянасць юных,
Як набяруцца сілы —
Ўсё сажруць,
На бараду сівую гнеўна плюнуць
І баб найпрыгажэйшых адбяруць.
Пайшлі багі крывавыя лясамі,
Прыйшлі ў наш век
Праз тысячу вякоў...
Старыя бога вынайшлі
І самі
Паверылі са страхам у багоў.

1976

* *

Я заўсёды некуды спяшыў
І амаль ні з чым дамоў вяртаўся.
Нават з кар'ерыстамі дружыў,
З дурнямі так ветліва вітаўся.
Горача аб нечым гаварыў,
А пасля жахаўся:
«Гэта ж пошласць».
З другам добрай кашы не зварыў
І лічыў памылкаю апошняй.
Доўгая жыцця майго вярста,
Ёсць на ёй і ўзлёты, і падзенні.
Прарастаў,
І рос,
І вырастаў,
Ды не ўмеў насіць сваё адзенне.
Мне не ўцеха словы пра адноснасць
Спраў, падзей...
Паўторныя кругі
Поглядаў людскіх, світанняў росных,
Ісцін вечных, самых дарагіх...
Цёплыя сады ў салодкім дыме.
Сосны так спагадліва шумяць
Над магілай
І над маладымі,
Што ў траве, абняўшыся, ляжаць.

1976

* *

Гляджу я на азербайджанку,
Палошча яна бялізну.
Сонца далёкага ранку
Мяне нечакана пранізвае.

Бачыў аднойчы гвінейку,
Таўкла яна сорга ў ступе.
На успаміны нейкія
Сэрца азвалася стукам.

Спрадвечныя звычныя рухі,
Да болю знаёмыя жэсты.
Здаецца, вось гэтыя рукі
Кармілі мяне ў маленстве.

А вочы жаночыя свецяць
Усюды так мудра і добра:
Усе сялянкі на свеце
На маці маю падобны.

1976

* * *

Той напусціў туман,
Той жаласна парохкаў...
Люблю жыцця падман,
Люблю ілюзіі крохкасць.
Хоць супярэчу сам
Сабе —
то не апіска:
Сумую па лясах,
А ў лесе зноў па Мінску.
Нам з дому не ўцячы:
Навек мы гараджане,
Хоць часам уначы
Снім конскае іржанне.
З нас кожны следапыт,
Калі не так — няшчасце.
А заімглёны быт
Нам сонца можа засціць.
Бо калі вечна быць
Сухім рахункаводам,
Няцяжка і забыць
Пра поле, лес і воды...
Прабіліся расткі,
Свідруюць дол зярняты.
На клёне ўжо лісткі
Сядзяць, як птушаняты.
Зялёных птушанят
Вачмі гадуюць людзі.
Хлушу сабе, што страт
Вясною больш не будзе.
Чаго мне гараваць,
Што прыйдуць лістапады?
Люблю расшыфраваць
Вясною слова «Радасць»;
Злавіць у добры час
Святло зарніц трывожных
У маладых вачах
Жанчын, такіх прыгожых.

1976

* *

Пачынае з новага радка
Кожны год вясна свае адлігі.
Сонцам напаўняецца рака
І гайдае воблакі і крыгі.

Ты мяне хоць крыху пагайдай,
Маладосць за воблакі аддай.
Толькі знаю, што не аддасі,
Дык нясі у мора іх, нясі.

Тут я з той, харошаю, сядзеў,
На такія ж воблакі глядзеў,
Ды сплылі яны даўно з вадой
І забралі мілую з сабой.

1976

* *

Птушка ловіць дзень свой у палёце,
Дождж ільецца,
Падрастае лён.
Сонца ў агнявым кругазвароце
Лік вядзе
Сваіх спякотных дзён.

Толькі мы ў пакутным трапятанні
Марылі пра нейкі дзень удач,
Вырашалі вечныя пытанні,
А суседак не пачулі плач...

А цяпер, бывае, ў госці прыйдуць
Нечакана ў мой шумлівы дом —
Даўні боль,
Мае старыя крыўды,
Разануць бязлітасным лязом.

Суцішаю жартам хваляванне:
Што было — сплыло,
А боль — міне.
Толькі вось надзеі, спадзяванні
Не заходзяць болей да мяне.

1976

НЯЎДАЧНІК

Казалі, што старанны,
Ды так сабе паэт...
А ён глядзеў шторання,
Нібы дзіця, на свет.

Ваеннага рахіту
Нядужае дзіця,
Няздатны і не хітры
Між хітрага жыцця.

Нясмелы быў з начальствам,
Зусім не прабіўны.
Над кнігамі начамі
Праседжваў, дурны,

Часамі чуў: «няўдачнік»,
А дачай пагарджаў.
І кожны сыты дачнік
З дурнога аж іржаў.

Аднойчы ноччу жонкі
Ў кватэры не знайшоў...
Сам гатаваў тушонку,
Сам па кефір ішоў.

А тая за дацэнтам
Пышнела ды цвіла,
З пагардлівым акцэнтам
Аб «бездары» гула.

А ён хадзіў па вёсках
І нешта ўсё пісаў,
І бітваў адгалоскі
І праўду прыпасаў.

Гады чатыры біўся —
Раман пайшоў у друк.
Ад зайздрасці напіўся
Яго найлепшы друг...

Яна цішком чытала
Праўдзівы горкі том,
Жыццё сваё гартала
І плакала цішком.

1976

АКІЯНІЯДА

Акіянскія жыхары
звяртаюцца да людзей:

«Веды вашы вытканы з туману,
Так, паверхні слой, як пяць на пяць.
Поўныя сакрэтаў, акіяны
Побач з вамі то равуць, то спяць.

Глыбака, ва ўтульных катакомбах,
Форумы праходзяць часта ў нас.
Скардзіцца народ на вашы бомбы,
Нас вы ўжо калечылі не раз.

Прагнеце распраўіцца вы з намі,
Задушыць, расплюшчыць, растаўчы.
Мы сакрэт тайфунаў і цунамі
Разгадаць вам можам памагчы.

Знаем мы расклад землетрасенняў,
Вы ж усё аб нафце ды рудзе.
А пад намі вечнае кіпенне
Просіцца да вас,
Ажно гудзе.

Ёсць свае ў нас Азіі, Еўропы,
Дзівімся мы з вашых: ну і ну!
Вывучаем вас праз перыскопы —
Сытыя, а вечна — пра вайну.

Змайстраваны рэчы вашы груба,
Вельмі прымітыўны ваш дызайн.
І пажартаваць тунцы ў нас любяць:
«Карабель у іх, як дыназаўр».

Моладзь ваша зарасла ўся шэрсцю
І слабая целам без лускі.
Як іншапланетныя прышэльцы,
Ловяць нас на вострыя кручкі.

Вогненнай вадою самак пояць,
Самі дрэнь з бутэлек мутных п'юць;
Труцяць сцерлядзь,
А ядуць такое,
Што акулы нават не глынуць.

Пішаце пра мора вы кантаты,
Слова ў іх галоўнае — «карма».
А з народам вадзяным кантакту
Ўсё няма...
Ці мудрасці няма?

Мы дэльфінаў пасылаем спрытных
У разведку —
Да братоў браты.
Цырк, дый годзе!
Зноў за алгарытмы
Узяліся мудрыя кіты».

1976

ЗАКОН ЗАХАВАННЯ ЭНЕРГІІ

Перакanaўся,
Што ёсць ён, ёсць
Закон захавання энергіі.
Не прападае ні радасць, ні злосць
З пашкуматанымі нервамі.

Злыдзень,
Што нашых дзяцей пужаў,
Не страціў паршывай якасці.
А мінскі гнеўны і страшны пажар —
У электрычнай яркасці.

І пераможнае наша «ура»
Грыміць і сёння на стадыёнах.
І бессмяротная машкара
Ўецца каля калгасных даёнак...

На дыбкі ўстаю
І гляджу праз гады:
Знікне ўсё
І ўсё захаваецца.
Хопіць і радасці, і бяды:
Чалавецтва грашыць і каецца.

Рэлігіі знікнуць, як паразіты,
Ды памоліцца некаму
Нехта ў роспачы.
Закон захавання!
І кампазітары
Абсмокчуць
Харалы царквы
Аж да костачак.

На могілках быстраходных машын
Чалавек уздыхне з палёгкай.
А прагрэс усміхнецца:
«Не стой, не смяшы,
Купляй верталёт для палётаў».

Будзе жыццё прыгажэць і святлець,
Лазер заменіць ракеты, патроны.

А поскудзь
Доўга будзе ўсё тлець
На ціхіх мяшчанскіх нейтронах.

Груваcткасць
Электронных сістэм
Паўстане ў мініяцюрным абліччы.
І звышразумная ЭВМ
Майго нашчадка аблічыць.

У чорную дзірку, у антысвет
Знікнуць і рак,
і вусны здраднiц.
А новыя вірусы піснуць: «Прывет!»
І здрада — ля новых абраннiц.

Замест акул і кітоў перабітых
У акіянах паселяць
Маладажонаў.
І шмат мужыкоў уцячэ на арбіты
Ад распрыгоненых жонак.

Тут круціся ці там круціся —
Шчасце ад розуму,
Гора ад розуму...
А ўсё-такі лепей з любімай прайсціся
Сёння
Па цёплай зямлі пад бярозамі;

Закасцянелаcць песняй прабіць,
Водам застойным
Надаць рухомасць.
Пафантазіраваць, перарабіць
І пераліцца ў новыя формы...

А той, хто глядзіць штодня на свой пуп
І нюхае плёткі, як я пралескі,
Выб'ецца ў ствол, у цыбульны пук
І жоўцю сам на сябе пральецца.

1976

* *

Усё б табе па сцежачцы,
Па роўнай ды сухой.
І вось паспеў нацешыцца
Ты роўняддзю між хвой.
А што ў глыбінях бору —
Цяпер не варажы.
Цябе ўзялі за горла
Крутыя віражы.
Пасеш між моху вочы,
Шукаеш белы грыб.
А дождж той мох не мочыць,
Ад смагі лес ахрып.
Кашы мае пустыя.
Папіць бы...
Мох пыліць.
А дзе крыніцы тыя? —
Паэты папілі.
Глынуць бы квасу з дзежкі,
Як некалі з Брылём.
Заблыталіся сцежкі —
То твань, то буралом.
Я думаў: будзе восень
Спакойнай...
Міражы!
У самы тлум заносяць
Крутыя віражы.

1976

ЗНАЁМЫЯ

Няма такіх дзвярэй,
Куды б хоць раз
Знянацку не пастукалася б гора.
І мала тых кутвоў,
Дзе б у нялёгкі час
Схавацца можна
Ад хлусні і зморы.
А шчыра усміхацца —
То не цяжка,
Калі у сэрцы
Чалавечнасць ёсць.
Знаёмыя...
Усмешкі іх — нацяжка
На раўнадушша,
Зайздрасць альбо злосць.
Пазбаўленыя ласкі да людзей,
Мае знаёмыя
Збіраюць толькі смецце.
Іх захапляюць плёткі
Кожны дзень.
І нават весткі
Аб чыёйсьці смерці.
Здзіўляюся:
Як можна гэтак жыць!
Зямля здаецца ім
Крывым люстэркам...
Яна ж наўкол
У хараcтве ляжыць
І свеціць праўдай
Добрай і нясцерпнай.

1976

* *

Мы ўсе крыху тыраны,
Мы ўсе крыху рабы...
Адзін жыццё тараніць,
Другі — абы, абы.

Пакуль ты станеш прахам,
Прыдаўлены зямлёй,
Жыві пад зорным дахам
Са спадчынай сваёй.

І люба ці не люба —
Пазней адпомсцяць нам
Свая былая грубасць
І нечы дробны шрам.

Сябе ты дакараеш
За даўнія грахі,
Маўкліва дагараеш,
Як перастой сухі.

Мажліва, што і ўнукі
Табе ж і аддадуць
Не дабрату навукі,
А слоў зласлівых муць.

1976

* *

Бойні свету у крыві і сале,
На садах зямлі — атрутны пыл.
Колькі раз гісторыю пісалі,
Кожны набіваў на свой капыл.

А яна жыла, і бунтавала,
І сама тварылася сабой,
Нараджала, раны бінтавала,
Памятала ўсё пра кожны бой...

Кожны дзень, не ведаючы зморы,
Пра вайну расказвалі дзяды;
Везлі ўнукаў у Хатынь да гора,
Чорныя паказвалі сляды.

Дзеці за падручнікі заселі,
Дыхалі віхурамі атак.
І чаму — яны не разумелі —
Сумна ў гэтых кнігах і не так.

1976

* *

Мы ўсе ў маланках і біятоках,
У навальнічных успышках мы.
Яны, нябачныя нашаму воку,
Снуюць няспынна паміж людзьмі.

Бывае, нешта ў нас страпянецца,
Дык ведай: верны таварыш твой,
Забыўшы справы, к табе імкнецца
Са старамоднаю дабратой.

Калі ж з арбіты твой друг сарвецца,
Заўжды пачуеш, дзе б ты ні жыў,
Удар апошні роднага сэрца,
Апошні выбух яго душы.

1976

* *

Даруйце бацькам, што жадаюць сваім
Нашчадкам многа багацця:
Жылося вайною так голадна ім
Без хлеба і солі у хаце.

Даруйце настаўнікам, што ў юнаках
Захоплена таленты бачаць:
Іх талент уласны згарэў у баях,
І позна жыццё перайначыць...

Ды нельга наследнікам тым даравадь,
Што толькі ўзаб'юцца на горку —
Забудуць рублі ды і пісьмы паслаць
Дадому,
Дзе сумна і горка.

І таленты, знаць, небяспечна хваліць,
Якія на прыступцы першай
Забылі настаўнікаў.
Ім не баліць:
На ўласныя моляцца вершы.

1976

* *

Агрызаецца, ды звужаецца
Свет прыгнёту,
Пятлі
І свінца.
Рэвалюцыя прадаўжаецца,
Рэвалюцыя прадаўжаецца,
Ёй не будзе ніколі канца.

І за бітвамі навальнічнымі
Чалавецтва
Ізноўку ў баю:
Навуковая і тэхнічная
Скаланула планету маю.

Толькі звычкі былога
Панурыя
Аплялі нас і віюць:
Не руш!
Пачалася ўжо,
Хоць і не бураю,
Рэвалюцыя сэрцаў і душ.

1976

* *

На выгарах цёмных ваенных,
На сонечных лядах
Б'е грэчка малочнаю пенай
У ельнік кашлаты.

Зямлі нашай белы настольнік,
Пчаліны заказнік.
І светлае поле настолькі,
Што й ноччу не гасне.

Яно адцвіце — і на свеце
Крыху пацямнее.
А потым снягі ўжо засвецяць,
Успыхнуць завеі...

Ды часам мядовым настоем
Вяртаецца лета,
І белы кужэльны настольнік,
Як грэчкі палетак.

1976

* *

Бывала: вяртаешся з лесу ў маленстве,
А сонца зайшло, і туман па нізінах.
І раптам здаецца, што сцішаны лес той
Суровым паглядам глядзіць табе ў спіну.

І страх азірнуцца, але азірнуся,
Затоена ўсё, ды нікога не бачу.
Дадому спалоханы трошкі вярнуўся,
Але не прызнаюся і не заплачу...

Цяпер за сталом у бяссонныя ночы
Мяне ахінае часамі трывога.
І спіну свідруюць суровыя вочы,
А як азірнуся — нікога, нікога.

1976

* *

Над белаю пустыняю аблок
Так ярка і самотна сонца свеціць.
Пад белаю пустыняю аблок
Гуляюць дзеці на маёй планеце.

На гэтай рэактыўнай вышыні
Не адчуваем руху, хоць нясе нас.
Спакойна, нібы едзеш на кані,
Як некалі на возе з мяккім сенам.

А там, дзе вецер воблакі змяце,
Я ў сінія акенцы пазіраю,
Гляджу, як самалёта лёгкі цень
Імкліва жыта на зямлі зжынае.

1976

* *

Краса і цуд зямлі — Васіль Блажэнны,
Паклон зямны табе ўсе дрэвы б'юць.
А ў нас дамы ірвуцца да бліжэйшых
Сузор'яў,
Аж на дыбачкі ўстаюць.

І ўсё ж да зорак, як раней, далёка,
А да зямлі нагою не дастаць.
І вецер з-пад машын уцёк з палёгкай
І ў фортачкі гучней пачаў свістаць.

Шкада травы і дрэў —
Не часта кажам:
Мы ўсе ў палоне просценькай маны —
Развешваем нікчэмныя пейзажы
І з кветкамі купляем дываны.

І як бы нас туга там ні сціскала —
Мы абжывём захмарныя вуглы.
А некалі ў гіганцкіх батыскафах
Мы спусцімся яшчэ ў марскую глыб...

А покуль узлятайце ў ліфтах, госці,
І кветкі на пятнаццаты узносьце.

1976

* *

Дождж ізноў...
Якія лекі
Мне знайсці, каб сон прыйшоў?
Найвялікшая за лета
Ссыпка сіняя дажджоў.

Думкі змрочныя ад стомы:
Ну, зраблю яшчэ віраж,
А пасля цішком, без грому
Спішуць годы у тыраж.

Я аддам усё, што маю,
Буду голы, як Адам.
Толькі слёзы прыхаваю,
Толькі гора не аддам.

Што яшчэ мяне сустрэне? —
Я пытаюся радзей.
Сноў варушацца карэнні —
Прарастаю ў новы дзень.

1976

* *

Зніклі галёшы —
Туды ім, старым, і дарога!
З добраю славай
Конныя лавы
Ў палях адгулі.
Знікаюць валёнкі —
Значыць, цяплей на зямлі...
Як толькі сумленне знікае —
Трубіце трывогу.

1976

* * *

Веру Сірыусу і Венеры
За іх радаснае святло
І гарачаму сонцу веру,
Што маё саграва жытло.

Веру атамам, веру генам,
Веру дзецям, і мудрацам,
І ўрачыстым Крамлёўскім сценам,
І сваім беларускім лясам.

1976

ПЕСНЯ ПРА МІНСК

У дні бяды і ў ранак Перамогі,
У дні, калі ты харашэў і рос,
Усе твае надзеі і трывогі
Я ў сэрцы нёс.

Я да цябе з усіх дарог вярнуся:
Вярнуся ў партызанскую радню.
Ты мне прабач, калі я зажуруся
Ля Вечнага агню.

Спакойнае дзяцей сваіх дыханне,
Шумі над іх калыскамі ліствой.
Маё ты ранне і маё каханне
І вечар сіні мой.

Мой родны Мінск,
Пад небам жураўліным
Жыві, квітней пад зоркай залатой.
Ты для мяне на ўсёй зямлі — адзіны,
Цябе люблю я ўсёй душой.

1976

ПЕСНЯ

(Да радыёпастаноўкі па раману І. Мележа «Мінскі напрамак»)

Імчацца машыны па дымнай старонцы,
І сонца браню залаціць.
І сэрца маё па дарозе бясконцай
Да роднага Мінска ляціць.

Жыла там на ціхай Нямізе дзяўчына.
Прыйшоў, а яе не знайшоў...
Ты страціла самых адважных, Айчына,
І дочак сваіх, і сыноў.

Дзяўчаты і хлопцы ў абдымках гарачых,
Нам заўтра на захад, у бой.
А я на руінах сумую і плачу.
Аб ёй, аб нявесце маёй.

Здалёку прыходзіла ты, дарагая,
У сны франтавыя мае...
Я смерці не веру,
Кахаў і кахаю
Журботныя вочы твае.

1977

Я ЎНУКА ВЯДУ Ў МАЎЗАЛЕЙ

З высокай нязменнай любоўю
Між добрых надзейных людзей
Да Леніна крочу ізноў я
І ўнука вяду ў Маўзалей.

Яго павучаць не хачу я,
А проста вяду к Ільічу.
Убачыць — і сэрцам адчуе
Усё, што і сам я адчуў.

Няма тут на плошчы галоўных,
Няма паміж нас радавых —
Спакойная годнасць і роўнасць
І сэрца адно на усіх.

Запомні, унук мой, да скону:
Тут сонцу заўжды палымнець
На гэтым граніце чырвоным,
На гэтай чырвонай сцяне.

А варта падцягнута строга,
А сонца гарыць над Масквой,
І чыстае сэрца малога
Стукоча ў далоні маёй.

Да ўсіх дакранулася вечнасць,
Чысцейшымі сталі усе.
І горкую гэту сустрэчу,
І светлую гэту сустрэчу
Унук праз жыццё пранясе.

Бо той, хто тут раз пабывае,
Журботнай ракой праплыве,
Адгэтуль жыццё пачынае
І з Леніным вечна жыве.

1977

ДОМ

Я ў мястэчку ціхім рос,
Далёка ад бога.
Хаты, хаты, хаткі скрозь,
А дамоў нямнога.

Дом РК і РВК —
Ён свяціўся ўвечары.
Дом папа, дом разніка,
Дом старога фельчара.

Жыў я ў хаце, як і ўсе,
Мне было ў ёй добра.
Дзякуй бацькавай страсе
І акенцам дробным.

Падраслі і збеглі мы
У свет велізарны.
І пайшлі, пайшлі дамы —
Інтэрнат, казарма...

Адгула вайна.
Ляжаў
Горад мой разбураны,
Толькі мне пакойчык даў,
Порахам абкураны.

Весела я запасаў
І ваду, і дровы,
І распальваў грубку сам
У мароз суровы.

Пачынае дзень цямнець —
Сам гатую есці.
Не было прыемней мне —
Каля грубкі сесці

З добрым другам франтавым
І пачаць гаворку
І аб гэтым, і аб тым,
Ну і выпіць горкай...

Так і не прыкмеціў, як
Маладосць прабегла.
Спіна горбіцца мая,
Сівізна налегла.

Ад пісання — мазалі,
Стаў крыху вядомым.
І кватэру мне далі
Ў новым добрым доме.

Дом ступеньчаты такі,
Быццам дыяграма.
Дом рабілі мастакі:
На паўнеба рама.

Ёсць утульнасць і спакой,
Сонца — кожны ранак...
Толькі сніцца мне пакой
У дамку драўляным.

Сесці б вечарам ізноў
Ля гарачай грубкі,
Закруціць бы зноў любоў
З маладзенькай любкай.

З другам добрым, франтавым
Выпіць, павячэраць
І пабыць у доме тым
Маладым яшчэ раз.

1977

ПЕТРУСЮ БРОЎКУ

Пад старасць мы, як жабракі,
Збіраем успаміны:
Святло зары,
І пах ракі,
І нават выбух міны.

Імгненні даўныя сустрэч,
Дзіцячы свой ласунак.
На кожную старую рэч
Глядзім з лагодным сумам.

Усё запомніла душа:
І конаўкі, і лыжкі.
Яшчэ быў пах карандаша
І самай першай кніжкі.

Былі радоўкі у жыцці,
Начлег, туман і коні...
Ці ты прыпомніў гэта, ці
Я даўны час прыпомніў?

На схіле розных летніх дзён
Параніў нас да болю
Спеў берасцянкі,
Ціхі звон
На матыльковым полі.

І кожны з нас успомніць, як
Пярун страшэнны грымнуў
На Кацярынінскі бальшак
З бярозамі старымі.

У нас жыве ва ўсе часы
Зялёны родны гоман.
«Ушачы»,— шэпчуцца лясы,
Гудуць лясы: «Бягомль...»

Чытаю вершы я твае,
Напоеныя лесам.
І гэтыя, дзе кожны б'е
І гневам, і жалезам.

Мы ўсё прайшлі: агонь і дым,
Каб злыдні пацішэлі.
Былі ў акопе мы адным,
Былі ў адной траншэі...

Нас час, як дзяцел той, дзяўбе
Усё мацней з гадамі.
Гляджу я сёння на цябе
І думаю: адданасць.

І ўнукам некалі скажу,
Што лёс у нас адзіны.
На твой і мой бальшак гляджу
І думаю: Радзіма.

1977

* *

А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў,
Я веру праніклівай сойцы.
У бор я пайду пасля першых дажджоў,
Што высушыць зыркае сонца.

А покуль прысядзем на шэры валун,
Падумаем аб галоўным.
Забудзем няўдачы, забудзем хвалу
І плюнем на высакамоўнасць...

Вясковым настаўнікам некалі быў,
Вучыў, павучаў і выхоўваў;
Свавольнікаў вучняў ты вельмі любіў,
Ды толькі вучыў павярхоўна.

Самаўпэўненая маладосць,
Наіўнае глупства ўсязнайства.
Што мудрасць народа вышэйшая ёсць,
Крыху пазнавата спазнаў ты.

Ён ведае ўсё, і ён бачыць наскрозь,
Ацэніць, ці варты чаго ты.
А праца — жыцця найгалоўная вось,
Давай справаздачу за годы!

Зрабіўся відушчым ты толькі цяпер:
Нам век не вучыць, а вучыцца;
Рабіць, памыляцца, ўзнімацца, цярпець,
Вучыцца ў бабра і ваўчыцы;

Нястомнасці вечнай — у мураша,
Зімовай трываласці ў дрэва...
Замоўкні ты ныць, трапяткая душа.
Табе адпачынку не трэба.

1977

* *

Бой пад вечар скончыўся,
А мы ўсё
Пра атаку,
Хоць былі ўжо «тыл».
І ніхто яшчэ з нас не памыўся,
І ніхто яшчэ з нас не астыў.

І ляжаць сябры ў магіле братняй —
У каманды пахавальнай многа спраў.
Не спяшыў камбат пісаць аб стратах,
Аб сваіх салдатах гараваў.

Кроіў хлеб мой друг рукою чорнай,
З гімнасцёркі не абмыўшы кроў.
Выпівалі па чатыры нормы —
Нашы
І загінуўшых сяброў.

1977

БЕЛЫ КАСНІЧОК

Ты яшчэ гэтага, сэрца, не знала,
Хоць і прайшло праз вайны ураган...
У Асвянціме ляжалі навалам
Косы жаночыя.
Шэры курган.

Тыя жанчыны пакутліва зніклі...
Хочацца з гэтага месца ўцячы...
Гэта ніколі не зробіцца звыклым —
Пільна ўглядайся і гнеўна маўчы.

Раптам убачыў я збоку ў той грудзе
Косы дзяўчынкі і белы каснік.
Хто ты, малая пакутніца?
Людзі,
Перадсмяротны вы чуеце крык?

...Як у дзяўчатак у косах убачу
Сёння маленькі такі каснічок,
Сэрца пакіне мяне і заплача,
І на хвіліну наваліцца змрок.

1977

* *

За акном — бясконцых шын шыпенне.
Раптам, уварваўшыся ў пакой,
Скаланула музыка Шапэна
Мой шумлівы гарадскі спакой.

Я журботны плач паціху слухаў —
Чалавеку склалі дзве рукі.
Зрэдку барабан няўмольна бухаў,
Быццам забіваў ужо цвікі.

Род людскі пабольшаў і паменшаў,
Вечны рух на сцежках крыжавых...
А Шапэн аплаквае памершых,
А Шапэн жыве паміж жывых.

1977

* *

На нашым паўночным паўшар'і
Зжаўцелая восень імжыць,
Ліствы адшугалі пажары,
І час наш павольней бяжыць.

Ён, можа, бяжыць не павольней,
А проста не бачна з-за хмар...
Не хочацца думаць пра войны,
Пра бомбаў нейтронных кашмар.

За год наш народ нарабіўся,
А вольнага часу не шмат.
Не грэх, калі хто на рабіне
Гарэлку настоіць да свят.

А наш лістапад — ён уючны
З багатай паклажай вярблюд.
Вунь яблыкі хрупаюць вучні,
Вунь бульбу ссыпаюць у груд.

Якія у нас вярблюды там! —
Капусту вязе грузавік.
Здаўна не быццём я, а бытам
Цікавіцца восенню звык.

І побыт асенні народа
Хвалюе ізноўку мяне.
А водар садоў і гародаў
Кватэр гарадскіх не міне.

Хвала векавечным турботам!
Жаўцеюць цыбулі вянкі,
Напоўнены слоікі мёдам,
Засолены ў бочках гуркі.

Мяшэчкі — з гарохам і макам,
Яны прычакаюць свой час...
Я хрупаю храпку са смакам:
Капусту шаткуюць у нас.

1977

* *

Стаяла хмара нерухома
У жыце спелым.
Ад першага удару грому
Аж пачарнела.

Гром пахіснуў яе, пасунуў,
Разгойдаў жыта...
Павеяла цяжкім, і сумным,
І перажытым.

З табой блукаў тут да світанкаў...
Цяпер з-пад сосен
Гляджу адзін, як гром маланкай
Дождж белы косіць.

1977

* *

Жнівеньская ноч як звар'яцела,
Развязала чорныя мяхі.
Сотні тысяч зорак пераспелых
Сыплюцца на мокрыя імхі.

Галаву і сэрца мне працяла
Млечным Шляхам.
Край сасновы мой
Сёння ноччу нейкім стаў працягам
Зорнай таямніцы векавой.

Балбатня пра атамы — пустое,
Бо у прыгажосці — свой закон.
Толькі гэта неба залатое
Назаўжды ўзяло мяне ў палон.

Загадайце, хлопцы і дзяўчаты,
Спраўдзіцца усё ў жыцці у вас...
Зоркі, не пагасніце дачасна,
Я люблю вас,
Я кахаю вас.

1977

* *

Апалашчуся хвалямі вятроў
І белым воблакам я вочы свае вымыю...
Стаміўся трохі ад сваіх сяброў,
І ад мяне стаміліся сябры мае.

Адвыклі мы ад простых добрых слоў
І перажоўваем штодня старыя ісціны...
Кіпяць дубы ўсхвалёванымі лісцямі
Пад воблачнымі крыллямі буслоў.

Здаецца, ўсё я ў вас адкрыў, сябры,
А тоіце там нешта, дык прытойвайце.
Не страціце ніколі вы прытомнасці,
Як сосны, бурай збітыя ў бары.

Ну колькі тых паэтаў ёсць у нас?
Чатыры альбо пяць,
А ўсё астатняе —
Наіўны сон,
Адна магіла братняя
Нявдзейсненых задум тваіх, імклівы час.

І я такі ж няздзейснены,
Такі ж
Недакапаны да вады калодзеж,
А ісціну хлуснёй не пазалоціш,
Яна са мной, як пахавальны крыж.

Чаму мы часта цешымся лухтой?
А вершы — галавешкамі ачахлымі.
Гляджу на воблакі —
І слёзы на вачах маіх,
І добра, што не бачыць іх ніхто.

А нехта ж прыйдзе мудры, як дзіця,
І пазірне туды, куды глядзелі мы,
І пятніцы ўсе зробяцца нядзелямі,
І ў вершах зазвіняць званы жыцця.

1977

МЛЕЧНЫ ШЛЯХ

Наш праспект, нібыта Млечны Шлях,
Ноччу ён кіпіць, пераліваецца,
Заклікі і лічбы на дамах
Яркія, ды толькі не чытаюцца.

Запісала заклікі вясна
У юнацкіх сэрцах вельмі моцныя,
Цішыня адкінута ад нас
Імправізаванымі прамоўцамі.

Кожны дробны сквер і кожны парк
Ад прамоў кароткіх сыпле іскрамі.
Не відно мне закаханых пар,
Гэта дрэва цыгарэтай бліскае.

Вуліцы мае... Агні, агні...
Зоркавая плынь, цячы ў душу маю,
Не хачу я сёння цішыні,
Горад мой, з табою ўсё дадумаю.

Ты жывы — і, значыць, я жыву.
Дай жа бог табе не знацца з бедамі.
Млечным Шляхам я плыву, плыву,
А куды плыву — яшчэ не ведаю.

Горад мой, ты сёння спаць не рай;
Маладосць цалуецца да раніцы...
Хай стары спустошаны трамвай
У свой парк паціху дабіраецца.

1977

* *

Я не магу судзіць нікога,
Дарую многае братам,
Бо сам не быў любімцам бога,
Я — пасівелы сірата.

Няўдачлівы і трохі грэшны,
А міласці не папрашу:
Я сам раздам усё да рэшты —
Жыццё, і вершы, і душу.

Я дзякую сябрам за дружбу
(Іпакшых не хачу сяброў),
Зямлі — за хлеб, лясы і ружы,
Сям'і — за чуласць і любоў.

А небу дзякую за промні
На ўсім працягу лет і зім...
А там, успомняць ці не ўспомняць,
Я не турбуюся зусім.

1977

* *

І людзі,
Што пшаніцу, жыта сеюць,
І сонца,
Што палеткі саграе,
І дождж, і вецер,
Што над полем вее,
І аграном,
Што рана устае,

І грузавік,
Што пад дажджом імчыцца,
Камбайны, элеватары, млыны,
І хлебапёк,
І нават прадаўшчыца —
Ствараюць хлеб
Для нас усе яны.

Штодня мы, людзі,
Снедаем, абедаем,
Успамінаем,
Хто як галадаў;
І сорт, і кошт,
І вартасць хлеба ведаем...
Я толькі
Падрабязнасці дадаў.

1977

* *

То ў працы, то ў дымным паходзе,
У потнай штодзённай турботе,
А зрэдку ў лясах на выгодзе
На роднай любімай зямлі
Найлепшыя годы праходзяць,
А ў нас, пастарэлых, прайшлі.

Мы лішняга шчасця не просім,
Украдзенай славы не носім
І нават аб тым не галосім,
Што сэрцы навекі замруць.
Мы ўсе, нібы зерні з калоссяў,—
З зямлі ды ізноўку ў зямлю.

1977

* *

Нешта пройдзена,
Нешта знойдзена,
Прыгалублена,
Потым згублена.
А найлепшае не збываецца,
А найгоршае не забываецца.

І толькі родныя лясы
Знаходзяць нас ва ўсе часы.
І зоркі аганёк
Надзею шле здалёк
І абяцае шмат дарог,
Расчараванняў і трывог.

Ты толькі раз з дарогі збоч —
Паселіцца у сэрцы ноч.
Ад праўды раз адкруцішся —
Няпраўдаю атруцішся.

Трэ берагчы нам праўду слоў,
Як бор сваіх дзятлоў,
Як удава апошняе
Сваё дзіця...
І даражу я кожнаю
Расінкаю жыцця.

1977

* *

Пупышкі на вербах гнуткіх —
Гэта вясны пачатак.
У тэлефонных будках
Пачуўся шчэбет дзяўчатак.

Хоць халадком яшчэ вее,
Жанкі басаножкі абулі.
Сон прадаюць на скверах
Прыгарадныя бабулі.

У бляску і сонечным дыме
Вуліцы і дарожкі.
Усе мы вясной маладыя
І звар'яцелыя трошкі.

Жонка ад вокнаў гоніць:
— Куды ты, куды пазіраеш?
Насупраць мяне на балконе
Дзяўчына ўжо загарае.

1977

10 Зак. 2000

ПАЛЕГЛАЕ ЖЫТА

Палі ў спякотным даспяванні
Зноў плешчуць хваляю жывой.
Вось толькі змоўкне кукаванне —
Дыхне гарачае жніво.

Ды раптам сонца знікла, збегла,
Дажджу б'юць шэрыя званы.
І жыта спелае палегла
Ад Прыпяці і да Дзвіны.

І лета ўсё па Беларусі
Вады было той цераз край.
І я аднойчы — прызнаюся —
Падумаў: згінуў ураджай.

Свісталі дажджавыя пугі
І секлі жыта.
А калі
Яснела —
З грукатам, з натугай
Камбайны па гразі паўзлі.

Рабілі і ўначы няспынна,
На ўсім ляжаў вільготны пыл.
Туды, дзе не прайшлі машыны,
Прыйшлі забытыя сярпы.

Вады у полі хоць заліся,
Шкада кабетам каласкоў.
Адкуль цяпер сярпы ўзяліся?
З гербоў хіба што і сцягоў.

Мы часта славім хлеб духмяны.
Праслаў, калі ты не аслеп,
Людскую працу, і адданасць,
І бітву грозную за хлеб:

Як малацілі, як здавалі,
Як кожны быў бязмежна рад...
Вось так на фронце ратавалі
Мільёны раненых салдат.

1977

МАЎКЛІВАЯ МАЛІТВА

> Перад пачаткам кожнай сесіі ААН усе дэлегаты ўстаюць для маўклівай малітвы і роздуму.

Моляцца белыя, жоўтыя, чорныя,
Адпрасаваныя, самавітыя.
Усе такія вучоныя,
Усе такія хітрыя.

Маліцеся, дыпламаты, маліцеся
Хрысту, алаху ці будзе.
А потым богу свайму пахваліцеся,
Што мір на планеце будзе.

І я стаю у трывожным роздуме:
Эпоха наша не ціхая.
А мілыя сэрцу вобразы розныя
У памяці ўспыхваюць.

Хто тут сябра, а хто тут вораг,
Нам разабрацца не цяжка...
А дома лісце зграбаць на дворык
Пабеглі Таня, Наташка...

Джэнтльмены міґам тут ашукаюць —
У белых манішках шакалы.
А дома дзеці мяне шукаюць,
І кнігі мяне чакаюць...

Пачнуць хлусіць, баламуціць, подлічаць,
Балбатаць пра мір,
Хоць вайна ім сніцца.
А дома на белым сподачку —
Ружовыя брусніцы...

Вось так хвіліну, другую стаім
З прыглушанымі вачыма.
Заўсёды і ўсюды ў сэрцы маім
Малітва адна —
Айчына.

1977

МАЛАДОСЦЬ І СТАРАСЦЬ

Як добра да восені тварам прыкласціся,
Пад ветрам хадзіць і паціху глядзець:
Стаіць васьмікласнік з малой васьмікласніцай,
Гадзіну, другую размову вядзе.

Махаюць часамі партфелямі пухлымі,
Аж брыкаюць формулы.
А шкаляры
Забылі пра дом
І што дома на кухнях
Даўно іх чакаюць дзве бабкі старых.

Хаджу я штодня тут любімаю сцежкаю
І думаю доўгія думы свае.
І не з насмешкаю,
Проста з усмешкаю
Глядзяць на мяне незнаёмцы мае.

Такія вясёлыя, добрыя, дружныя...
Я знаю, як гэту сустрэчу завуць.
Смяюцца ад радасці, велікадушныя,
І думаюць:
Сумна старыя жывуць.

Жывём мы,
Радзімай сваёй не забытыя.
А што мы, старыя, для іх, маладых?
Мы тыя, ваенныя, быццам забітыя...
І ўсё-такі рана шкадуюць старых.

Над хлопцам з дзяўчынай кляны разгараюцца.
Зайздрошчу? Ніколькі.
Сумую? Ледзь-ледзь...
А нам —
Маладосць, пэўна, не здагадаецца —
Да скону гарэць
І ніколі не тлець.

1977

МІНСКІ ЧЫЛІЕЦ

Яго бацькі жывуць у Кардыльерах,
Хаваюцца, змагаюцца штодня.
А ён сядзіць з падручнікам у скверы,
Дзе лісцямі шапоча цішыня.

Ён у канцлагеры паўгода здзекі зносіў,
Ён сніць начамі акіянскі гул.
І мінская спагадлівая восень
Залечвае чылійскую тугу...

Ды вось аднекуль з вераснёўскай сіні
Бягуць студэнткі з крыкам да яго:
— Віншуем, Карлас, з сынам...
Сынам...
Сынам...
— А як ты назавеш сынка свайго?

Шчаслівы разгубіўся...
Нібы вучня,
Дзяўчаты пачалі яго кружыць...
Забыты недавучаны падручнік
Пад лісцямі кляновымі ляжыць...

Нам сёння чаркі поўныя наліце,
Мы вып'ем за чылійцаў маладых,
За Чылі
І за мінскага чылійца,
За будучыню іх,
За шчасце іх.

1977

* *

Здараецца, часамі я раблю
Не тое, што заўжды рабіць люблю.

Я пагарджаў агульшчынай, а сам
Бяздумных вершаў многа напісаў.

Бывала, што па радасць я іду,
А там знаходжу здраду і бяду.

Я век бязвольных мямляў не любіў,
А сам не раз такім бязвольным быў.

Я ад кахання вернага уцёк,
А выпадковы дзед сказаў: «Зяцёк...»

Адкрыю раўнадушнаму душу,
А роднаму ад сораму схлушу.

Мне кар'ерыст аднойчы спагадаў,
Праз тыдзень дробным жулікам прадаў.

Не вартых праслаўлення праслаўляў...
Вось толькі сам сябе не выдумляў.

1977

МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ДОШКІ

Я змераў Мінск і ўпоперак і ўдоўжкі,
Спазнаў усе завулкі, тупікі...
І ўсюды бачу дошкі, дошкі, дошкі,
Прыбітыя, здаецца, на вякі.

Каля адных праходжу ціха міма,
Каля другіх зусім спыняю крок...
Зноў лістапад,
І ноч,
І зноў над Мінскам
Рэвалюцыйны вее вецярок.

Далёкая суровая ўзнёсласць,
Мяне ты хвалявала ўжо не раз.
Вось тут Свярдлоў
Ад Леніна прынёс нам
І праўду,
І параду,
І наказ.

Тут Фрунзе пасылаў свае атрады
Раззброіць жандармерыю,
А там
Узводзілі мінчане барыкады,
Жыццём сваім
Шлях церабілі нам...

Наўкол гамоніць племя маладое,
Я сёння іх ні ў чым не папракну.
Я ведаю:
Ад нас пяройдзе ўсё ім —
Цяжар жыцця
І праўда пра вайну.

Ад песень і ад смеху гулкі пошчак...
Ды прыйдзе непазбежны сталы час,
І каля гэтых непрыкметных дошчак
Яны яшчэ прыпыняцца не раз.

1977

* *

Наш правадыр і не ведаў,
Што ў Беларусі бываў,
Што ён і ў Брэсце абедаў
І ў Мінску не раз начаваў.

Верыцца ў гэта прачула,
З глыбіняў сэрца ідзе:
Сваімі вушамі чулі
Ад самых надзейных людзей.

Заходні фронт ён наведаў,
Вядома, падпольна, тайком.
Ён ведаў пра ўсе нашы беды,
Стварыў не адзін рэўком.

Не ўздумайце людзям пярэчыць,
Пакрыўдзяцца на гады́.
Хай свецціца праўдаю вечнай:
Ён быў тут
І будзе заўжды.

1977

* *

А гідрастанцыю нашу ў Саянах
Моцнай будуюць народаў сыны:
У цела плаціны умураваны
Дымны кавалачак Брэсцкай сцяны.

Будуць палаць нечуваныя зоры,
Будзе вякамі турбінаў тут гул...
Ленін глядзеў на Саянскія горы,
На Енісей і глухую тайгу.

1977

* *

Мяне сябры пытаюць:
«Скажы, сярдзіты друг,
Навошта табе тая
Нянавісць да хапуг?
Усё пра злыдняў пішаш...
А ты ідзі у сквер —
Вясной усмак падышаш,
Складзеш вясёлы верш».
Ах, божа мой...
Ды сам я
Захоплены навек
Высокімі лясамі,
Спакоем родных рэк.
Па рэчцы успамінаў
Я плыў быў ўсё і плыў...
А хто нажом у спіну
Таварыша забіў?
І душагубы ходзяць,
Схаваныя ў туман,
Што ў даўнім горкім годзе
Губілі партызан.
Калі з нас кожны мірна
Ў пасцелі мяккай спаў,
Хлапчук, а не граміла
Ларок абрабаваў.
Падлетка строга судзяць,
Судзіце і мяне:
Мне гора сэрца студзіць,
Мне сорам плечы гне.
Сябры, хадзіце ў жыце,
Ганіце прэч тугу,
Пра васількі пішыце...
Я покуль не магу:
Завешчана бацькамі,
Сам Ленін даў наказ:
Жыць з чыстымі рукамі,
Рабіць не напаказ.

1977

У БРЫТАНСКІМ МУЗЕІ

Гукні у першай зале — і заглохне
Твой голас у агромністай другой.
Багацце свету тут вякамі сохне,
А з сутарэнняў дыхае разбой.

Ды не гукаюць тут...
У ціхім тлуме
Ніхто не ўспомніць нечых слёз і страт...
Сланы і сфінксы.
Фараонаў муміі.
Фантастыка.
Гісторыі парад.

Тут акіяны, кантыненты, расы...
А вунь мастак — нязваны чорны госць
Стаіць ля родных рытуальных масак,
Змалёўвае дакладна ўсё як ёсць.

Такі не піша каралеве скаргі,
Пад вейкамі — прытоены агонь.
Ён ведае:
Украдзеныя скарбы
Зноў вернуцца у Афрыку яго.

1977

* *

Там, дзе ўмоўная конская сіла,
Умоўная шклянка віна
І ўмоўнае паліва,
Хоць бухгалтарам гэта міла
І не лічбаў у тым віна,—
Там паэзіі ані каліва.

1978

ВЯРТАННЕ

Дзе начуе жаўранак,
Скажыце,
Ці на лёгкім воблаку,
Ці ў жыце?

Запытаўся некага
Я ўранні...
Гэта пачалося ўжо
Вяртанне.

Праз жыццё,
Удачы і няўдачы,
Да палёў,
Духмяных і гарачых.

Праз вайны
Задымленыя росы
Да гадоў
Даверлівых і босых.

Не засумаваў,
Не зажурыўся —
У дзіцячы пах травы
Зарыўся.

Дзе начуе жаўранак,
Скажыце,
Ці на лёгкім воблаку,
Ці ў жыце?

Запытаўся,
Ды ніхто не чуе...
Пэўна, ў сэрцы
Жаўранак начуе.

1978

* *

А мы ўжо як зімы сівыя,
Апошняя свечка гарыць...
Не ўмею даваць чаявыя
І рэчы не ўмею дарыць.

Заўжды ад нахабства знямею,
Ад вершаў хлуслівых збягу.
Паэзіі не разумею
Ці праўду пазнаць не магу?

Не ўмею лісліва пад'ехаць,
Не ўмею прыкрыкнуць баском...
Радзей адгукаецца рэхам
Вайны тройчы спісаны гром.

Адным зразумела і проста,
Як трэба для славы служыць.
А я па-салдацку сяброўствам
Умею яшчэ даражыць.

Адзін за другога нам легчы
Не страшна было на вайне.
І зараз мне б толькі дабегчы
Да тых, хто пакліча мяне.

1978

БЯРЭЗІНСКІ ЗАПАВЕДНІК

На поўнач ад Мінска пад Лепель
　　На дзевяностай вярсце
Бярэзінскі запаведнік
　　Між рэк і балотаў расце.

Чароўныя рэчкі!
　　Іх назвы
　　　　звіняць і шумяць у вушах:
І Проня, і Гайна, і Ольса,
　　І Бобр, і Уса, і Уша.

Плывуць у імгле сцюдзёнай
　　Пад навіссю цёмнай лазы
Цяжкія тлустыя жэрахі,
　　Зялёныя ментузы.

Бярэзнікаў белая песня,
　　Званы медзяныя бароў,
Заставы калматых елак —
　　Надзейныя сховы звяроў.

Дзе рогі аленя — не блытай —
　　Дзе елак сухія сукі,
Уверсе мільгаюць вавёркі,
　　Унізе сапуць барсукі,

Ад золаку да змяркання —
　　Птушыныя кірмашы,
Зязюлі мядзведзяў будзяць,
　　На працу бягуць мурашы.

Яны не саступяць дарогу
　　Нават ласям цяжкім...
Увосень рабіны ўзнімаюць
　　Вогненныя сцяжкі.

Увосень збіраецца ў лесе
　　Сівы партызанскі люд
Наведаць сяброў пахаваных,
　　Аддаць штогодні салют.

Падправяць магілкі аселыя,
З чарак пральюць віно.
Дрэвы старыя зноўку
Гудуць, як гулі вайной.

Тут забаронаў многа:
Не біць, не паліць, не страляць.
Але няма забароны
Памінкі такія спраўляць.

Бо самае запаведнае
У запаведніку тым —
Сустрэчы жывых і мёртвых,
Кастроў партызанскіх дым.

1978

* *

А птушкі знікаюць...
Не верце
Паклёпніцкім слухам такім.
На стомленых крылах праз вецер
Вяртаюцца з поўдня гракі.

Навошта у верш прывалок я
Вясёлае племя гракоў?
Па вушы, па вочы, па локці
Мяне засмактаў неспакой.

Мне блага з-за нейкіх падманаў,
І тупае злосць за сцяной.
Імгла сакавіцкім туманам
Стаіць між табою і мной.

І я ўжо бажуся: забуду
І нават у сне не прысню
Сваю дарагую зануду,
І праўду яе, і хлусню...

Пасля каламутных мяцеліц
Мы ўдвух ля акна памаўчым
І скажам: «Гракі прыляцелі...»
Саўрасаў, ты тут ні пры чым.

1978

* *

Вы начавалі над ракой
на сініх паплавах?
Я начаваў.
І сенам пах
маленства Млечны Шлях.

Яшчэ ён пах тады расой,
прытоенай слязой.
Загадкі зорныя плылі
маўкліва нада мной.

Было і потым разгадаць
жыццё мне не лягчэй —
Бясконцы млечны шлях вачэй,
жывых людскіх вачэй.

Цяпер у зорную пару
жыву я між лясоў.
Шлях на мяне глядзіць вачмі
загінуўшых сяброў...

Было і ёсць жыццё ў мяне,
а будзе непазбежнасць.
Пара адкінуць мітусню
і вечную паспешнасць.

Пара, пара прыйшла і мне
не коўзацца, не зыбацца.
Сцвярджае век: ты чалавек —
не страх, не крах, не прах...

А з вышыні ўсю ноч на лес
і на мяне ўсё сыплецца
Трывожны ціхі зорны дождж,
журботны Млечны Шлях.

1978

* *

Хмары плаваюць над намі,
Зеляніна ўсё радзей.
Раз'яднанне, раз'яднанне
Дрэў, і птушак, і людзей.

Лісця жоўтае кружэнне,
Насцярожанасць травы.
Адчужэнне, адчужэнне
Ад высокай сінявы.

Гром апошні раз прагрукаў...
Дзе самоту мне падзець?
Ток і лазня, печ і грубка,
Вы ядналі век людзей.

Што людзей яднае зараз?
А ўсё тое ж: поле, цэх.
Часам чара, часам кара,
Часам грэх, а часам смех.

А суседзі сына жэняць,
Тут не восеньскі настрой...
Лісця жоўтае кружэнне,
Спелы яблычны настрой.

1978

* *

За прасніцай гарбатаю
Матуля ледзь не плакала:
«Жыццё маё праклятае...
Праду не кужаль — пакулле...»

Сляза цішком свяцілася
(Было гэта даўно).
Зрывалася, каціласяя
У кут верацяно.

Настольнік трэба выткаць,
Ручнік і паясок.
Прыгодна толькі нітка,
Танчэй за валасок.

Далёка час той зрэбны...
Ды мучаешся ты:
Радок патрэбны срэбны,
А можа, залаты.

Ірвецца, не прадзецца,
Як з пакулля, радок.
І сэрца не праб'ецца
Праз слоў сухіх лядок.

І маму маладую,
Забытую душу,
Здалёку пазаву я
І ціха папрашу:

Ты зноўку, як калісьці,
Мяне пакалышы
У песеннай калысцы
І прашапчы: пішы.

1978

ЗОРНЫ ЧАС БЕЛАРУСІ

У век бясконцага прытворства,
І крывадушша, і хлусні,
Мая зямля, ты светлы востраў,
Які ў маленстве толькі сніш.

У век крыві, пакут і гора,
Пагроз і атамных ракет
Ты ўзнагарода і апора,
Мой сацыялістычны свет.

І сёння ў еднасці адзінай
Паміж сясцёр, паміж братоў
Ты, Беларусь, мая радзіма,
Краса, і гордасць, і любоў.

Усе жылі пад перунамі,
Ды найгарчэйшы лёс быў твой,
І ўсе бляднеюць параўнанні
Перад нязломнасцю тваёй.

Жывём з братамі ў дружбе добрай,
У працы, як у дні атак.
На землі іншыя падобна
І непадобная, аднак:

Сваім Наддзвіннем, і Палессем,
І Белавежаю старой;
Сваёй «Лявоніхаю»-песняй,
Што ходзіць над усёй зямлёй;

Сваёй усмешлівай гаворкай
І памяццю сіроцкіх слёз;
Нязгаснаю Хатынню горкай,
Журбою ціхай трох бяроз.

І Брэсцкай крэпасцю, і Мінскам...
Ну а калі сказаць прасцей —
Гарачай бульбай, поўнай міскай
Мачанкі для сваіх гасцей...

Зямля сардэчная, зялёная,
З-пад партызанскага крыла
Ты Клімука і Кавалёнка
Да зорнай славы узняла.

Самаўлюбёна не хвалюся,
Што любім мы, што любяць нас,
Але для роднай Беларусі
Прыйшоў высокі, зорны час.

1978

* *

Вецер грукнуў форткай.
Прабудзіся.
Пачалося восені выццё.
Калі можаш абысціся —
Абыдзіся
Без жабрацкай скаргі на жыццё.

Што з таго, што ў нечым ты раскаешся,
Спавядальна ў грудзі патаўчэш?
Ад сябе самога не схаваешся,
Ад сябе самога не ўцячэш.

Лёгка мы сабе грахі даруем,
Іншых б'ём з-за дробнае віны,
Ад малой няўдачы ўжо гаруем,
Забываем гора дзён вайны.

І, да блізкіх вельмі не ашчадныя,
Рэдка вымаўляем мы: «Прабач».
Веру я ў слёзы ачышчальныя,
Веру ў добры дзень пасля няўдач.

Лістападу радуйся і снежню,
І вятрам асеннім і снягам.
І малая крыўда здасца смешнай,
І як слаўна жыць — адчуеш сам.

Гэта ўсё не штучная бадзёрасць,
Ісціну адну ты зразумей:
Тое, што здаецца нам будзённым,
Нібы свята, ўспомніцца пазней.

1978

НАШЫ ПЕСНІ

Песні мы свае не самі выбралі,
Рытмы не ў чужых краях знайшлі.
Ды мармычуць многія верлібрамі
На маёй на песеннай зямлі.

Не хачу, як лапаць той разбэрсаны,
Тупаць з раскудлачанымі вершамі,
З пустазеллем каля жытніх баразён.
Нашы песні дышуць праўдай, вернасцю,
Нашы песні пахнуць жытам, верасам,
І не заглушыць іх чысты звон.

1978

БЕДУІНЫ

Бачыў я ў Афрыцы каля Сахары,
Як спрытна вярблюдзіц даілі
З гордасцю непрыступнай на твары
Чорныя бедуіны.

Здаецца, бяда:
Спякота,
Пустыня,
Гнеўнае сонца,
Пыл.
Вятры гарачыя і густыя
Гудуць,
Як тэлефонныя слупы.

А ў бедуінаў
З пустыняй
І злітнасць, і роднасць.
Як у нас з нізінамі і далінамі...
Мы не ў Сахары,
Ды выпаўзае мода
Быць тубыльнымі бедуінамі.

Пакінуў жонку,
Жонка пакінула,
Суседзі дачу будуюць —
Крах... Катастрофа...
Планета загінула...
Нашы бедуіны бядуюць.

Не дасталі махеру
Ці нейкай дублёнкі,
Не прыслалі машыну,
Каб з'ездзіць на рынак,—
Забедуінілі
Нейчыя жонкі.
Вы чулі плач бедуінак?

Паслухалі хітры замежны голас,
Прагная зайздрасць
Дурных прыдавіла:
«Ні кока-колы.

Ні жвачкі.
Гола...» —
Шэпчуць цішком бедуіны.

У мяне прыяцель калісьці быў,
Слёзна бажыўся,
Што будзе іншым,
А потым ізноўку
Горка запіў.
Бедуінчык.
Бедуінам сапраўдным
І пустыня — казырная карта,
У іх разумныя кемныя твары...
А нашых бедуінаў
І бедуінак смаркатых
Я паслаў бы
Павандраваць
Па Сахары.
І падаіць
Вярблюдзіц.

1978

БАРАВІНА

У кожнага быць павінна
Свая баравіна,
Дзе трымаюць на зялёных руках
Сосны
Самае зыркае сонца.

Убачу заўсёды
Са стэпу і мора
Вышыньку
Роднага бору.

Дзе б я ні быў —
Баравіна са мной.
Хоць аднойчы за лета
Мне трэба
Паляжаць пад высокай сасной,
Парадніць вочы з небам.

Блакітны верас,
Баравікі
Пахнуць маленствам заўсёды.
Тут ваявалі
Мае дружбакі
У партызанскія годы.

Вецер, табе пагусці пара
У сонечных верхавінах...
Каму сіні стэп,
Каму гара,
А мне мая баравіна —
Маленства майго краіна.

1978

УСКРАІНЫ

Яблычны, бэзавы пах ускраін...
Учэпісты і працавіты народ
Яго і каралі,
І дакаралі,
І везлі вёскі яму свой мёд.

Прытулак студэнтаў неўладкаваных,
Гарачыя печы,
Салодкі чад.
Рай гандлярак
І рай закаханых,
Запаведнік ружоватварых дзяўчат...

Ускраіны прачынаюцца рана
Пад цёплым бокам
Завадскіх карпусоў.
А потым прыходзяць
Цыбатыя краны,
Прынюхваюцца да маленькіх садоў.

А там
І пазяхнуць не паспееш,
Не паспее сляза
Скаціцца з павек,
Цябе ўжо чакае
Высокі паверх.
Хоць сонца
Садок твой пакінуты спеліць.

З мінулым
Ірвуцца спрадвечныя ніткі,
Сціраецца ціхі і звычны след.
Сумуе жанчына над газавай пліткай:
Дзе той сад?
І дзе той сусед?

Ускраіны поўняцца
Грукатам, гулам,
Горад высунуўся
За небакрай.
Жыццё старонку перагарнула,
І знік навекі драўляны рай.

1978

УНУЧКАМ

1

У Кацi добры вожык,
А з ёй гуляць не хоча.
У вожыка сто ножак,
Так ноччу ён тупоча.
І Каця вожыку крычыць,
Што хоча ножкі палічыць.

2

Ксюшачка, Ксюшачка,
Вось табе падушачка.
Дарагой маёй дзяўчынцы
Пазбіралі па пярынцы
Тыя гусі белыя,
Што па лузе бегалі.
Ты заснеш, ты заснеш
На сваёй падушачцы.
І не думай у сне
З гусаком падужацца.

1979

ПРЫЛУЧЭННЕ

Навалілася стома,
Як цяжкая зіма.
Хочаш выбегчы з дому,
А ўжо сілы няма.

Непатрэбшчыны многа,
Мітусні, беганіны,
Быццам цягнуць за ногі
Цябе багавінне

І наш быт парашковы,
Дыетычны, пілюльны.
У жыцці перашкоды —
Раз'яднанне, няўтульнасць.

Ну, прытомішся крышку,
Хочаш дзень памаўчаць.
Тут Арочка ці Клышка
Пачнуць павучаць,

Як пісаць нам, хоць самі...
А зласлівы паэт
У благой эпіграме
Абняславіць на свет.

Свіць ён з зайздрасцю лютай
Аб славе, нажыве:
Сэрца поўна атруты,
Выслаўленняў ілжывых.

Гэткі ціха патрэцца,
Дабярэцца да бога...
Ну а мне што патрэбна?
І ўсё, і нічога.

Павучаннямі прэснымі
Я не буду грашыць,
Раўнадушных у крэслах
Не хачу варушыць.

Не п'янае застолле,
Не зласлівыя плёткі,
А жытнёвае поле
Завяшчалі нам продкі.

Ды сумленне, ды праўду,
Ды бясконцую працу.
Сам сабе я параду
Даю, як трымацца.

Ты забудзь пра лячэнне,
Будзь бліжэй да людзей.
Трэба нам прылучэнне
Да вялікіх падзей.

Прылучацца нам варта
Не да прагнай гайні —
Да звычайнага жарту,
Да дзіцячай гульні.

Да ўсяго, што ў нас смелага,
Да праўды людской,
Як да яблыка спелага
Прытуліся шчакой.

1979

ПЕРАПІС ГРАХОЎ

Пачаўся перапіс грахоў:
Іх як калосся ў жыце...
Усе грахі сваіх сяброў,
Суседзяў, саслужыўцаў,
Дзяцей малых,
Бацькоў старых,
Буфетчыц на вакзале
І падначаленых сваіх —
З прыемнасцю назвалі.

Той хабару начальству даў,
Той пажывіўся ў касе,
Той спекульнуў,
Той недадаў,
Той «Жыгулі» свае прадаў
Выгодна на Каўказе.

О, выкрывацелі грахоў,
Цаню я вашу смеласць!
Тут мала ўжо прамоў,
Вымоў:
Здымаць пара наспела.

Я рукавы ўжо закасаў,
Ды стала мне нядобра:
Ніхто, ніхто не запісаў
Свой грэх, хоць самы дробны.

1979

* *

У зязюлі мне пытацца сорам,
Колькі год яшчэ я пражыву...
Сто гадоў у радасці і горы
Жыў я, не схіліўшы галаву.

Даваенных і пасляваенных...
Пасярод — гула, раўла вайна.
Навучыла горда і сумленна
Жыць да перамогі нас яна.

Выпаў мне тады білет шчаслівы,
Значыць, лёс памнож на тры разы...
Пасадзіў я яблыні і слівы,
Шмат зялёнай пахкай драбязы.

Не сабе,
А на зямлі братэрскай,
Дзе сяброў маіх узвод ляжыць...
Я гляджу на ўсё з высокай меркай
Той вайны.
І гэтак буду жыць.

І адно на сэрцы турбаванне,
Каб гарачай ядзернай пургой
Не змяло зязюлі кукаванне
І жыццё дзяцей зямлі маёй.

1979

* *

Якая дарога цяжкая
На сотні і тысячы вёрст!
То дождж вадаспадам сцякае,
То снег да асфальту прымёрз.

Удалеч праз лес адбягае
Няўлоўны заўжды гарызонт.
Дарогу не пакідае
Зялёны яе гарнізон.

У спёку стаіць і ў разводдзе,
Хваёвы, сасновы, густы...
Я ведаю, цяжка узводзіць
Кахання ці дружбы масты.

А нам жа цяжэй пераправы
Узводзіць было на вайне.
І многа тых рэчак крывавых
Трывожаць і сёння мяне...

Мой век не прывык валачыцца
Павольна па багнах густых.
Хай смела дарога імчыцца:
Дарогу трымаюць масты.

1979

КУЛЯШОВУ

Прыціхнуў боль,
Адна туга тупая...
Не пазваніць табе,
Не адшукаць...
Як шчырасці тваёй
мне не хапае,
Як не хапае мне цябе, Аркадзь.

Лісток, з галінкі адарваны, шаснуў
Ля сэрца,
Паляцеў —
не здаганю...
Гарыць касцёр твой
Ля шашы Варшаўскай,
І кожны дзень
Бягу я да агню.

Штодня жыву
Між кніг тваіх і песень,
І ціха на зямлі тваёй плывуць
Любімыя табой
Віхра і Бесядзь
І ў акіян жыццё тваё нясуць.

Цяжкім ты пры жыцці быў
ці інакшым,
Каго ты не любіў,
Каго любіў,—
Пачнуць хлусіць
Мемуарысты нашы...
А праўда ўся:
Ты Куляшовым быў.
Ты мудры быў —
І тут мне не пярэчаць —
І ўсё аддаў
праўдзіваму радку...
Ты марыў зноў
праплыць па роднай рэчцы,
Каб сонца з вёслаў
капала ў раку.

Асенні дзень.
Лятуць на поўдзень гусі.
Над Свіслаччу стаю я
пад вярбой,
І скарджуся,
І радасцю дзялюся,
Я, як заўсёды,
раюся з табой.

Пад сонцам
І пад небам перуновым
Цяжэй нам без цябе пісаць і жыць...
І кружыцца планета Куляшова,
І песня пра Алесю ўсё звініць.

1979

* *

Даволі вам, дзеці,
Па лагеры бегаць, даволі!
І спаць вам не дам у спакоі.
Апоўначы выведу вас
Я сягоння на поле,
На цёмнае поле начное.

Там позняе лета,
Там соннае жыта
І зорныя ліўні.
Бяздонне сусвету
Бывае такое глыбокае
Толькі ў жніўні.

Пра космас прывычна
І бачыць, і чуць вам
Ледзь-ледзь не з пялёнак.
І сон ваш касмічны,
І ў сэрцы —
Гагарын, Клімук, Кавалёнак.

Для кожнага з вас
Над бацькоўскай зямлёю
Шчаслівая зорка згарае.
Цаніце свой час
І гэты сусвет,
Што без дна, без канца і без краю.

Жыццё вас запоўніць
Вучобай, і працай,
І шчырым каханнем,
Бо сэрцы запоўняць
І зоркавы лівень,
І цёплага жыта дыханне.

1979

* *

Колькі той радасці у чалавека!
Болей работы, трывогі, турбот...
Ды сустракае вясною спрадвеку
З радасцю чыстай ён птушак прылёт.

Выгляне стомлены шпак са шпакоўні,
Першае лісце пачне шалясцець —
І ўжо на сэрцы лягчэй і спакойней,
Сам ты гатовы кудысьці ўзляцець.

Скажа таварыш твой шчырае слова,
З добрай усмешкай унук падбяжыць,
Робіцца зноўку твой свет адмысловым
І адчуваеш, як хораша жыць...

Сёння мне зранку працуецца весела:
Стукнула звонка ў шыбу пчала,
Ластаўка смутак крылом перакрэсліла,
Ліпа цвісці на двары пачала.

1979

САЛДАЦКІЯ РЭЧЫ

Вось і прыйшоў ты дадому, салдат,
У гімнасцёрцы сваёй парудзелай.
Рады і маці, і сёстры, і брат,
Рады суседзі з радні парадзелай.

Хто пасталеў,
Хто дачасна сівы,
Горкія слёзы ў суседак ліюцца:
«Пашанцавала:
Вярнуўся з вайны,
Нашым ніколі з вайны не вярнуцца».

Поўныя шклянкі гарэлкі і слёз.
Плачу, хоць плакаць салдату і нельга.
Мала багацця з вайны я прынёс:
Свой рэчмяшок, чамадан ды шынельку.

Мой кацялок, што з вайны прывалок,
Выклікаў зайздрасць малых, як належа.
Мне не шкада.
І пайшоў кацялок
Дзецям варыць іх няхітрую ежу.

Пераадзеўся ў цывільнае я,
Хоць і завязваў гальштук няўмела...
І не адна гімнасцёрка мая
Нейчыя плечы хоць трохі сагрэла.

Можа, не варта, сябры, ўспамінаць
Тыя гады...
А скажыце, дарэчы,
Як ухітрыліся вы захаваць
Вашы старыя салдацкія рэчы?

1979

* *

Людзі лета з палеткаў пазвозілі,
Гул гарачых матораў заціх...
Асцярожна хадзіце па восені,
Па завулках яе залатых.

Хай палае няяркі агеньчык
Кожнай кветкі ў халоднай траве.
Покуль сівер наўкол не заенчыць,
Спелы пах над зямлёю плыве.

Пазіраюць праз рыжае лісце
Позніх яблык крутыя ілбы.
На двары ўсё святлей і празрысцей...
Што ты страціў?
І што ты набыў?

Гэта вечныя нашы пытанні,
Сэрца стук
І антонавак стук.
Гэта нібы з жыццём развітанне:
Ты апошнюю бачыш вярсту.

Неяк вусцішна, грозна, журботна...
А найлепшая з хатніх навін:
Землякі з-пад Бягомля з балотаў
Мне прывезлі вядро журавін.

Я ўзяў невялікую жменю.
Божа мой,
Што за смак,
Што за сок!
Журавіны,
Маленства,
Здзіўленне...
Пачакай ты, магільны пясок.

Лістападу цякуць ручаіны,
Ты даўжэй з гэтым цудам пабудзь...
Хутка восень вятры і жанчыны
З падмарожаных сцежак зграбуць.

1979

* *

Пазарасталі ўсе траншэі,
У іншай эры мы жывём.
А ніткі дружбы ўсё танчэюць,
Мы часта самі іх ірвём.

У кожнага свае турботы,
І ясны дзень, і хмурны дзень.
У кожнага свае згрызоты,
І быт, і лад, і ход падзей.

Адзін на дачы прымасціўся,
Яго ўсе думкі пра сябе.
Другі прапіўся, апусціўся,
Удачы рэдкія скубе.

І не цікавяцца табою,
І не цікавяць больш яны.
І з раўнадушнаю журбою
Стаяць ля нейчае труны...

Трывожна сэрцу ды і горка:
Гады сяброўства раздзяўблі.
Аб дружбе ж, помніцца, гаворку
Ў сырых траншэях мы вялі.

1979

СХЕМА ЖЫЦЦЯ

Робім да стомы. Цягнемся. Марым.
Век здаганяем. Героямі ходзім.
Ззяем, як сонца. Чарнеем, як хмары.
Нешта губляем. Амаль не знаходзім.

Моцна кахаем. Ад шчасця заходзімся.
Рады, як чэрці. Як людзі, сумуем.
Сварымся. Мірымся. І разыходзімся.
Дзён не хапае. Тыдні марнуем.

Любім дзяцей. Патураем ім. Цешымся.
Радуюць дзеці. Дзеці палохаюць.
Грукне бяда — ад адчаю хоць вешайся.
Ну, і нашчадкі! Ахаем, охаем.

Верым з калыскі, што лепшае спраўдзіцца.
Побыт бацькоўскі не памятаем.
Плачам. Рагочам. Клянёмся не скардзіцца.
Дзесьці насмецім. Не падмятаем.

Добра ўсміхаемся. Злосна жартуем.
Здольнасці тупім. Хітрыкі точым.
Жонак ашукваем. Жонак раўнуем.
Некага хвалім. Некага топчам.

Грозна гарлаем. З глупствам згаджаемся.
І галасуем. І пратэстуем.
То абдымаемся з сябрам, то лаемся.
Лічым здабыткі і тару пустую.

Не заўважаем. Чула клапоцімся.
Успамінаем. І забываем.
Хутка ўзносімся. Коцімся, коцімся.
Маем што трэба. Нічога не маем.

Планы складаем. Махаем рукою.
Зрэдку бушуем. Ціха згараем.
Прагнем спакою. Не бачым спакою.
Моўчкі хварэем. І паміраем.

1979

НАЧНОЕ АКНО

Постаць матулі сівой у акне,
Голас трывожны і горкі.
Часта пыталася маці ў мяне:
— Куды падзеліся зоркі?

Неба начное ў электратумане,
Дыхае горад смогам...
Ні табе печ распаліць уранні,
Ні памаліцца богу.

Рукі без працы цяжка насіць.
І адпачынак не ў радасць.
Ні добрае цеста на хлеб замясіць,
Ні пакапацца ў градах.

Ні пасядзець з суседкай на прызбе,
Ні падмесці зялёны дворык.
Адно тэлевізар спявае і трызніць
І нагнятае змору.

Маці руплівай няма ўжо даўно,
Сам пазіраю ў начное акно
І чую той голас горкі:
— Куды падзеліся зоркі?

1979

ПЕЧАНАЯ БУЛЬБА

Пазносіў я многа ламачча,
Вячэрні касцёр хоць куды!
Сусед мой, як рыцар з Ламанчы,
Наіўны, высокі, худы.

Агонь разгараецца буйна,
Забудзем трывогу і боль,
Частуйцеся печанай бульбай,
Вось добрая шэрая соль.

Ноч іскры маўкліва глытае.
А мы то маўчым,
То услых
Гаруем, што моладзь не тая,
Што шмат гультаёў маладых;

Што зніклі руплівасць, стараннасць
І гордасць за працу сваю.
Прыемны ім чад рэстаранны,
Там скачуць, і п'юць, і пяюць.

А мы іх адзелі, абулі,
Так-сяк, але вывелі ў свет...
Частуйцеся печанай бульбай,
Мой добры сумленны сусед.

Пярэчыць мне:
«Не характэрна!
Патрэбен бацькоўскі давер.
Вось вырашым крызіс кватэрны,
І знікне уласніцкі сверб.

Для моладзі патрэбна лекцыі,
Патрэбна іх сэрцы працяць».
А лекцыі тыя улегцы
Фурманкай пустой тарахцяць...

У пекле акопным, у брудзе,
На вогненнай перадавой
Адважныя чыстыя людзі
Дзяцей засланілі сабой.

А гэтых мы самі расцілі,
Ёсць БАМ і была цаліна.
І ўсё-такі іх не хрысціла
Агнём і крывёю вайна...

Трывогу глыбока затоіш...
Пра што наша моладзь пяе?
Пра тое ж,
Пра тое ж,
Пра тое ж,
Што спаць маладым не дае.

І слухаць ім сумна пытанні,
Што мучаць салдатаў старых.
І хлопцы бягуць на спатканні
Да смелых сяброваў сваіх...

А час па-ранейшаму бурны,
Ад войнаў уздрыгвае свет...
Частуйцеся печанай бульбай,
Негаваркі мой сусед.

1979

ТАПАЛІНЫ ЗВОН

Я першы раз пачуў твой смех
На ціхай тапалінай сцежцы.
Бялюткі пух, як цёплы снег,
І цэлы свет — твая усмешка.
Ты — зорны тапаліны сон,
Мне ноччу кожнай сніцца ён.
Мне мала сноў,
Ты знікла зноў,
На зямлі
Сумны звон тапалёў.
А лівень падае ў траву,
Твой лёгкі светлы след змывае.
А я адной табой жыву,
Адну, адну цябе кахаю.
Пах тапаліны на губах,
Ты ўся, як тапаліны пах.
Зямлю прайду,
Цябе знайду.
Не згублю,
Бо цябе люблю.
Не страшны боль, не страшна смерць,
Страшней застацца без кахання,
У адзіноце анямець,
Любімай не пачуць дыхання.
Прашу: заўсёды будзь са мной
Вясной, і летам, і зімой.
Я разганю тваю бяду
І з табой
Па жыцці прайду.

1979

* *

Калі зрэдку мяне
Пасылалі к чорту,
Я да чорта ішоў
З невялікай ахвотай.

Зямля рабілася чорнай,
І неба рабілася чорным,
Нібы ў часе вайны,
Калі я адступаў
З пяхотай.

Калі мне казалі:
«Ідзі ты к богу!» —
Я ведаў, што людзі
Ад мяне
Не адцураліся.
На сэрца набягала
Залітая сонцам дарога,
Я да бога ішоў
І аб самым сакрэтным раіўся.

1979

ЗВАНЫ ЖУКАВА

Прыбужскае сяло
Сустрэла вызваліцеляў,
На захад адкаціліся
Ўсе грукаты вайны.
Стаіць царква на плошчы
З аглухлымі званіцамі:
Укралі акупанты
Вясковыя званы.
Былі і слёзы радасці,
Плылі і слёзы жалю,
Малебен адслужылі,
Ды не было званоў...
Пісаць пісьмо да Жукава
Рашылі прыхаджане.
А дзе наш збаўца маршал?
У пекле ўсіх баёў.
«Ён зараз гоніць ворага,
Яму турбот па горла,
Не лезьце з вашым глупствам:
Вайна яшчэ грыміць».
Але старыя ўпёрліся
Ад радасці ці гора —
Пісаць пасланне Жукаву.
А можа, даляціць?..
Дайшло пісьмо да маршала,
Дайшло да сэрца маршала,
Прыслаў званы ім маршал
З камандаю байцоў.
Малебен перамогі
Уславіў свята наша,
Тады адказ ад маршала
Чыталі сто разоў...
Не людна сёння ў царкаўцы,
І мала хто ўжо моліцца,
Цяпер ва ўсіх інакшыя
Жаданні, мары, сны.
А як званы зазвоняць,
Замоўкне ўся ваколіца,
І кожны скажа з гордасцю:
— То Жукава званы.

1979

* *

Пакуль бясконцая
Ноч настане,
Са мной мой вечар,
Зарой замглёны.
Змрок асядае
На лес пластамі:
Камлі — у цемры,
У сонцы — кроны.

І гулам лесу
Закалыханы,
Пачаў без болю
Думаць аб смерці,
Што напалову
Я закапаны
Начною цемрай
Па самае сэрца.

1979

НАДЗЕЯ

А восень звоніць у звон свой медны,
І вецер трубіць у доўгі рог...
Ці ты выдатны, ці непрыкметны —
Падбі рахункі ў канцы дарог.

Я, пранізаны наскрозь вятрамі,
І непагодзе асенняй рад.
Іду пацíху шляхам вяртання,
Дарогай болю, удач і страт.

Ні пахвальбою мяне не спояць,
Ні раўнадушша ўжо не саб'е...
Каму патрэбна сумная споведзь:
Жыцця другога ўжо не саўеш.

Цяпер і дзень мой такі кароткі,
Бяссоннай ночы няма канца...
Ці памаліцца, як нашы продкі:
«Ва імя сына... духа... айца...»

Што пакаянне і што маленне!
Натоўп не верыць у шчырасць слёз.
А на планеце ўсё менш сумлення,
А болей страху, хлусні, пагроз.

А на планеце ўсім па ракеце
З пякельнай смерцю... Вось і жыві!
Мы ўжо старыя. А дзеці, дзеці...
Няўжо ім попел, рэкі крывí?

Расплавіць атам золата злíткі,
І паляцім мы да чорных дзір.
Што падрахункі і што набыткі!
Адзіны выбар: вайна ці мір.

За акіянам загінуў розум
Альбо вар'яты яго змялі?
Малюся праўдзе, малюся росам,
Малюся сонцу, роднай зямлí.

І толькі вера ў сваю радзіму
Сцвярджае: будзе жыць род людзей!
Гляджу з надзеяй на свет наш дзіўны,
На сонца, травы і на дзяцей.

1980

* *

Якую прысніў ты маці
З далёкай зямлі маленства?

На полі з сярпом і песняй,
З усмешкай блакітнавокай.

Вядзе ў першы клас цябе горда,
Ты кветкі ў руцэ трымаеш.

Гармідар гусіны на ферме
І маці ў белым халаце.

Парэпаны рукі цяжкія
Ці ярка гараць завушніцы.

Ляжыць забітая ў снезе
Пад вогненным дымным небам.

Адна, пастарэлая ў горы,
Ці з добрым лагодным бацькам.

Якою прысніцца маці,
Такою і песня будзе.

1980

ПАХОДЖАННЕ МАЙГО ДРУГА РЫГОРА Б.

Ты прыйшоў з вайны і гора,
Ты з малітвы,
Ты з разгневанага бору,
Ты смалісты.
Сто паэтаў цягнуць хорам,
Ты салістам.
Ты нібы святло ў лесе
Ад каліны,
Ты ад самай добрай песні —
Ад Куліны.

1980

БУСЛЫ, БУСЛЫ...

*

Калі лятуць чароды птушак з поўдня,
Аднойчы настае бусліны час.
Прастор дзіцячым крыкам перапоўнен:
— Буслы, буслы...
Вясна прыйшла да нас!

*

Хлусня, што пад капустаю знаходзяць
Малых,
І ты забудзь пра гэты слых.
Нам,
Каб жыла сям'я ў добрай згодзе,
Дзяцей прыносяць белыя буслы.

*

Дзіця і бусляня.
І сонечны сланечнік.
Як добра ім на хвілю падружыць.
І кожны з іх
І вечна, і сардэчна
Імгненнем гэтым будзе даражыць.

*

Ёсць добрае буслінае каханне.
Буслянка — гэта школа выхавання:
Як жыць, дружыць
І ў вырай адлятаць...
І нам з буслоў не сорам прыклад браць.

*

Няма радзімы без бацькоўскай хаты;
Бусліны клёкат — гэта родны дом;
Ты будзеш жыць шчасліва і багата,
Калі над хатай — буслава гняздо.

*

А летнім днём блакіт нябёс бясконцы
І воблакі — мелодыя без слоў,
І над зямлёю роднай наша сонца,
І крылле прамяністае буслоў.

*

Буслы да нас вясною зноўку вернуцца,
Як на зямлі прадзюбнецца трава.
Без чалавечай і буслінай вернасці
Няма ні дабрыні, ні хараства.

1981

СПАГАДА

Нібы той конь у пене,
Імчыць шалёны час.
Чаканне і цярпенне
Пакінулі ўжо нас.

Ніхто чакаць не хоча:
Хутчэй, хутчэй, хутчэй!
Нястача — заякочуць,
Памёр ты — прэч з вачэй

І з памяці...
Спагада
Ўжо дыхае ледзь-ледзь.
Закон у многіх хатах —
Хутчэй пабагацець...

Спагаду ў сэрцах мелі
Матулі ўсё жыццё.
Спагада — разумелі —
Святое пачуццё.

А як яны цярпелі,
Рабілі за дваіх;
За працаю гарбелі,
Гадуючы малых.

А як жа нас чакалі
Матулі з той вайны!
Што доля іх цяжкая,
Не енчылі яны...

Вось тут, пад гэтым небам,
Па-людску мы жылі,
Спагада сёння трэба
Лясам і ўсёй зямлі.

І кволай балацінe,
І рэчачцы малой,
Мужчыну і жанчыне,
Прыціснутым бядой;

І ўсім, хто добра робіць,
Жыве сумленна сам,
Хто лішняе не ўхопіць,
Не пазайздросціць вам.

І людзям небагатым,
І кожнай удаве...
Хай матчына спагада
Ва ўсіх у нас жыве.

1981

ЗМЕСТ

Край паэтаў 5
Лінія высокага напружання 7
Чалавечнасць 8
Пачатак вясны 10
Дзеці над возерам 11
*** Няма на свеце земляў непрыгожых... . . . 13
Жаданні 14
*** Капайце у сэрцы маім магілу... 15
Акіян 16
Паэма майго лесу 19
*** Абагачальныя фабрыкі... 23
Жарт 24
Салодкі лубін 25
Асцерагайцеся падробкі 26
Святочныя салюты 28
Мінск едзе па грыбы 29
Рабінавы гай 32
Адзінота 33
Сумленне 34
Начныя галасы 35
Родная мова 36
Роздум 37
Пра сонца і месяц 39
Сэрца і крыж 40
Рускаму брату 42
Маскі 43
Франтавікі 45
У сорак першым 46
Самае страшнае 47
Апельсіны 48
Як зязюлі закукуюць... 49
*** Зерне праўды і праўда зерня... 50
Памяці М. Святлова 51
У Белавежы 53
Касцёр на лузе 54
Мой Каўказ 55

*** І неба не праяснілася... 56
Просценькая песня 57
*** Мы выцерпелі многа... 58
*** Прыязджаюць людзі у горад... 60
Добры настрой 61
За вогненнымі вякамі 62
Слова пра Мінск 65
Гайна, Гайна... 66
Дзяўчаты мыюць танк... 68
Нашым сынам 69
Пры святле маланак 70
Кавуны 71
У гасцях 72
Жыццё маё... 74
*** Адплывае белы цеплаход... 76
Суседка 77
Друкарам 79
Пасля вандровак 80
*** На Палессі восень... 82
Пахаванне 83
*** Мітынгі вялікай рэвалюцыі... 84
Кандрату Крапіве 85
*** На сходах часта... 86
*** Звязаць бы ўсіх, хто прагне... 87
Галоўнае слова 88
*** З тэлемачты ліпы насміхаліся... 89
Салодкая лячэбніца 90
*** Ламае час былыя звычкі... 92
Раўнапраўе дрэў 94
Мае настаўнікі 95
Вухналі 96
Шлёнскі танец 97
Крышталічны хрыбет 98
Беларускія шрыфты 99
*** Асеннімі дажджамі заліло... 100
*** Ілюзіі, ілюзіі... 101
Іх вечныя агні 102
*** І мяне хвароба тузанула... 103
*** У «Спідале» равела... 104
Вопыт 105
Грыфельныя дошкі 106
Неспакой 107
*** Прырода на дзіва праўдзіва... 108
Наша энцыклапедыя 109

Я аб дзецях, аб дзецях... 110
*** Паўвека... Гэта шмат... 112
*** З працы пачынаецца Купала... 113
Выспа «Беларусь» 114
Маладзейшым 115
Вязынка 116
*** Не люблю я слова «пакарыцель»... 117
*** На дзесяць працэнтаў болей... 118
Толькі голас 119
*** Нешта журботнае вецер пяе... 120
Напаўголасу 121
*** Свой лёс мы самі выбіралі... 122
Снежань 123
Прысніўся сон... 124
Секунда 126
*** Мне не патрэбны суцяшэнні... 127
Горкая гордасць 128
*** Калі пачалася вайна для мяне?.. 129
*** Цяжкое партызанскае качэўе... 130
Агонь 131
Казулічы 132
Даты 133
*** Мы, людзі,— дзіўныя стварэнні... 134
*** А пабываць там даўно я мару... 135
Мы 136
Дарога 137
У Польшчы 139
*** Азону,— просім мы,— азону!.. 140
*** Даруй, жыццё, што ў слабасці часовай... . . 141
*** Ізноўку гром на лес... 142
Лясы і рэкі 143
*** Мы пільней пазіраем на рэкі... 144
Маё гарышча 145
*** У садзе ўсё лісце апала... 147
*** З нас многія прагнуць разумнага... 148
Палёт у Сібір 149
*** Той дзень прапаў... 150
*** А я маладых не лаю... 151
*** А сонца цябе прасмаліла... 152
*** Касманаўт заўжды пасля палёту... 153
*** «Спі спакойна, дарагі таварыш...» 154
*** І няма каго нам папракаць... 155
*** Грызе усіх нас нецярплівасць... 156
Простыя ісціны 157

*** Сягоння не засну... 158
*** Першыя раны жанчына лячыла... 159
Творчасць 160
Беларускай чыгунцы 162
*** Апошні дзень вясны... 163
*** Скажы мне адно толькі слоўца... 164
Дзеці 165
*** З маленства мыірваліся у горад... 166
Балконы 167
*** Мы вельмі любім слова «малады»... 169
*** Я гаварыў занадта гучна... 170
*** Хадзіў я па лесе... 172
Скарбонка 173
*** На Брэстчыне карыбскі ураган... 174
У магазіне 175
*** Зямля мая то мяккая, то мулкая... 176
*** Вось яшчэ малое намаганне... 177
*** Прыляцелі з Канады і Бірмы... 178
*** Жывая рака у няспынным руху... 179
*** А радасць — не шумлівая... 180
*** На нягоды жыцця не жальцеся... 181
Бярэзіна 182
Зямля бацькоў 184
Асенняя навальніца 186
Куфар 187
*** А страціць годнасць — невыносна... 189
*** Было ўсё неба нада мною... 190
Чорны бусел 191
Мінскія святы 192
Белае возера 193
*** Кажуць: «Калі б давялося спачатку...» . . . 194
Крык сойкі 195
Гнеў і літасць 196
Паэзія 197
На схіле веку 199
Ода пешаходу 200
Мастадонт 201
Гальштук 202
*** Шумяць планавікі і прагназісты... 203
*** Яму пад шэсцьдзесят... 205
***Яшчэ адзін шумлівы год прайшоў... 206
*** Усемагутная эстрада... 207
*** Даверлівая прастадушнасць... 208
*** Самападман — такі занятак... 209

Яблыкі 210
Зялёнае гняздо 211
*** То ў надзеях, то ў скрусе... 212
*** Я люблю чырвоны колер цэглы... 213
Хлебныя словы 214
Палёт на Палессе 215
Камсамолец з Расоншчыны 217
На выстаўцы Аркадзя Пластава 218
*** Ноч канае ў цёмным завуголлі... 220
Дом творчасці 221
Вячэрні цягнік 222
*** Учора сэрца сціснула мне жалем... 223
*** Зялёны Мінск... 224
*** Рэкі не вяртаюцца... 225
Замініраваны лес 226
*** Пажыць да дна... 227
Каштаны 228
*** Мне бацька не пакінуў роднай хаты... . . . 229
Горад 230
Боль Сербіі 232
Сястра Дзяржынскага 234
*** Як позна ліпы сёлета цвітуць... 235
*** Ну, вось табе твой бор... 236
Збаны 237
*** Помніш, друг, як гасцявалі... 238
Старым партызанам 239
*** Мала сказаць: ненавіджу... 240
Пенсіянеры 241
*** Сцякае дождж з далоняў... 242
*** Наніжы на нітачку каралі... 243
*** Рэлігіі прыдумалі старыя... 244
*** Я заўсёды некуды спяшыў... 245
*** Гляджу я на азербайджанку... 246
*** Той напусціў туман... 247
*** Пачынае з новага радка... 248
*** Птушка ловіць дзень свой у палёце... . . . 249
Няўдачнік 250
Акіяніяда 251
Закон захавання энергіі 253
*** Усё б табе па сцежачцы... 255
Знаёмыя 256
*** Мы ўсе крыху тыраны... 257
*** Бойні свету у крыві і сале... 258
*** Мы ўсе ў маланках і біятоках... 259

*** Даруйце бацькам... 260
*** Агрызаецца, ды звужаецца... 261
*** На выгарах цёмных ваенных... 262
*** Бывала: вяртаешся з лесу... 263
*** Над белаю пустыняю аблок... 264
*** Краса і цуд зямлі — Васіль Блажэнны... 265
*** Дождж ізноў... 266
*** Зніклі галёшы... 267
*** Веру Сірыусу і Венеры... 268
Песня пра Мінск 269
Песня 270
Я ўнука вяду ў Маўзалей 271
Дом 272
Петрусю Броўку 274
*** А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў... 276
*** Бой пад вечар скончыўся... 277
Белы каснічок 278
*** За акном — бясконцых шын шыпенне... 279
*** На нашым паўночным паўшар'і... 280
*** Стаяла хмара нерухома... 281
*** Жнівеньская ноч як звар'яцела... 282
*** Апалашчуся хвалямі вятроў... 283
Млечны Шлях 284
*** Я не магу судзіць нікога... 285
*** І людзі, што пшаніцу, жыта сеюць... 286
*** То ў працы, то ў дымным паходзе... 287
*** Нешта пройдзена... 288
*** Пупышкі на вербах гнуткіх... 289
Палеглае жыта 290
Маўклівая малітва 291
Маладосць і старасць 292
Мінскі чыліец 293
*** Здараецца, часамі я раблю... 294
Мемарыяльныя дошкі 295
*** Наш правадыр і не ведаў... 296
*** А гідрастанцыю нашу ў Саянах... 297
*** Мяне сябры пытаюць... 298
У Брытанскім музеі 299
*** Там, дзе ўмоўная конская сіла... 300
Вяртанне 301
*** А мы ўжо як зімы сівыя... 302
Бярэзінскі запаведнік 303
*** А птушкі знікаюць... 305
*** Вы начавалі над ракой... 306

*** Хмары плаваюць над намі... 307
*** За прасніцай гарбатаю... 308
Зорны час Беларусі 309
*** Вецер грукнуў форткай... 311
Нашы песні 312
Бедуіны 313
Баравіна 315
Ускраіны 316
Унучкам . . , ... 317
Прылучэнне 318
Перапіс грахоў 320
*** У зязюлі мне пытацца сорам... 321
*** Якая дарога цяжкая... 322
Куляшову 323
*** Даволі вам, дзеці... 325
*** Колькі той радасці у чалавека!.. 326
Салдацкія рэчы 327
*** Людзі лета з палеткаў пазвозілі... 328
*** Пазарасталі ўсе траншэі... 329
Схема жыцця 330
Начное акно 331
Печаная бульба 332
Тапаліны звон 334
*** Калі зрэдку мяне... 335
Званы Жукава 336
*** Пакуль бясконцая ноч настане... 337
Надзея 338
*** Якую прысніў ты маці... 339
Паходжанне майго друга Рыгора Б. 340
Буслы, буслы... 341
Спагада 343

Панчанка П.
П 16 Збор твораў: У 4-х т. Т. 3. Вершы 1963—1981 гг.— Мн.: Маст. літ., 1982.— 351 с.
У пер.: 1 р. 60 к.
Трэці том Збору твораў народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі склалі вершы апошніх гадоў.

ББК84 Бел7
Бел2

П $\frac{70403-047}{М\ 302(05)-82}$ 105—82

ПИМЕН ЕМЕЛЬЯНОВИЧ ПАНЧЕНКО

Собрание сочинений
в 4 х томах

Том 3

Стихи 1963—1981 гг.

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Р. І. Барадулін. Мастак Л. Я. Прагін. Мастацкі рэдактар А. І. Труханава. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Я. Ф. Харко.

ІБ № 1387
Здадзена ў набор 08.10.81. Падп. да друку 01.02.82. АТ 06511. Фармат 84×100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 17,16. Ум. фарб.-адб. 17,75. Ул.-выд. арк. 12,62. Тыраж 17 000 экз. Зак. 2000. Цана 1 р. 60 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Праспект Машэрава, 11.

Мінскае вытворчае паліграфічнае аб'яднанне імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.